Гомельшчына вылучаецца надзвычайным багаццем тэкстыльных мастацкіх традыцый[1]. Яны складваліся ў старажытнасці на землях радзімічаў на ўсходзе і дрыгавічоў на поўдні, былі абумоўлены культурнымі сувязямі гэтых беларускіх зямель з Візантыяй, Кіеўскай Руссю, чаму спрыяла наяўнасць шляхоў зносін па рэках Днепр і Прыпяць і існаванне такога моцнага дзяржаўна-палітычнага цэнтра як Турава-Пінскае княства. Уваходжанне зямель Гомельшчыны ў склад Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай прынесла ў мясцовую народную традыцыю ўплывы заходнееўрапейскай тэкстыльнай культуры. На рэгіянальныя асаблівасці народнага адзення, арнаменту, усяго мастацка-тэхналагічнага комплексу традыцыйных тканін паўплывалі трывалыя кантакты з суседняй Украінай і Расіяй. На памежных тэрыторыях сфарміраваліся мастацкія з'явы, якія ў роўнай ступені належаць беларускай, украінскай і рускай этнічным культурам.

Ва ўсходніх раёнах Гомельшчыны склаліся выразныя лакальныя тыпы падняпроўскіх ручнікоў: чачэрскія, неглюбскія, добрушскія і буда-кашалёўскія. Для іх характэрны багаты арсенал арнаментальных матываў, дэкаратыўнасць кампазіцый і насычанасць чырвоным колерам. Мастацка-тэхналагічныя асаблівасці тканых вырабаў у Гомельскім Падняпроўі ў пэўнай ступені абумоўлены ўплывам мануфактурнага і саматужнага ткацтва, якое ў XVIII–XIX стст. існавала ў Гомелі, Добрушу, Чачэрску.

Традыцыйнае адзенне падняпроўскай часткі Гомельшчыны дэманструе багаты арсенал тэхнік вышыўкі: набор, лікавая гладзь, крыжык, злучальныя швы, зборкі. Багаццем арнаментыкі і тэхналагічных прыёмаў выканання вылучаюцца ручнікі і традыцыйны касцюм Калінкавіцкага, Акцябрскага і Светлагорскага раёнаў (мал. 936, 937).

---

[1] У раздзеле выкарыстаны матэрыялы экспедыцый ў Гомельскую вобласць Навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі (НДМЛ) Упраўлення мастацкай прамысловасці (цяпер – Цэнтр беларускіх рамёстваў "Скарбніца"), Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры ў Буда-Кашалёўскі (1998, 2003), Чачэрскі (2001, 2003), Кармянскі (2003), Рагачоўскі (2003, 2009), Акцябрскі, Светлагорскі (2003, 2005), Лельчыцкі (2004, 2006, 2009), Веткаўскі (2005), Калінкавіцкі (2005), Жлобінскі (2005), Жыткавіцкі (2006, 2007, 2009) раёны, Міжнароднай гуманітарнай школы Цэнтра антычнай традыцыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (OBTA, Польшча) у Калінкавіцкі, Мазырскі (2003) раёны, у якіх брала ўдзел аўтар. У 2012 г. адбыліся экспедыцыі ў Жыткавіцкі і Петрыкаўскі раёны. Фотаздымкі выкананы аўтарам і захоўваюцца ў асабістым архіве.



Мал. 936. Даша Касько, 1995 г.н., у сарочцы Степаніды Папруга, 1985 г.н. (в. Маісееўка, Акцябрскі раён). 2005 г.



Мал. 937. Люда Бусел, 1984 г.н., у сарочцы з в. Мікалаеўка Светлагорскага раёна. Захоўваецца ў СДК в. Гарохавішчы Акцябрскага раёна. 2005 г.

У палескай частцы Гомельскай вобласці сялянскія жанчыны па сёння захапляюцца вышыўкай адвольнай гладдзю і ствараюць яскравыя паліхромныя інтэр'еры з вялікай колькасцю вышыванак: падузорнікаў, накідак на падушкі, абрусаў, фіранак, сурвэтак. Вышыўка гладдзю сфарміравала сучасны варыянт жаночага строю, які да нядаўняга часу ўжываўся ў вёсках Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў.

Шырока распаўсюджаны былі на Гомельшчыне ў XIX – першай палове XX ст. разнастайныя тэхнікі ткацтва і іх тэхналагічныя варыянты, што абумовіла дэкаратыўнае багацце традыцыйных тканін рэгіёна. Ім уласціва характэрнае спалучэнне ў адным тэкстыльным вырабе розных ткацкіх тэхнік: бранай і закладной, бранай і выбарнай, бранай і пераборнай.

Паўсюдна на Гомельшчыне ткалі ў тэхніцы бранага ткацтва. Найбольш багатыя арнаментальныя традыцыі бранага ткацтва характэрны для Светлагорскага, Акцябрскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага,Чачэрскага, Веткаўскага, Гомельскага і Добрушскага раёнаў (мал. 938, 939, 940).

Зафіксаваны два спосабы выканання браных узораў: яны набіраліся на дошчачку або выбіраліся іголкай. Пра першы казалі: "Ткана на дошкі, набіралі на дошку". У другім выпадку фонавы ўток пракладваўся з дапамогай чоўніка, а ўзоры быццам бы вышывалі іголкай пры замкнёным зеве асновы. Такую разнавіднасць бранага ткацтва называлі "насціланне голкаю" (в. Палессе, Чачэрскі раён). Так ткалі браныя ўзоры ў Лельчыцкім і Петрыкаўскім раёнах. Асаблівасці ўтварэння ўзору, які ў браным ткацтве размешчаны



Мал. 938. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Прыбыткі, Добрушскі раён). Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 1037/2



Мал. 939. Ручнік. Фрагмент. 1920-я гг. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Амяльное, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 760/2



Мал. 940. Ручнік. Фрагмент. 1910-я гг. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Бабічы, Чачэрскі раён). Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 591/1

ў бардзюрах па ўсёй шырыні тканіны, адлюстраваны ў наступных словах ткачыхі: "Працягваю забалаццю ад берага да берага" (в. Акцяброва, Кармянскі раён).

У тэхніцы бранага ткацтва ткалі ручнікі ў 1960–1970-я гг. у Лельчыцкім, Жыткавіцкім, Калінкавіцкім раёнах з ужываннем белых баваўняных нітак і featuresрознакаляровага ўтку з чырвоных, сініх, зялёных, ліловых нітак.

Выбарнае ткацтва, якое дазваляе выконваць больш разнастайны арнамент з асобных элементаў рознага колеру, ужывалася ў Добрушскім і Буда-Кашалёўскім раёнах пры выкананні ручнікоў, узорных рукавоў жаночых сарочак (мал. 941).

Ажурныя і ажурападобныя фактурныя тканіны – полагі, фіранкі, ручнікі – ткалі ў тэхніцы аднаўточнага бранага ткацтва з выкарыстаннем дошчачкі. У Рэчыцкім, Жлобінскім раёнах тэхнікай ажурнага ткацтва карысталіся да сярэдзіны XX ст. Ажур тканіны па аснове і ўтку атрымліваўся пры праборцы нітак асновы ў бёрда з пропускам трасцін і тканні з закладаннем дошчачкі. Ажурная тканіна дадаткова пераўвівалася з дапамогай іголкі накшталт мярэжкі (мал. 942).

У Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Ельскім раёнах ажурападобныя тканіны мелі досыць просты малюнак з палосак, нескладаных элементаў, размешчаных у шахматным парадку. Фактурныя тканіны Чачэрскага раёна вылучаюцца багаццем арнаменту і яго разнастайнасцю. Аб гэтым сведчаць і назвы



Мал. 941. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае і выбарнае ткацтва (Добрушскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 942. Настольнік. Фрагмент. 1946 г. Лён, ажурнае ткацтва (в. Есіпава Рудня, Калінкавіцкі раён)



Мал. 943. Фартух. 1910 г. Лён, бавоўна, закладное ткацтва, карункі, вязаныя кручком. 76 × 93 см (в. Нісімкавічы, Чачэрскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 15377/2

ўзораў, якія былі запісаны ў сярэдзіне 1980-х гг.: "у персценькі", "у воспачкі", "балонкі", "шыбкі", "шыбкі з балонкамі", "дарогамі", "крестамі", "чаркі табунамі", "горкі з балонкамі", "каўбухамі", "быч'і вочы"[1]. У Калінкавіцкім раёне ажурападобныя і фактурныя тканіны для абрусаў з узорамі "морам", "маразамі", "жабкамі", "перстнікамі", "у кругі" выраблялі з дапамогай дошчачак да 1940–1950-х гг.

Больш шырока, чым у іншых рэгіёнах Беларусі, на Гомельшчыне ўжывалася закладное ткацтва, якое дазваляе атрымліваць аднолькавы арнамент на абодвух баках тканіны. У Жыткавіцкім раёне ўзорамі закладнога ткацтва аздаблялі сярпанкі, якія да пачатку XX ст. з'яўляліся часткай мясцовага галаўнога ўбору, а таксама прыполы жаночых сарочак. У Чачэрскім раёне закладное ткацтва ўжывалі для ткання фартухоў, настольнікаў, ручнікоў (мал. 943). У Рагачоўскім і суседніх раёнах былі распаўсюджаны ручнікі закладнога ткацтва з характэрнымі ўзбуйненымі арнаментальнымі матывамі (мал. 944). На поўдні Гомельскай вобласці ў сумежным з Ук-



Мал. 944. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, закладное і шасцінітовае ткацтва (в. Рыскаў, Рагачоўскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 15545/1

---

[1] Выкарыстаны матэрыялы архіва былой Навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі (НДМЭЛ), якія захоўваецца ў Цэнтры беларускіх традыцыйных рамёстваў "Скарбніца" (Мінск).



Мал. 945. Фартух-запаска. 1900 г. Воўна, лён, закладное ткацтва. 61 × 67 × 57 см (в. Мядзведнае, Ельскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 14797

раінай Ельскім раёне ў традыцыйны строй жаночага адзення ўваходзіў фартух-запаска, выкананы па ўзору кілімаў у закладной тэхніцы (мал. 945).

З суседняй тэрыторыі Украіны – Чарнігаўшчыны, Ровеншчыны з XVII ст. ішлі моцныя хвалі ўплыву кілімавага ткацтва. Некалькі майстэрняў кілімаў працавала ў непасрэднай блізкасці да Беларусі. У "Описании Черниговского наместничества" 1786 г. згадваецца некалькі кілімавых майстэрняў у маёнтках памешчыкаў Чарнігаўскай губерні. Прыгонныя майстры выраблялі кілімы ў маёнтках чарнігаўскіх памешчыкаў Я. Маркавіча, А. Шафоньскага. У XVIII ст. у м. Карэц (Ровенская вобласць) дзейнічала шырока вядомая суконная мануфактура князя Чартарыйскага, на якой сярод іншага выраблялі кілімы. Існаванне вытворчасці кілімаў на памежных з Гомельшчынай землях Украіны садзейнічала фарміраванню такіх выразных з'яў народнага тэкстылю, як рагачоўскія і брагінскія закладныя ручнікі.

Шматнітовае ткацтва XIX – першай паловы XX ст. на Гомельшчыне шырока прадстаўлена ткацкімі перапляценнямі з дробнымі фактурнымі ўзорамі. У Жлобінскім, Лельчыцкім, Ельскім раёнах сустракаюцца саржавыя ўзоры "ў сачавічку", "у блізны", "у грэчку", "канапелька". Па ўсёй Гомельшчыне было вядома тканне "ў ёлачку", "касіцамі". Іх выкарыстоўвалі пры вырабе ручнікоў, уціральнікаў, тканін на адзенне, посцілкі (мал. 946).



Мал. 946. Тканіны. 1950-я гг. Лён, саржавае перапляценне. Лукер'я Мельнікава, 1927 г.н. (в. Юравічы, Калінкавіцкі раён)



Мал. 947. Настольнік. Фрагмент. 1960-я гг. Лён, бавоўна, чатырохнітовае ткацтва. Марыя Рагавая, 1935 г.н. (в. Слабада, Лельчыцкі раён)



Мал. 948. Ручнікі. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, перабор. 300 × 27, 180 × 28, 250 × 28 см. Марыя Папруга, 1886 г.н. Зберагла гэтыя ручнікі, знаходзячыся ў канцлагеры ў в. Азарычы Калінкавіцкага раёна (в. Маісееўка, Акцябрскі раён)

На трох нітах ткалі паўшарсцяныя тканіны для андаракоў. На пяці нітах выраблялі настольнікі. На шасці нітах атрымлівалі фактурнае перапляценне, якое называлі “кружкі”. Такія тканіны выкарыстоўвалі для летніх ільняных спадніц, у Неглюбскім і Веткаўскім раёнах – для вырабу вонкавай часткі рукавоў жаночых сарочак.

У чатыры ніты ткалі разнастайныя па ўзорах тканіны для ручнікоў, настольнікаў, посцілак (мал. 947, 948). Захаваліся назвы асноўных узораў: “качаны”, “два качаны”, “цыганы”, “жахаўка”, “грамацкія”. Запраўляць станкі на гэтыя ўзоры ўмелі далёка не ўсе ткачыхі, і таму нярэдка іх выконвалі не на чатырох, а на двух нітах з дапамогай дошчачкі. Чатырохнітовае ткацтва вядома на Гомельшчыне ў двух тэхналагічных варыянтах. Першы мае назвы “ў чатыры ніты”, “у карты”, “віленкі”, “ у рэцэнкі”; другі – “цераз цапок”, “на пярэчан”, “маргушкі”, “пярэкулі” (“пярэкульна посцілка”).

У Светлагорскім і Акцябрскім раёнах у тэхніцы чатырохнітовага ткацтва ткалі набожнікі, пры гэтым узоры натыкалі толькі па канцах ручніка, а ў сярэдзіне пакідалі чыстае палатно. Каб ручнік па сваім выглядзе адпавядаў традыцыйнаму набожніку, яго дадаткова аздаблялі чырвоным колерам шляхам вышыўкі – швом “роспіс”, крыжыкам, сцяблістым швом рабілі абводку арнаментальных элементаў чатырохнітовага ткацтва (мал. 949, 950).



Мал. 949. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, аднабаковы перабор, вышыўка. 290 × 32 см (в. Здудзічы, Светлагорскі раён)



Мал. 950. Набожнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, аднабаковы перабор, вышыўка. 300 × 30 см. Школьны музей в. Валосавічы Акцябрскага раёна



Мал. 951. Настольнік. 1920-я гг. Лён, васьмінітовае ткацтва. Ганна Фядосік, 1914 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)

Было распаўсюджанню тканне на васьмі нітах саржавым перапляценнем (мал. 951). Каб тканіны былі якаснымі, гладкімі – "не кашлаціліся", ніткі пралі ў розным напрамку: для асновы – на правую руку, для ўтку – на левую. У восем нітоў пераважна ткалі настольнікі і ручнікі. Сустракаюцца на Гомельшчыне тканіны на 10 і 12 нітах пачатку XX ст. У 1980-я гг. у вёсках ніхто з ткачых ўжо не памятаў, як трэба запраўляць станок пры такой колькасці нітоў.

Адметнасцю народнага ткацтва Гомельшчыны з'яўляецца выкарыстанне пераборнай тэхнікі ткацтва ў яе шматлікай тэхналагічнай разнастайнасці. У адрозненні ад іншых раёнаў Беларусі пераборнае ткацтва атрымала распаўсюджанне ў падняпроўскіх раёнах Гомельшчыны і Магілёўшчыны не пазней XIX ст. У Чачэрскім і Веткаўскім раёнах для ручнікоў і ўзорных частак сарочак ужывалі перабор пад палатно[1]. Для такіх пераборных узораў характэрны досыць буйныя памеры, адсутнасць дэталіроўкі, разбеленасць, што абумоўлена асаблівасцямі закладання ўзорнага ўтку ў палатняны зеў (мал. 952, 953, 954).

Пераборныя ручнікі Падняпроўя – найбольш даўнія па паходжанні сярод пераборных ручнікоў іншых рэгіёнаў Беларусі. Пашырэнне пераборнага ткацтва па левабярэжжы Дняпра магчыма звязаць з розным па часе ўплывам на народнае мастацтва: дасягненняў рамеснікаў княжацкіх і царскіх ткацкіх слабод, памешчыцкіх ткацкіх мануфактур канца XVIII – першай паловы XIX ст., а таксама саматужнай ткацкай вытворчасці, якая была развіта ў другой палове XIX ст. у цэнтральных губернях Расіі і сумежных з Беларуссю раёнах Украіны.

У канцы XVIII і ў XIX ст. у Гомельскім Падняпроўі дзейнічала некалькі ткацкіх мануфактур. Князь Н.А. Румянцаў меў палатняную фабрыку ў сваім



Мал. 952. Сарочка. Фрагмент паліка і рукава. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва, карункі іголкавыя. ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль"

[1] Гл.: *Молчанов В.С.* Народное узорное переборное ткачество: учеб. пособие для учеб. заведений местной промышленности. М., 1960. С. 6.



Мал. 953. Ручнік. 1910-я гг. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Стаўбун, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей старaабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 762 /1



Мал. 954. Ручнік. 1910-я гг. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Колбаўка, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 330 /2

гомельскім маёнтку, на якую ў 1806 г. запрасіў замежных майстроў. На яго палатнянай фабрыцы ў в. Прудок Беліцкага павета ў 1812 г. працавала 63 ткацкіх станка і 115 прыгонных сялян. У 1813–1826 гг. тут выраблялі тонкае льняное палатно рознага гатунку "на манер галандскіх", цік, абрусы і сурвэткі, у тым ліку камчатыя, мухаяр і хусткі. Узорныя абрусы, сурвэткі, ручнікі, "каніфасы" ткалі на ткацкай мануфактуры князя Румянцава ў Добрушскім фальварку, якая існавала з 1775 па 1831 г.[1], на Кузьмінскай палатнянай мануфактуры (в. Кузьмінічы Добрушскага раёна), дзе працавалі прыгонныя сяляне.

На аснове мясцовых традыцый ткацтва ў пачатку XX ст. развіваўся саматужны ткацкі промысел у Чачэрскім павеце. Ім апекавалася Чачэрскае саматужнае таварыства, якое стварыла ткацкую школу для навучання сялян удасканаленым прыёмам рамяства. Гэта не магло не адбіцца на мастацка-тэхналагічным вырашэнні традыцыйных чачэрскіх ручнікоў, якія ткалі ў вёсках Нісімкавічы, Бабічы, Покаць Чачэрскага раёна.

[1] Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распада феадалізма. № 1 [1795–1840]. Мінск, 1934. С. 88–89.

Значны ўплыў на мастацка-тэхналагічныя традыцыі ручнікоў Падняпроўя меў буйны саматужны цэнтр ткацтва ў Краляўцы Чарнігаўскай губерні (цяпер Сумская вобласць Украіны). З пачатку XIX ст. Кралявец спецыялізаваўся на вытворчасці ручнікоў. Кралявецкія пераборныя ручнікі шырока разыходзіліся па Беларусі. Іх называлі "арлатыя", "каралеўскія"[1]. У Гомельскім Падняпроўі сялянскія ткачыхі імкнуліся паўтарыць прываб-ныя кралявецкія ўзоры, прыстасаваць іх да знаёмых ім ткацкіх прыёмаў і засвоіць тэхніку і арнаментыку пераборнага ткацтва. Гэта знайшло выразнае ўвасабленне ў рагачоўскіх закладных, добрушскіх і прыснянскіх пераборных ручніках.

У сучасных тканінах выкарыстоўваецца два віда перабору: двухбаковы і аднабаковы. У другой палове XX ст. у тэхніцы пераборнага ткацтва на Гомельшчыне выраблялі пераважна паліхромныя посцілкі. Плённа развіваліся традыцыі аднабаковага пераборнага ткацтва да 1980-х гг. у в. Неглюбка Веткаўскага раёна, дзе ткалі знакамітыя дэкаратыўныя неглюбскія ручнікі



Мал. 955. Ручнік. 1950-я гг. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)



Мал. 956. Ручнік. 1950-я гг. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)

[1] *Лобачевская О.А.* О влиянии ткацкого промысла Кролевца в Украине на народные традиции Поднепровья // Археалогія, этнаграфія і гісторыя Магілёўшчыны і Верхняга Падняпроўя: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Магілёў, 14–15 снежня 2009 г.). Секцыя "Этнаграфічныя тканіны Падняпроўя". Магілёў, 2011. С. 5–14.

(мал. 955, 956, 957). Мясцовыя ткачыхі ткуць свае тканіны з адваротнага боку, каб на вонкавым баку не было развваротных пяцель узорнага ўтку.

На 1970–1980-я гг. прыйшоўся своеасаблівы пік захаплення ў вёсках ткацтвам. Традыцыйнае валоданне ткацкім рамяством дазваляла жанчынам старэйшага ўзросту пры адсутнасці ў продажу патрэбных тавараў задавальняць уласнымі сіламі патрэбы ў посцілках, дыванах. Пашырылася мода ткаць на вяселле дочкам і ўнучкам вялікую колькасць ручнікоў і намітак для падарункаў гасцям. Ручнікі-"падаркі" ў гэты час пачалі ткаць з рознакаляровых баваўняных нітак у аснове і ўтку – жоўтых, зялёных, ліловых (мал. 958, 959).



Мал. 957. Ручнік. 1950-я гг. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)

Шмат ткалі ў гэтыя гады ў вёсках Лельчыцкага, Жыткавіцкага, Петрыкаўскага, Акцябрскага, Калінкавіцкага раёнаў. Ткацтвам займаліся большасць жанчын вёсак Міхедавічы (Петрыкаўскі раён), Хільчыцы (Жыткавіцкі раён), Глушкавічы (Лельчыцкі раён). Так, Феадосія Яфімава, 1912 г.н., з в. Тарканы Калінкавіцкага раёна на працягу трох гадоў выткала 21 посцілку, 9 губак палатна на ручнікі, што адпавядае прыкладна 70 м. Жанчыны ткалі на запас і назапашвалі значную колькасць посцілак і ручнікоў (мал. 960, 961). Некаторыя найбольш здольныя ткачыхі ткалі на заказ пераборныя паліхромныя посцілкі, якія былі вельмі папулярныя ў вёсках. Да ткачых-спецыялістак звярталіся тыя, хто сам не валодаў ткацкім рамяством.

На Гомельшчыне да 1980-х гг. захоўвалася старадаўняя тэхніка бранага ткацтва. У в. Вялікія Аўцюкі Калінкавіцкага раёна ткалі па старых узорах браныя ручнікі-"набожнікі" з узорам "ліштвы". Такімі ручнікамі прынята было аздабляць покуць, іх шырока ўжывалі ў вясельным абрадзе. У в. Неглюбка Веткаўскага раёна ў тэхніцы бранага ткацтва ткалі браныя ручнікі, абрусы, рукавы сарочак. Майстрыхі як мага бліжэй імкнуліся паўтарыць даўнія ўзоры. Такія "копіі" нярэдка прапанаваліся ахвочым набыць вырабы знакамітага неглюбскага ткацтва ў якасці ўзораў стогадовай даўнасці.

У в. Навінкі Калінкавіцкага раёна з пражы хатняга вырабу ткалі палатно і шарсцяную тканіну для вырабу пахавальнага адзення: сарочак і андаракоў, бо на той час яшчэ захоўвалася традыцыя хаваць жанчын у традыцыйным строі. Для гэтага шылі як асобныя часткі строю, якіх не хапала, так і строі цалкам. У вёсках Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Петрыкаўскага, Акцябрскага



Мал. 958. Ручнік. 1960–1970-я гг. Бавоўна, лен, бранае і чатырохнітовае ткацтва "ў касіцы" (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён)



Мал. 959. Ручнікі. 1970-я гг. Лён, бавоўна, бранае ткацтва "перабор". Еўдакія Іванец, 1924 г.н. (в. Рычоў, Жыткавіцкі раён)



Мал. 960. Посцілка. 1960-я гг. Лён, бавоўна, воўна, аднабаковы перабор (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён)



Мал. 961. Посцілка. 1960-я гг. Лён, бавоўна, воўна, аднабаковы перабор (в. Беразнякі, Жыткавіцкі раён)

раёнаў даматканыя тканіны ўжывалі для вырабу паўсядзённага адзення – сарочак, спадніц.

Захаванню традыцый ткацтва і іх развіццю ў пэўнай ступені садзейнічала існаванне арганізаваных форм народных мастацкіх промыслаў. У 1980-я гг. у в. Неглюбка Веткаўскага раёна і в. Бабічы Чачэрскага раёна дзейнічалі базавыя пункты ткацтва Гомельскага вытворчага аб'яднання мастацкіх вырабаў.

## РУЧНІКІ

Ручнікі Усходняга Палесся спалучаюць найбольш яскравыя традыцыі заходнепалескіх і падняпроўскіх ручнікоў. Разнастайнасць мастацкіх варыянтаў усходнепалескіх ручнікоў абумоўлена гістарычнымі асаблівасцямі развіцця Прыпяцкага і Мазырскага Палесся. Можна меркаваць, што лакальныя традыцыі ручнікоў склаліся тут у перыяд сярэднявечча. Мазырскае Палессе ў XII–XIII стст. уваходзіла ў склад Кіеўскага княства, і яго этнакультура фарміравалася пад уплывам традыцый паўднёваславянскіх плямёнаў, культуры Візантыі і Кіеўскай Русі. Прыпяцкае Палессе адносілася да Турава-Пінскага княства, а ў XIII ст. на гэтых землях узнікла самастойнае Тураўскае княства.

Рысы мастацкага аблічча ўсходнепалескіх ручнікоў працягвалі фарміравацца ў XVIII–XIX стст., калі гэтая частка Гомельшчыны знаходзілася ў складзе Мінскай губерні. У гэты перыяд у рэгіёне дзейнічалі памешчыцкія

ткацкія майстэрні і мануфактуры, развівалася ткацкае рамяство ў мястэчках. У канцы XIX – пачатку XX ст. Мінскае губернскае земства разам з Мазырскім і Рагачоўскім павятовымі земствамі распаўсюджвалі сярод сялянства ўдасканаленыя прыёмы ткацкага рамяства.

Шматпластавасць мастацка-кампазіцыйных і тэхналагічных традыцый ручнікоў характэрна для Прыпяцкага левабярэжжа – Калінкавіцкага, Светлагорскага, Рэчыцкага раёнаў Гомельшчыны. Сувязі з суседнімі паўночнымі раёнамі Цэнтральнай Беларусі, дзе ў XVIII–XIX стст. было добра развіта рамесніцкае і мануфактурнае ткацтва, паўплывалі на фарміраванне багатай арнаментацыі калінкавіцкіх ручнікоў, у якіх спалучаюцца адна- і двухуточная браная, пераборная і шматнітовая тэхнікі ткацтва.

Ручнікі Падняпроўя вылучаюцца вялікай разнастайнасцю. У рэгіёне на адносна невялікіх тэрыторыях шчыльна суіснавала некалькі ўстойлівых мастацка-стылістычных тыпаў ручнікоў. Надзвычай багатую мазаіку розных мясцовых варыянтаў ручнікоў прадстаўляе Гомельскае Падняпроўе, ці Пасожжа, – Чачэрскі, Веткаўскі, Добрушскі, Гомельскі, Буда-Кашалёўскі раёны. Тут бытавалі выразныя арэальныя кампазіцыйна-арнаментальныя тыпы тканых браных ручнікоў, якія сфарміраваліся ў старажытнасці на глебе этнамастацкіх традыцый радзімічаў. Ручнікі адметныя багаццем рамбічнай арнаментыкі і разнастайнасцю кампазіцый. Рамбічна-сеткавыя і вертыкальна-ланцуговыя кампазіцыі доўгіх браных канцоў – адна з галоўных яскравых прыкмет мастацка-стылістычнага канону ручнікоў Гомельскага Пасожжа і Падняпроўя. На гэтых жа тэрыторыях існуе некалькі лакальных варыянтаў пераборных ручнікоў, якія сфарміраваліся ў XVIII–XIX стст. Суіснаванне розных мастацкіх традыцый было абумоўлена шлюбнай міграцыяй, у выніку якой у адным населеным пункце сустракаліся розныя мастацкія каноны і адбываўся іх дыялог[1].

Больш нідзе на Беларусі не ўбачыш такой шматпластавасці мастацкіх, рамесніцка-тэхналагічных традыцый, як на ручніках Падняпроўя. Шырока ўжываюцца ў іх старажытная браная двухуточная і закладная тэхнікі, пераборнае ткацтва ва ўсёй разнастайнасці яго тэхналагічных варыянтаў: аднабаковы перабор, перабор “пад рыпс”, перабор з прыцiскной асновай і інш. У меншай ступені, чым у іншых рэгіёнах Беларусі, у абрадавых ручніках Падняпроўя выкарыстоўвалася шматнітовая тэхніка ткацтва.

Існуюць розныя падыходы да тыпалагізацыі ручнікоў. Супрацоўнікі Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Г. Шклярава вылучаюць у Гомельскім Падняпроўі некалькі традыцый: прыснянскую, бабіцкую, казацка-балсунскую, неглюбскую, дубраўскую і інш.[2] Апісаныя ніжэй тыпы ручнікоў вулучаны намі на падставе агульнасці іх мастацка-кампазіцыйных, арнаментальных традыцый, тэхналагічных прыёмаў выканання і метрычных характарыстык. Існаванне такіх мастацкіх традыцый абмежавана пэўнымі тэрыторыямі. Свае назвы тыпы ручнікоў атрымалі ў адпаведнасці з сучасным тэрытарыяльна-адміністрацыйным падзелам.

---

[1] Напрыклад, у в. Барталамееўка Чачэрскага раёна. Гл.: Голоса ушедших деревень / Г.Г. Нечаева [и др.]; под общ. ред. Г.Г. Нечаевай. Минск, 2008. С. 182.

[2] Арнаменты Падняпроўя / [аўт. тэкстаў Г.Р. Нячаева і інш.; навук. рэд. Я. М. Сахута]. Мінск, 2004. С. 448–457; Голоса ушедших деревень. С. 178.

## Лакальная разнастайнасць варыянтаў ручнікоў

### Светлагорска-акцябрскія ручнікі

Багата арнаментаваныя браныя ручнікі-"набожнікі" канца XIX – пачатку XX ст. лакалізаваны на тэрыторыі заходняй часткі сучаснага Акцябрскага, поўначы Светлагорскага і паўднёвай часткі Жлобінскага раёнаў (мал. 962, 963). Асабліва разнастайныя і складаныя па кампазіцыі ўзоры былі зафіксаваны ў вёсках Маісееўка, Гарохавішчы, Сапейкі Акцябрскага раёна, Мікалаеўка, Мармавічы, Чыркавічы Светлагорскага раёна, Лука Жлобінскага раёна. Мясцовая назва ручнікоў адпавядае тэхніцы іх выканання – "перабраныя".

Кампазіцыі ручнікоў складаюцца са шчыльна спалучаных паміж сабой разнастайных па арнаменце браных бардзюраў. Цэнтральныя бардзюры з буйных элементаў – ромбаў розных малюнкаў – фланкіруюцца вузейшымі палоскамі ромба-геаметрычнага арнаменту. На канцах ручніка, як правіла, размешчаны тры бардзюры, якія кампазіцыйна спалучаюцца прамежкавымі вузкімі бардзюрамі. Паміж элементаў кампазіцыі бардзюраў пакінуты невялікія палосы белага фону. У цэлым кампазіцыі канцоў ручнікоў выглядаюць як суцэльнае ўзорачча (мал. 964, 965). Дробнафестончатае завяршэнне кожнага ўзорнага радка надае бранаму арнаменту багацце і вытанчанасць. У арнаментацыі ручнікоў ужываюцца разнастайныя выявы ромбаў – ад простых



Мал. 962. Набожнікі. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. 340 × 26, 215 × 26, 215 × 25 см. Марта Вежнавец, 1882 г.н. (в. Сапейкі, Акцябрскі раён)



Мал. 963. Ручнік-"набожнік". Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. 256 × 32 см. Елізавета Голуб, 1902 г.н. Захоўваецца ў СДК в. Пратасы Акцябрскага раёна



Мал. 964. Ручнік-"набожнік". Канец XIX ст. Лён, баво́уна, бранае ткацтва. 300 × 28 см. Степаніда Папруга, 1885 г.н. (в. Маісееўка, Акцябрскі раён)



Мал. 965. Набожнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. 340 × × 26 см. Марта Вежнавец, 1882 г.н. (в. Сапейкі, Акцябрскі раён)



Мал. 966. Рукавы сарочкі. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Маісееўка, Акцябрскі раён)

з чатырма кропкамі і ромбаў з парасткамі да складаных ромбаў з кручкамі. Фонавыя прабелы ў браных узорах невялікія і на агульным насычаным чырвоным фоне арнаменту ўспрымаюцца як дадатковы графічны малюнак. Дробнафактурныя палатніны ручнікоў выкананы ў тэхніцы аднаўточнага бранага ткацтва белым баваўняным утком.

Па сваёй стылістыцы і кампазіцыі браныя ручнікі блізкія да ўзорнага запаўнення рукавоў жаночых сарочак, якія сустракаюцца ў тых жа мясцовасцях. Рукавы святочных сарочак цалкам запоўнены шчыльным спалучэннем бардзюраў бранага арнаменту (мал. 966).

Ручнікі гэтага тыпу вузкія – 25–30 см у шырыню і доўгія – да 280–300 см.

## Калінкавіцкія ручнікі

На тэрыторыі Калінкавіцкага раёна вылучаюцца два тыпы браных ручнікоў. Ручнікі, што лакалізаваны ў паўднёвай частцы раёна – у вёсках Вялікія і Малыя Аўцюкі, Залатуха, адрозніваюцца тым, што шырокія чырвоныя палосы рэпсавага ткацтва чаргуюцца ў іх з дробнаўзорнымі палоскамі, якія складаюцца з простых матываў арнаменту "куль" і "перавёрнуты куль". Сустракаюцца ручнікі цалкам чырвона-паласатыя. У в. Вялікія Аўцюкі па-



Мал. 967. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Акцяброва, Кармянскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 968. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай

лоскі называюць "лавачкі", а дробнаўзорныя браныя элементы – "ліштвы" (мал. 967, 968).

Пэўнае падабенства ручнікі гэтага тыпу маюць са слаўгарадска-быхаўскімі ручнікамі, лакалізаванымі на Магілёўшчыне ў раёне Слаўгарада і Быхава. Па прыёмах арнаментацыі яны блізкія да ручнікоў саматужнай вытворчасці з Багуслава Кіеўскай вобласці на Украіне.

Шырыня ручнікоў не перавышае 30 см, даўжыня дасягае 380 см.

## Хойніцка-брагінскія ручнікі

Даўнія браныя ручнікі Брагінскага, Хойніцкага, Нараўлянскага раёнаў адметныя сваімі кампазіцыямі і разнастайнасцю геаметрычных арнаментаў. Сустракаюцца ручнікі, на якіх налічваецца да 20 бардзюраў з рознымі геаметрычнымі элементамі. Шырыня арнаментаваных бардзюраў паступова звужаецца ад нізу ручніка да яго сярэдзіны. Палосы часцяком размешчаны па ўсім полі ручніка з досыць шырокімі прабеламі фону паміж імі (мал. 969, 970).



Мал. 969. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Тонеж, Лельчыцкі раён). Тураўскі краязнаўчы музей, кп 1339 пр 80



Мал. 970. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бранае ткацтва, 36 × 570 см. Тураўскі краязнаўчы музей, кп 1608 пр 161

Ручнікі для абразоў ткалі вельмі доўгія – да 550 см; адным такім ручніком пакрывалі адразу некалькі абразоў.

Браныя ручнікі дадзенага тыпу выраблялі да 1940–1950-х гг. у Брагінскім, Хойніцкім, Лоеўскім раёнах. Распаўсюджвалася гэта традыцыя ў бок Ельска і Лельчыц. Трэба адзначыць, што тут прамежкі паміж бранымі паласамі на ручніках яшчэ больш рэдкія, а арнамент спрошчаны.

## Брагінскія закладныя ручнікі

Брагінскія закладныя ручнікі ўяўляюцца адбіткам агульнай мастацкай традыцыі, якая злучае ў адзіную этнаграфічную зону Мазырскае Палессе і поўнач Украінскага Палесся (Жытомірская і Ровенская вобласці). Узоры ручнікоў паходзяць з Брагінскага і Нараўлянскага раёнаў, якія пасля чарнобыльскай катастрофы трапілі ў зону адсялення.

Арнамент ручнікоў выкана্ны ў тэхніцы закладнога ткацтва і складаецца з простых геаметрычных чырвоных, белых і чорных фігур: ступеньчатых слупкоў, трохкутнікаў, стрэл. Адсутнасць белых прабелаў фону ў арнаменце, значная вага чырвонага і прысутнасць чорнага колеру робяць ручнікі выразнымі і экспрэсіўнымі, што вылучае іх сярод беларускіх ручнікоў (мал. 971).



Мал. 971. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, закладное ткацтва. 284 × 25 см (в. Калыбань, Брагінскі раён). Музей старажытнабеларускай культуры ІІЭФ ЦБКМЛ НАН Беларусі, гч 39. Фота Г.Л. Ліхтаровіча

На сумежнай тэрыторыі Украіны падобныя па кампазіцыі, арнаменце і тэхніцы выканання ручнікі носяць назву “кілімавыя ручнікі”. На фарміраванне гэтай з’явы паўплывала ткацтва кілімаў, тэхніка якіх была прынесена з Усходу. У XVII–XVIII стст. ва Украіне і на памежных беларускіх землях існавала шмат мануфактур і майстэрань, якія выраблялі кілімы. Тэхніка іх вырабу і арнаментыка былі выкарыстаны ў сялянскім ткацтве для стварэння традыцыйных ручнікоў-“набожнікаў”.

## Рагачоўскія закладныя ручнікі

Гэты тып закладных ручнікоў распаўсюджаны ў досыць шырокім арэале Гомельскага і Магілёўскага Падняпроўя. Назва іх умоўная і дадзена адпаведна найбольш выразным узорам ручнікоў, якія паходзяць пераважна з Рага-

чоўскага раёна. Такія ручнікі пашыраны таксама ў Буда-Кашалёўскім і Чачэрскім раёнах, на поўначы Веткаўскага раёна (вёскі Стаўбун, Заляддзе), у Краснапольскім, Бабруйскім, Быхаўскім раёнах. Для іх характэрны ўзбуйнены і просты па матывах геаметрычны арнамент, які мае аднолькавы малюнак на абодвух баках ручніка.

Узорныя канцы рагачоўскіх закладных ручнікоў разнастайныя па кампазіцыях: з арнаментаванымі чырвона- і белафонавымі бардзюрамі ці акцэнтаваным цэнтрам – геаметрычнымі фігурамі буйнага памеру, стылізаванымі выявамі двухгаловых арлоў. Палосы з закладным арнаментам чаргуюцца з дробнымі гладкімі чырвонымі палоскамі, з вузкімі арнаментаванымі бардзюрамі бранага ці пераборнага ткацтва (мал. 972, 973, 974, 975).

Мастацка-тэхналагічныя асаблівасці рагачоўскіх ручнікоў склаліся пад уплывам ткацтва кілімаў, пашыранага на тэрыторыі Украіны ў XVIII – першай палове XIX ст., і кралявецкіх ручнікоў, якія ў пачатку XIX ст. выраблялiся ў майстэрнях саматужнага ткацкага цэнтра ў Краляўцы на Чарнігаўшчыне. На рагачоўскіх ручніках прысутнічаюць характэрныя для кралявецкіх ручнікоў арнаментальныя матывы: двухгаловы арол, стылізаваная дрэва, дрэва-свяцільнік. Гэтыя матывы запазычваліся і адаптаваліся ў ся-



Мал. 972. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, закладное ткацтва



Мал. 973. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, закладное і шасцінітовае ткацтва (в. Рыскаў, Рагачоўскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 15545/1



Мал. 974. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, закладное і шасцінітовае ткацтва (в. Хізава, Кармянскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 975. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, закладное ткацтва. Шырыня 38 см. Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, кп 3328/7

лянскім асяроддзі з дапамогай больш простай у выкананні тэхнікі закладнога ткацтва.

Арнаментаваныя канцы рагачоўскіх ручнікоў выкананы ў тэхніцы чатырох-, шасці- і васьмінітовага ткацтва. Ручнікі шырокія — 34—43 см, іх даўжыня складае 240—350 см.

## Ручнікі міжрэчча Сожа і Бесядзі

Дадзены тып традыцыйных браных ручнікоў быў распаўсюджаны ў арэале міжрэчча Сожа і Бесядзі на тэрыторыі Веткаўскага і Чачэрскага раёнаў.

Ручнікі адметныя ўзбуйненасцю геаметрычнай арнаментацыі, дывановым характарам бранага ўзорачча, якое без падзелу на бардзюры запаўняе канцы ручніка. Яны ўражваюць важкасцю чырвонага колеру і манументальнасцю. Узорачча браных канцоў адасоблена ад неарнаментаванага белага сярэдніка ручніка і вылучаецца сеткавым характарам кампазіцыі. Узбуйненая сетка ўтварае ромбы, у якія ўпісаны элементы арнаменту — ромбы і раўнабокія крыжы. Другі варыянт кампазіцыйнага вырашэння — гэта так званыя ліўневыя кампазіцыі, складзеныя з элементаў, якія спалучаюцца паміж сабой па вертыкалі (мал. 976, 977).



Мал. 976. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. Этнаграфічны музей сярэдняй школы в. Маркавічы Гомельскага раёна. Фота І.Ю. Смірновай



Мал. 977. Ручнік. Пачатак XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Прысно, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 422/1



Мал. 978. Ручнік. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", б/н



Мал. 979. Ручнік. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. 284 × 38,5 см (в. Антонаўка, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 227

Адсутнасць гарызантальна-бардзюрнай разбудовы бранага ўзорачча канцоў і “ліўневыя” кампазіцыі вылучаюць ручнікі міжрэчча Сожа і Бесядзі як сярод ручнікоў Падняпроўя, так і ўвогуле сярод беларускіх ручнікоў. Яны данеслі да нас адзін з архаічных варыянтаў афармлення канцоў ручніка, калі ў кампазіцыі дамінуе адзін арнаментальны элемент, паўторы якога, множнасць ліку прызваны ўзмацніць дабратворныя якасці сакральнага прадмета, яго здольнасць станоўча ўплываць на акаляючую рэчаіснасць (мал. 978, 979).

Шырыня ручнікоў вагаецца ад 31 да 43 см, даўжыня – ад 240 да 370 см.

## Гомельскія ручнікі

Браныя ручнікі з доўгімі канцамі, якія шчыльна запоўнены чырвоным геаметрычным арнаментам, паходзяць пераважна з паўднёвай часткі Гомельскага раёна – вёсак Грабаўка, Глыбоцкае, Заляддзе і вёсак каля Гомеля – Раманавічы, Старая Беліца.

Гомельскія ручнікі маюць дасканала распрацаваны, графічна выразны браны арнамент, у якім пераважаюць прамяністыя ромбы і мальтыйскія крыжы ў ромбах. Дэкаратыўная кампазіцыя канцоў ручніка ўтвараецца дзякуючы разбіўцы асноўнага чырвона-белага масіву бранага ўзорачча на некалькі частак тонкімі палоскамі белага фону. У цэнтральным шырокім бардзюры арнаментальныя фігуры размешчаны адна над адной ці злучаны паміж сабой па прынцыпе сеткі. Варыянт кампазіцыі – цэнтральная шырокая паласа, фланкіраваная ўнізе і ўверсе адным ці, радзей, двума-трыма вузкімі бранымі бардзюрамі. Кампазіцыя замыкаецца некалькімі пракідкамі ўзорнага ўтку. Палатніна ручніка можа быць цалкам заткана вузкімі чырвонымі палоскамі. У цэлым у кампазіцыях і арнаментальным арсенале гэтых ручнікоў шмат агульнага з добрушскімі бранымі ручнікамі (мал. 980).

Гомельскія ручнікі вызначаюцца высокай якасцю выканання, тонкасцю і шчыльнасцю тканіны. Большасць з іх выткана з бавоўны. У аснове больш даўніх ручнікоў – лён. Шырыня ручнікоў – ад 28–30 да 33–38 см, даўжыня складае 240–290 см. Значнай даўжынёй браных канцоў, манументальнасцю, паласатым сярэднікам, складанай разбудовай кампазіцыі і бездакорнай якасцю выканання вылучаюцца ручнікі з в. Раманавічы, што побач з Гомелем. Іх даўжыня дасягае 350 см пры шырыні палатніны 32–36 см. Сустракаюцца руч-



Мал. 980. Ручнікі. Канец XIX – пачатак XX ст. Бавоўна, бранае ткацтва. 237 × 28, 237 × 32 см (набыты ў в. Старая Беліца Гомельскага раёна і в. Юркавічы Веткаўскага раёна). Музей старажытнабеларускай культуры ІЭФ ЦБКМЛ НАН Беларусі, кп 2422 т 1265. Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 716. Фота Г.Л. Ліхтаровіча

нікі, арнамент якіх выкананы ў чорным колеры. Яны, магчыма, мелі жалобнае прызначэнне і выкарыстоўваліся для аздаблення абразоў у пост.

Досыць шырокае бытаванне ручнікоў гэтага тыпу на тэрыторыі Гомельскага, Веткаўскага, Добрушскага раёнаў і па правабярэжжы Дняпра можа сведчаць аб іх мануфактурнай і саматужнай вытворчасці. Падобныя па арнаменце і кампазіцыі ручнікі выяўлены ў памежных з Беларуссю вёсках Навазыбкаўскага раёна Бранскай вобласці Расіі.

## Добрушскія браныя ручнікі

Браныя ручнікі з доўгімі канцамі багатага ромба-геаметрычнага арнаменту паходзяць з Добрушскага і часткова з Гомельскага раёна. На поўначы тэрыторыя іх распаўсюджання абмежавана ракой Іпуць, на захадзе – Сожам.

Па кампазіцыі ўзорачча канцоў добрушскія ручнікі падобныя да гомельскіх браных ручнікоў. Шырокі сеткавы бардзюр заключаны паміж двума вузейшымі бардзюрамі з паўторам аднастайных геаметрычных элементаў – ромбаў, касых крыжоў. У цэнтральным бардзюры спалучаюцца два прынцыпы кампазіцыйнай пабудовы арнаменту, уласцівыя браным ручнікам Гомельскага Падняпроўя: вертыкальная ланцуговасць і сеткавасць.

Другі тып кампазіцыі бранага ўзору добрушскіх браных ручнікоў – некалькі асобных бардзюраў ромба-геаметрычнага арнаменту з невялікімі прабеламі фону паміж імі (мал. 981, 982) .



Мал. 981. Ручнік. Пачатак ХХ ст. Бавоўна, бранае ткацтва (в. Губічы, Буда-Кашалёўскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 982. Ручнік. Пачатак ХХ ст. Бавоўна, бранае ткацтва (Добрушскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай

Сустракаюцца ручнікі, цалкам затканыя чорным колерам. Звесткі пра іх прызначэнне адсутнічаюць. Верагодна, яны з'яўляліся жалобнымі і выкарыстоўваліся ў памінальна-пахавальных абрадах. Іх вытворчасць была звязана з ткацкімі мануфактурамі, якія існавалі на тэрыторыі Добрушскага раёна ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. На карысць гэтага сведчыць тое, што ручнікі цалкам выраблены з бавоўны і адрозніваюцца высокай якасцю выканання. Іх шырыня 25–30 см, даўжыня 228–300 см.

## Добрушскія пераборныя ручнікі

Арыгінальныя па кампазіцыі, арнаментальных матывах і тэхніцы выканання пераборныя ручнікі паходзяць пераважна з усходняй часткі Добрушскага раёна. Яны датуюцца пачаткам XX ст.

Ручнікі вузкія, іх шырыня не перавышае 25–30 см, даўжыня складае 180–300 см. Канцы ручнікоў на 45–60 см у вышыню шчыльна запоўнены своеасаблівымі кампазіцыямі з выявамі стылізаванага "дрэва жыцця", разетак, "калодзежа", вялікіх ромбаў. Ім няма аналагаў сярод беларускіх ручнікоў. У пэўнай стылістычнай роднасці яны знаходзяцца з кралявецкімі ручнікамі, бо маюць падобныя антрапаморфныя выявы арант-"свяцільнікаў", іх цэнтральная кампазіцыя таксама замыкаецца па баках у рамку вертыкальнымі палосамі арнаменту ці зігзагамі, а знізу і зверху абмежавана вузкімі ўзорнымі палосамі (мал. 983).



Мал. 983. Ручнік-"набожнік". 1910-я гг. Бавоўна, аднабаковы перабор. 318 × 28 см (в. Баршчоўка, Добрушскі раён). Веткаўскі музей старaабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, кп 316 /1. Фота Г.Л. Ліхтаровіча

Тэхніка выканання ручнікоў – аднабаковы перабор з прыцiскной асновай – дае магчымасць адвольна ствараць разнастайныя малюнкі. Дробныя слупкі з трох нітак узорнага ўтку чырвонага і чорнага колеру ўтвараюць відарыс і пругкі рэльеф арнаменту.

Пераборныя канцы выкананы звычайна асобна і прышыты да палатніны ручніка. Сустракаюцца і суцэльныя ручнікі, якія маюць паласаты сярэднік, уздоўж ператыканы простымі чырвонымі і вузкімі арнаментаванымі чырвона-чорнымі шлячкамі. Усе вядомыя ўзоры ручнікоў цалкам выкананы з баваўняных нітак. Іх выраблялі на продаж. Пераборныя канцы ручнікоў выкарыстоўваліся нявестамі як вясельныя дары. Цэнтрам вытворчасці браных і пераборных ручнікоў у Добрушскім раёне, магчыма, былі вёскі Кузьмінічы і Цераxоўка. Ручнікі гэтага тыпу распаўсюджаны на значнай тэрыторыі ў Добрушскім і ва ўсходняй частцы Веткаўскага раёна.

## Буда-кашалёўскія ручнікі

Тып браных і брана-выбарных ручнікоў, якія распаўсюджаны ў правабярэжнай частцы Гомельскага Падняпроўя – у вёсках Чабатовічы, Рудня-Альхоўка, Ясока, Негаўка, Івольск, Сінічына, г.п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна і суседнім Гомельскім раёне. Мясцовая назва такіх ручнікоў – “платок”, “набожны платок”. Тканыя ручнікі-“платкі” перасталі вырабляць у 1920-я гг.

Буда-кашалёўскія ручнікі ўвабралі ў сабе ўвесь дэкаратыўны спектр магчымасцей бранага і выбарнага ткацтва. Для іх характэрна багацце арнаментальных матываў, пашыраная каляровая гама (мал. 984, 985, 986, 987) .

Арнаментальная кампазіцыя ручнікоў адпавядае традыцыям браных ручнікоў Гомельскага Падняпроўя. Іх аснову ставрае рамбічная сетка з вертыкальным прынцыпам спалучэння элементаў. Для арнаментыкі ручнікоў характэрны разнастайныя элементы: ромбы, ромбы з розным запаўненнем унутры (ромбы адзін у адным; ромбы, падзеленыя касым крыжам на чатыры малыя ромбы; ромбы з чатырма кропкамі), ромбы з парасткамі, ромбы з кручкамі (чатырма і больш), прамавугольнікі. Гэта дазваляе вызначыць бу-



Мал. 984. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Ясакор, Буда-Кашалёўскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 985. Ручнік-“набожнік”. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, выбарнае ткацтва (в. Патапаўка, Буда-Кашалёўскі раён). Са збору В.А. Лабачэўскай



Мал. 986. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Івольск, Буда-Кашалёўскі раён)



Мал. 987. Ручнікі. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, воўна, бранае ткацтва. Свята-Мікалаеўская царква в. Івольск Буда-Кашалёўскага раёна

да-кашалёўскія браныя ручнікі як адну з разнавіднасцей арэальнага тыпу браных ручнікоў Гомельскага Падняпроўя і Пасожжа.

Буда-кашалёўскія ручнікі маюць розную даўжыню – ад 200–215 да 250–260 см пры аднолькавай шырыні 27–30 см.

Арнамент ручнікоў выконваўся ў традыцыйным чырвоным колеры, а таксама ў карычневым, чорным (ніці асновы фарбаваліся раслiннымі фарбавальнікамі), жоўтым, блакітным, зялёным колеры. У браным ткацтве палосы рознага колеру чаргуюцца паміж сабой. Пры ўжыванні выбару асобныя элементы ў адным бардзюры адрозніваюцца па колеры. Ручнікі дадаткова аздабляліся кумачовымі ці рознакаляровымі палоскамі куплёнага паркалю ў спалучэнні з карункамі.

## Прыснянскія ручнікі

Гэта пераборныя ручнікі з доўгімі чырвонымі канцамі, на якіх белымі, чорнымі ці блакітнымі ніткамі вытканы буйныя элементы геаметрычнага арнаменту ці стылізаваны раслінны ўзор тыпу "дрэва жыцця". Тэхніка выканання – аднабаковы перабор "пад слупок". Назву ручнікі атрымалі ад в. Прысна Веткаўскага раёна, дзе выяўлена найбольшая колькасць такіх узораў. Падобныя ручнікі сустракаюцца і ва ўсходняй частцы Веткаўскага раёна.

Такі тып пераборнага ручніка заступіў месца браных ручнікоў, якія былі шырока распаўсюджаны ў канцы XIX – пачатку XX ст. на Пасожжы (Веткаўскі, Буда-Кашалёўскі раёны). Пераборныя ручнікі паўтараюць вертыкальныя кампазіцыі даўніх браных ручнікоў, у якіх геаметрычныя элементы размешчаны адзін над адным, злучаны паміж сабой па вертыкалі. Для пераборных ручнікоў характэрны таксама ўзбуйненыя сеткава-геаметрычныя арнаменты і паўнатуральныя раслінныя ўзоры. Сустракаюцца ручнікі з рознымі па малюнку і тэхніцы выканання канцамі. Адзін канец можа мець геаметрычны браны арнамент, другі – раслінныя бела-блакітныя пераборныя выявы на чырвоным фоне. Такі прыём тлумачыцца своеасаблівым спосабам навешвання ручнікоў-"набожнікаў" на абразы, які быў характэрны для раёнаў правабярэжнага Гомельскага Падняпроўя (Веткаўскі, Буда-Кашалёўскі раёны). На адзін абраз тут было прынята вешаць адразу па дватры набожнікі (мал. 988).



Мал. 988. Ручнік. Фрагмент. Бавоўна, аднабаковы перабор. ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", б/н

Пераборныя канцы ручнікоў ткаліся асобна з бавоўны і прышываліся да льнянога палатна грубага гатунку, якое пры навешванні ручнікоў на абразы перакрывалася тканымі канцамі іншых ручнікоў і не было бачна. Шырыня пераборнага канца 35–42 см, вышыня кампазіцыі 70–80 см, даўжыня ручнікоў 240–300 см.

Значны раён распаўсюджання пераборных ручнікоў гэтага тыпу сведчыць аб тым, што іх выкарыстоўвалі ў якасці вясельных падарункаў і, магчыма, выраблялі на продаж.

## Чачэрскія ручнікі

Чырвоныя манументальныя доўгія ручнікі бранага ткацтва паходзяць з паўднёвай часткі Чачэрскага раёна і вядомы ў літаратуры пад назвай "чачэрскія". Мясцовая назва ручнікоў – "красныя ручнікі". Адпаведна тэхніцы выканання спосабам бранага ткацтва іх называлі "закладанымі". Цэнтрамі вырабу ручнікоў гэтага лакальнага варыянта да 1920-х гг. былі вёскі Бабічы, Покаць, Нісімкавічы, Валосавічы. Арэал іх распаўсюджання ахоплівае суседні Кармянскі раён і паўночную частку Веткаўскага раёна.



Мал. 989. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Палессе, Чачэрскі раён)



Мал. 990. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва (в. Палессе, Чачэрскі раён)

Ручнікі маюць доўгія дэкарыраваныя канцы, затканыя на 70–100 см ўзбуйненым арнаментам. Чырвоны колер у арнаменце дамінуе над нязначнымі прамежкамі белага фону. Кампазіцыя складаецца з трох-чатырох браных арнаментальных бардзюраў, у якіх паўтараюцца некалькі вялікіх аднолькавых геаметрычных элементаў. Арнаментаваныя бардзюры аддзелены адзін ад аднаго "калодкамі" – шчыльнымі чырвонымі палосамі рыпсавага перапляцення. Знізу і зверху ўся кампазіцыя аблямавана пучкамі вузкіх чырвоных палосак.

Для арнаментыкі ручнікоў характэрна 16-пялёсткавая акруглая разетка, падобная на кветку. У больш даўніх ручніках сустракаюцца выявы ромба з кручкамі ці ромба-крыжа, простага ромба, структураванага ўнутры абрысамі ромбаў меншага памеру, а звонку аформленага прыступкамі-зубцамі. У чачэрскіх ручніках больш ранняга паходжання арнаментальныя палосы бываюць выкананы і ў тэхніцы закладнога ткацтва ці ў спалучэнні бранага ткацтва з закладным (мал. 989, 990).

Чачэрскія ручнікі сінтэзавалі мясцовыя традыцыі рознага часовага паходжання. Агульны характар іх арнаментацыі блізкі да браных ручнікоў міжрэчча Сожа і Бесядзі. Наяўнасць шырокіх міжузорных чырвоных палос аб'ядноўвае іх з даўнім чачэрскім строем адзення, у якім рыпсавымі глухімі чырвонымі палосамі аздоблены фартухі, палікі і манжэты рукавоў кашуль, хусткі.

Ручнікі ў асноўным шырокія – да 49 см, але трапляюцца і вузкія – да 28 см. Яны маюць значную даўжыню – 290–360 см. Палатно ручніка ткалі з ільну і бавоўны ў тэхніцы аднаўточнага чатырохнітовага ткацтва. Арнаментаваныя канцы аблямаваны чырвона-белымі мохрыкамі, плеценымі на дошчачках, ці вузкай абвязкай кручком.

## Неглюбскія ручнікі

Неглюбскія ручнікі захоўваюць агульныя рысы падняпроўскіх ручнікоў. Гэты тып ручніка лакалізаваны ў в. Неглюбка і ў навакольных вёсках Веткаўскага раёна. На працягу XX ст. мастацка-тэхналагічныя традыцыі неглюбскіх ручнікоў бесперапынна развіваліся. Па сваім мастацка-кампазіцыйным каноне яны блізкія да ручнікоў сумежнага Навазыбкаўскага раёна Бранскай вобласці Расіі.

Ручнікі падзяляюцца на некалькі тыпаў, якія розняцца тэхнікай выканання, каларыстыкай, але родныя паміж сабой непаўторнай калонападобнай цэнтрычнай кампазіцыяй дэкору і багатым арсеналам арнаментальных матываў.

Найбольш ранні варыянт неглюбскіх ручнікоў – браныя чырвона-белыя ручнікі канца XIX ст. (мал. 991). Напачатку XX ст. сфарміраваліся пераборныя "закладаныя" чырвона-белыя ручнікі з узбуйненай геаметрычнай арнаментыкай. У 1930-я гг. традыцыйнае чырвона-белае спалучэнне колераў у неглюбскіх пераборных ручніках узбагацілася ўвядзеннем дадатковага – чорнага – колеру. З сярэдзіны XX ст. неглюбскія ручнікі сталі паліхромнымі дзякуючы ўжыванню разнастайных матэрыялаў: мулінэ, ірысу, шоўку,



Мал. 991. Ручнік. Фрагмент. Пачатак XX ст. Бавоўна, бранае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). Веткаўскі музей старaабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава



Мал. 992. Ручнік. Фрагмент. 1970-я гг. Бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)



Мал. 993. Ручнік. Фрагмент. 1970-я гг. Бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)

акрылу. Даўжыня ручнікоў павялічылася з трох да пяці і нават сямі метраў (мал. 992, 993, 994, 995) .



Мал. 994. Ручнік. Фрагмент. 1970-я гг. Бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)



Мал. 995. Ручнік. Фрагмент. 1970-я гг. Бавоўна, пераборнае ткацтва (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)

Кампазіцыя неглюбскага ручніка будуецца з сямі-дзевяці арнаментаваных палос, па-мясцоваму – “хрястоў”. Яе цэнтр вызначаны шырокай паласой, у якой звычайна змешчаны два вялікія арнаментальныя элементы. Цэнтральная частка люстэркава абрамлена іншымі “хрястамі”. Сярэднік доўгіх неглюбскіх ручнікоў звычайна ператкацаны чырвонымі гладкімі ці дробнаарнаментаванымі палосамі.

У неглюбскіх ручніках налічваецца больш за семдзесят элементаў арнаментаў. Сярод іх найбольш часта ўжываюцца ромб з кручкамі – “кручча”, ромб з парасткамі – “вядзьмедзі”, ромб з прамым крыжам унутры – “раскол-

ка", гародчаты ромб з касым крыжам – "лапа", васьміпялёсткавая зорка – "васьмірогі" і інш.

Асобныя неглюбскія ткачыхі і сёння ткуць яшчэ пераборныя ручнікі для ўласных патрэб ці на заказ.

## Ручнікі ў інтэр'еры

На Гомельшчыне для вызначэння ручнікоў рознага функцыянальнага прызначэння ўжываюцца назвы "набожнікі" і "ручнікі". "Набожнік" – гэта тканы, з традыцыйным чырвоным браным арнаментам на белым фоне ручнік. "Ручнік" – гэта пераважна вышываная тканіна з узорамі расліннага характару. Кажуць: "Ручнік – не набожнік" (в. Мадора, Рагачоўскі раён). Па традыцыі на абразах павінен вісець тканы ручнік. У Калінкавіцкім, Веткаўскім, Чачэрскім, Светлагорскім раёнах у куце на іконы прынята вешаць менавіта традыцыйны тканы ручнік (мал. 996, 997, 998, 999). Таму тут да нашага часу ўжываюць ручнікі 1920–1940-х гг. і вырабляюць іх па старых узорах. У іншых раёнах гэтая традыцыя цалкам саступіла месца аздабленню кута больш сучаснымі вышыванымі ручнікамі. "Ручніком" прынята называць вышываныя ручнікі, якія вешалі таксама на рамкі і сцены, на цвікі, на партрэты, на люстра. Сустракаюцца інтэр'еры вясковых хат, асабліва на Усходнім Палессі, дзе ручнікі віселі ўсюды, і пра гэта казалі: "Штоб красіво ўжэ было!" (в. Сінічына, Буда-Кашалёўскі раён).

У Жлобінскім раёне ручнікі для абразоў называюць "ручнік на Бога" (в. Кіцін). У Буда-Кашалёўскім і Светлагорскім раёнах для тканых і вы-



Мал. 996. Кут з набожнікамі ў хаце Ганны Міцкевіч, 1910 г.н. (в. Мармавічы, Светлагорскі раён). 2005 г.



Мал. 997. Кут з набожнікам (в. Чыркавічы, Светлагорскі раён). 2005 г.



Мал. 998. Кут з набожнікам (узор "лавачкамі") у хаце Таццяны Века, 1928 г.н. (в. Малыя Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2003 г.



Мал. 999. Кут з набожнікам у хаце Варвары Маскаленка, 1924 г.н. (в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2005 г.

шываных ручнікоў, якія вешалі ў куце, прынята назва "платок": "Платок – ручнік на ікону, запалаччу натыкалі" (в. Мыслаў Рог, Светлагорскі раён); "Платок – гэта набожнік считаўся". Назва "платок" паходзіць ад старажытнарускага слова "плат". Ручнік называлі "платком", магчыма, таму, што ім абгортвалі абраз і злучалі канцы ўнізе падобна таму, як жанчына павязвае хустку: накладае на лоб і завязвае пад барадой.

У Буда-Кашалёўскім раёне на абраз вешалі два ці нават тры ручнікі-"набожнікі" так, каб завяршэнні ручнікоў былі бачны адзін з-пад аднаго. Да некаторых ручнікоў прышыты дадатковыя, адрозныя па арнаменце тканыя канцы. Такое афармленне ручніка тлумачыцца мясцовым спосабам аздаблення покуці. Калі такі ручнік вешалі ў куце, стваралася ўражанне, што на абразу вісяць адзін на адным два ручніка. Традыцыйнае афармленне кута ў другой палове XX ст. было дапоўнена зверху папярочнай фіранкай, якую называлі "брыжжа", і занавескамі з цюлі – "шырмай".

Вельмі багата ўбіраюць кут у в. Неглюбка Веткаўскага раёна. Тут склалася пэўная кампазіцыя размяшчэння тканін. Тры абразы, якія ўсталяваны на паліцы, пакрываюць набожнікам, другі, найбольш багата аздоблены тканы ручнік прымацоўваецца да столі і носіць назву "ручнік". Ён утварае арку, партал, за якім знаходзяцца абразы. Па баках спушчаны дэкаратыўныя канцы, а ўверсе расцягнута паласатая сярэдзіна ручніка, падобная да вясёлкі.



Мал. 1000. Інтэр'ер кухні ў хаце Ульяны Петрашэнка, 1938 г.н. (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). 2010 г.



Мал. 1001. Покуць у хаце Анастасіі Кароткай, 1927 г.н. (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). 2010 г.



Мал. 1002. Інтэр'ер у хаце Ефрасініі Дзямчыхінай, 1935 г.н. (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). 2010 г.

Унізе пад паліцай з абразамі змешчана вышываная фіранка – "накутнік" (мал. 1000, 1001, 1002).

З'яўленне вышываных накутнікаў – больш позняя традыцыя, якая пашырылася ў другой палове XX ст. Валянціна Халюкова, 1931 г.н., распавяла, што вышываць крыжыкам, ажурнай вышыўкай – строчкай-перавіўкай з насцілам і адвольнай гладдзю пачало яе пакаленне жанчын: "Раней накутнікаў не было, мы ўжо сталі вышываць". У хатах ручнікі змяняюць на Вялікдзень, другі раз – на Каляды зімой. У пост вешаюць самыя "слабенькія" набожнікі. Афармленне кута ў в. Неглюбка з'яўляецца своеасаблівай візітоўкай жанчыны – паказчыкам яе рукадзелля як ткачыхі і вышывальшчыцы, дбайнасці як гаспадыні.

Традыцыю аздабляць па-неглюбску кут перанеслі на новыя месцы жыхарства чарнобыльскія перасяленцы з в. Неглюбка. Напрыклад, Алена Баннік, 1929 г.н., якая жыве ў в. Шчадрын Жлобінскага раёна, прыбірае кут у сваім доме, як і на радзіме, пераборнымі ручнікамі (мал. 1003) .

Фіранкі-"завескі" прысутнічаюць у афармленні кутоў у Чачэрскім раёне (мал. 1004). У Калінкавіцкім, Жыткавіцкім, Лельчыцкім раёнах у другой палове XX ст. кут пачалі завешваць вышыванымі фіранкамі: папярочнай і дзвюма падоўжнымі. Нярэдка за імі не відаць абраза. Можна меркаваць, што такая традыцыя ўзнікла ў савецкі час як рэакцыя на меры па антырэлігійнай бараць-



Мал. 1003. Інтэр'ер "кабінета" неглюбскай ткачыхі Алены Баннік, 1929 г.н. (в. Шчадрын, Жлобінскі раён). 2005 г.



Мал. 1004. Кут з ручніком, накутнікам і фіранкай-"завескай" у хаце Ганны Лаўрэнавай, 1935 г.н. (в. Будзішча, Чачэрскі раён). 2003 г.



Мал. 1005. Інтэр'ер у хаце Сцепаніды Паповіч, 1931 г.н. (в. Дзяржынск, Лельчыцкі раён). 2011 г.



Мал. 1006. Інтэр'ер у хаце Ганны Таргоні, 1952 г.н. (в. Дзяржынск, Лельчыцкі раён). 2007 г.

бе ўлад, калі вяскоўцам забараняЛі мець у хаце абразы. У Лельчыцкім, Жыткавіцкім, Петрыкаўскім раёнах часам можна бачыць, што ў хаце вышыванымі фіранкамі завешаны згодна з традыцыяй не толькі чырвоны кут, а і астатнія тры куты ў хаце (мал. 1005, 1006). У 1970–1980-я гг. куты з абразамі і ручнікамі пачалі дадаткова закрываць празрыстымі фіранкамі з гардзіннага палатна.

## Ручнікі і тканіны ў абрадах

У рэгіёне да 1980-х гг. захоўвалася традыцыя ўжывання тканін уласнага вырабу ў абрадавых практыках: на хрэсьбінах, вяселлі, у пахаванні, у якасці аброкаў. У 1950–1970-я гг. у некаторых раёнах, асабліва дзе ў вёсках працягвалі займацца ткацтвам у хатніх умовах, спецыяльна рыхтавалі вясельныя ручнікі і наміткі на падарункі, назапашвалі іх у пасаг. У канцы XX ст. традыцыйныя тканіны, асабліва ручнікі-"набожнікі", пераводзілі ў сакральную сферу шляхам ужывання іх у якасці аброкаў, якія прынята прыносіць на крыжы, у царкву. Ручнікі і настольнікі знаходзілі выкарыстанне ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Сабраныя намі матэрыялы, у тым ліку візуальныя, дазваляюць прасачыць дынаміку гэтага працэсу. Яны сведчаць пра тое, што традыцыя вырабу тканін для абрадавых мэт у канцы XX ст. перарвалася. На змену дамātканым вырабам прыйшлі тканіны фабрычнай вытворчасці, стужкі, штучныя кветкі.

У пачатку XX ст. на Падняпроўі існавала традыцыя вырабу ручнікоў спецыяльнага прызначэння – для хрэсьбіннага абраду. Яны мелі багатае дэкаратыўнае вырашэнне, аб чым сведчаць узоры, што захаваліся. У Чачэрскім раёне на хрэсьбінах дзіця, якое маці трымала на руках, накрывалі кавалкам палатна накшталт ручнічка, які з двух бакоў быў аздоблены браным арнамен-



Мал. 1007. Ручнічок-"полотенце". Лён, бавоўна, бранае ткацтва. 100 × 44 см (в. Маркавічы, Гомельскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 15834/6



Мал. 1008. Ручнічок абрадавага прызначэння. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, бранае ткацтва. Этнаграфічны музей сярэдняй школы в. Маркавічы Гомельскага раёна. Фота І.Ю. Смірновай

там. Ручнічок называўся "крылатка", "крыласцік" (в. Шырокае, Залессе) (мал. 1007, 1008). "Наметкай" абгортвалі дзіця адразу пасля нараджэння (в. Сапейкі, Акцябрскі раён), наміткай на хрэсьбінах абдорвалі куму (в. Зяляночы, Калінкавіцкі раён).

Асабліва шмат рыхтавалі ручнікоў, намітак і іншых тканін да вяселля. Напрыклад, на вяселлі ў Кармянскім раёне, калі малады прыязджаў па маладую, старшая – "большая" – дружка звязвала ручніком іх рукі: "Жаніх ужо як прыязджае за маладой, тады ўжо рукі ручніком звязваюць" (Хрысціна Бурдоленка, 1930 г.н., в. Акцяброва, Кармянскі раён. Зап. 2003 г.). На Тураўшчыне прынята было перавязваць маладых, калі іх садзілі на покуць, доўгай наміткай –"завівалам" (мал. 1009, 1010). У в. Зяляночы Калінкавіцкага раёна маладую закручвалі наміткай так, каб жаніх не бачыў яе твару – "каго бярэ".

У в. Слабада Лельчыцкага раёна да вяселля маладая рыхтавала сярод іншага ручнічок "насвечнік": "Эта кажуць "на свечку". Пры вянчанні ў царкве маладая трымала ў руцэ свечку разам з ручнічком.

На вяселле ручнікамі сваёй работы абавязкова перавязвалі сватоў. У Кармянскім раёне нявеста дарыла ручнікі свекрыві, залоўкам, дзеверам, хроснай маці і хроснаму бацьку. Госці абдорвалі маладую акрамя ўсяго іншага наміткамі, палатном. Наміткамі – тонкім кужэльным палатном – падпяразвалі найбольш ганаровых удзельнікаў вяселля: сватоў (в. Мадора, Рагачоўскі раён), свата і сваццю, а астатніх перавязвалі пакупной тканінай – "крамам" (в. Беразнякі, Жыткавіцкі раён) (мал. 1010, 1012) .

У 1970-я гг. колькасць падарункаў на вясковых вяселлях значна ўзрасла. Анастасія Юрчак, 1932 г.н., з в. Валосавічы Акцябрскага раёна на вяселлі



Мал. 1009. Намітка. Пачатак XX ст. Лён, бранае ткацтва. 430 × 46 см (в. Залатуха, Калінкавіцкі раён)



Мал. 1010. Намітка. 1950-я гг. Лён, бавоўна, бранае ткацтва – "пераборы". 252 × 44 см. Хрысціна Коваль, 1932 г.н. (в. Глушкавічы, Лельчыцкі раён)



Мал. 1011. Постаў, пастаўчык і настольніца з узорам "крывулька". 1960-я гг. Лён, ткацтва ў чатыры ніты. Таццяна Радзько, 1931 г.н. (в. Малыя Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2005 г.

сваёй дачкі абдарыла “сто душ”: “Усім жа ж і падаркі нада. Мужыкам рушнікі, а жэншчынам мацер’ял. А вот бацьку хроснаму і сватам ужэ, ім ужэ пачці па тры метры, доўгія завязывалі. А этым, што за сталом, па два метры, на шыю і ўсе. І хроснаму бацьку. А свякрухі давалі скацеркі тканыя. Тады ж мацер’ялу шчэ мала было. А купляць не было за што. Вот такое ўжэ давалі. Я сваей свякрусі давала скацерку і рушнік” (зап. 2005 г.).



Мал. 1012. Ручнікі на падарункі. 1970-я гг. Бавоўна, ткацтва ў чатыры ніты. 165 × 35 см. Таццяна Радзько, 1931 г.н. (в. Малыя Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2005 г.

У гэты час яшчэ захоўвалася вясельная традыцыя рабіць агледзіны пасагу нявесты. Дзеючымі асобамі гэтага абраду былі сваха і дружкі маладой. У розных раёнах ён праходзіў з адметнымі мясцовымі асаблівасцямі: “Як свадзьба, вешаюць ужо тады прыданае. Нявесту прывязуць і тады на лаўках сваццця эта ўжо танцует. Лаўкі ж былі кругом. І ручнікі вешаюць ўсі нашываныя. Тады ўжо глядзяць: ой, багатая нявеста, багата ручнікоў – усяго багата!” (Хрысціна Бурдоленка, 1930 г.н., в. Акцяброва, Кармянскі раён. Зап. 2003 г.); “Тады ж не січасная свадзьба! Рушнікамы бабы падвешваюцца па вуліцы. Ну, во павесіць на плячы і скача. На руку пачэпіць да і скача з ім. Нясуць гэта глядзець, ці багатая, ці ё ў яе што такое. І скацеркі, рушнікі. Усё вешаюць. А прыдуць у хату к маладому, мяне, напрымер, прывялі, ставяць на вокны. Пазавешваюца – цёмная хата. Ой, тады інцерасней было, чам цяпер!” (Марыя Атрошчанка, 1929 г.н., в. Бяляеўка, Чачэрскі раён. Зап. 2003 г.); “От даюць у нас дзеўку, то мода была ручнікі ткаць. Трэба. От і я ткала сваім дзяўкам. І по дзесяць і по дваццаць. І ўжэ на гвоздзікі. Завезуць маладу к хлопцу, і чапляюць ужэ і на абразы, і чапляюць. То так” (Праскоўя Палуянава, 1918 г.н., в. Данілевічы, Лельчыцкі раён. Зап. 2004 г.); “Кажуць, вой, навешала рушнікоў! Дзеўкі бягуць і глядзяць, колькі рушнікоў павесіла” (Ульяна Коўб, 1915 г.н., в. Слабада, Лельчыцкі раён. Зап. 2005 г.).

Семантыку шляху і медыятара паміж “гэтым” і “тым” светам захоўваў ручнік у пахавальна-памінальнай абраднасці. Трывала існавала ўяўленне пра тое, што і на “тым” свеце ручнік будзе патрэбны чалавеку. Невялікі вузенькі “рушнічок” (маглі вышыць, раней былі тканыя) затыкалі за пояс нябожчыку, як мужчынам, так і жанчынам, “штобы на тым свеце ўціраўся” (в. Сінічына, Буда-Кашалёўскі раён). Ручнік клалі ў труну: “Кажуць, будзе ўціраццa

там" (в. Ліпляны, Лельчыцкі раён); "Ну, каб там выціраўся, і палаценца кладуць" (в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі раён); "Каб дарога была на той свет. Каб дарога была" (в. Юдзічы, Рагачоўскі раён).

Распаўсюджана было выкарыстанне ў пахавальных звычаях намітак (мал. 1013, 1014). "Наметкай" – дзвюма неразрэзанымі наміткамі абабівалі дамавіну па баках. Гэтая намітка ўяўляе сабой "завівала", якім прынята было звязваць маладых (в. Залатуха, Калінкавіцкі раён). Наміткі, якія калісьці былі галаўнымі павязкамі замужніх жанчын, у другой палове XX ст. захоўвалі сярод рэчаў: "на смерць" "Намётка – блюдуць, каб абабіць дамавіну" (в. Акцяброва, Кармянскі раён). У в. Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна паведамілі, што наміткі, прызначаныя для пахавання, не ператкалі краснымі ніткамі, г. зн. гэта было чыста белае палатно.



Мал. 1013. Намітка. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, вышыўка крыжыкам. 340 × 40 см (в. Новыя Завалёны, Акцябрскі раён). Цэнтр гісторыі і культуры г.п. Акцябрск, кп 1129



Мал. 1014. Намітка. Канец XIX ст. Лён, бранае ткацтва. Арына Дулеб, 1910 г.н. (в. Малыя Аўцюкі, Калінкавіцкі раён)



Мал. 1015. Надмагільны крыж з ручніком на Радаўніцу (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). 2005 г.



Мал. 1016. Надмагільны крыж з тканым ручніком на Радаўніцу (в. Здудзічы, Светлагорскі раён). 2010 г.

Ручнік суправаджае чалавека ў апошні шлях. Яго пакідаюць на надмагільным крыжы пасля пахавання. На Радаўніцу ў Светлагорскім і Акцябрскім раёнах на крыж вешаюць толькі палавіну бранага ручнікаў-"набожніка". Ручнік разрэзваюць папалам, робяць у ім пасярэдзіне дзірку і надзяваюць зверху на крыж. Унізе ручнік падпяразваюць стужкай так, што атрымліваецца, нібы крыж апрануты ў сарочку, як чалавек. Падобна рабілі вопратку для немаўляці – "мятлік". У сярэдзіне кавалка палатна прарэзвалі дзірку, надзявалі праз галаву на дзіця і перавязвалі яго паяском. Другую палавіну разрэзанага ручніка вешалі на крыж на наступны год на Радаўніцу (Веткаўскі, Светлагорскі раёны) (мал. 1015, 1016, 1017).



Мал. 1017. Надмагільны крыж з вышываным ручніком на Радаўніцу (в. Здудзічы, Светлагорскі раён). 2010 г.

У в. Слабада Лельчыцкага раёна прынята было пры пахаванні засцілаць века дамавіны настольнікам. Гэты звычай тлумачаць наступным чынам: "Штоб свой стол быў. Ужэ ўстае. То это відом, ліцом устае, а на ногі



Мал. 1018. Могілкі – "кладоўе" на Радаўніцу. Паліна Ермакова, 1929 г.н. (в. Будзішча, Чачэрскі раён). 2010 г.



Мал. 1019. Настольнік на магіле на Радаўніцу (в. Будзішча, Чачэрскі раён). 2010 г.

сцелюць, от дасюль, туды, а сюды не закрываюць настольніцаю" (Вера Прыходзька, 1932 г.н., в. Слабада, Лельчыцкі раён. Зап. 2005 г.).

У Веткаўскім, Чачэрскім, Светлагорскім раёнах усе магілы на Радаўніцу пакрываюць настольнікамі (мал. 1018, 1019): "Расцілаюць скацеркі, кажды на свайго мерцвяца" (в. Здудзічы, Светлагорскі раён). У в. Залессе Чачэрскага раёна гэты звычай тлумачаць так: "Тады чалавеку на тым свеце святло". У в. Неглюбка Веткаўскага раёна магілы засцілаюць не толькі настольнікамі, але і тканымі чырвона-белымі хусткамі, якія выйшлі з ужытку ў якасці жаночых галаўных убораў. Соф'я Міхіна, 1933 г.н., сказала пра тканую хусту, якая была на Радаўніцу заслана на магіле: "Маці моёй памяць".

Паўсюдна з 1980-х гг. прынята засцілаць посцілкамі сваёй работы машыну з труной пры пахаванні. Так, Варвара Бурма, 1936 г.н., з в. Капцэвічы Петрыкаўскага раёна сказала аб гэтым звычаі: "Буду на сваіх ляжаць, як туды паеду".

## ПОСЦІЛКІ

Да 1950-х гг. у вёсках пераважна ткалі клятчастыя посцілкі з ільну, з ільну і воўны саржавым перапляценнем "у касічку" на чатырох нітах. Для атрымання малюнку ў клетку снавалі аснову з нітак рознага колеру і ўжывалі рознакаляровы ўток. У колеравай гаме посцілак пераважаў чырвоны колер, які спалучаўся з чорным, сінім або ліловым, зялёным. Вялікія клеткі дапаўняліся тонкімі жоўтымі прасноўкамі (мал. 1020, 1021, 1022).

Да 1970-х гг. ткалі чатырох- і васьмінітовыя посцілкі. У гэты час народнае ткацтва робіцца паліхромным. Вясковым ткачыхам сталі даступны катушачныя ніткі для асновы і ніткі рознага колеру для ўтку: мулінэ, воўна, а таксама фарбавальнікі для пражы ўласнага вырабу. Куплёныя ніткі ўжывалі ў асноўным у якасці дадатку і колеравага акцэнту да самапрадзеных нітак.



Мал. 1020. Браніслава Точка, 1922 г.н., з тканымі посцілкамі (в. Хлупін, Жыткавіцкі раён). 2009 г.



Мал. 1021. Посцілка. Фрагмент. 1940-я гг. Воўна, чатырохнітовае ткацтва "ў рады", "у касічку" (в. Цешкаў, Нараўлянскі раён)



Мал. 1022. Посцілка. Фрагмент. 1940-я гг. Воўна, чатырохнітовае ткацтва "ёлачка" (в. Цешкаў, Нараўлянскі раён)

Вытанчаным спалучэннем блакітнага, светла-зялёнага з цёмна-карычневым, сінім, чырвоным, аранжавым колерам вылучаюцца посцілкі Петрыкаўскага раёна. Больш яскравая колеравая гама характэрна для посцілак Жыткавіцкага, Лельчыцкага раёнаў. У Калінкавіцкім раёне чатырохнітовыя посцілкі з рознакаляровымі палосамі атрымалі назву "перасяканкі". Рады ўзорных элементаў ткалі ў тры-чатыры колеры, што стварае ўражанне паліхромнасці (мал. 1023, 1024).

У 1960–1980-я гг. пашырыўся пералік матэрыялаў, якія ішлі на выраб посцілак. Замест ільну для асновы пачалі выкарыстоўваць крамныя катушачныя баваўняныя ніткі чорнага і белага колеру. Існавалі і іншыя крыніцы набыцця пражы і нітак. Баваўняные ніткі на вялікіх бабінах для ткання куплялі на базары ў г. Рэчыца. Па вёсках развозілі сінтэтычныя бліскучыя ніткі, якія выраблялі на хімзаводзе ў г. Светлагорску. У гэты час замест воўны пачалі ткаць сінтэтычнымі ніткамі: капронам, нітронам, акрылам.

Двухбаковы перабор на Гомельшчыне носіць назвы "пераборы на дошкі", "на дошчачкі", "у шнуры", "на ніткі", "пад пруткі". Посцілкі-"перабіранкі", выробленыя ў гэтай тэхніцы, пераважна паўтараюць узоры фабрычных посцілак. Шмат агульнага яны маюць з падобнымі посцілкамі Гродзенскай і Мінскай абласцей (мал. 1025, 1026, 1027) .

Большай разнастайнасцю, арыгінальнасцю кампазіцый і колеравага вырашэння вылучаюцца посцілкі, якія вытканы ў тэхніцы аднабаковага перабору. Аднабаковы перабор выконваецца на запраўцы ў тры ніта і дазваляе адвольна размяшчаць на правым баку ўзорны ўток. Посцілкі, выробленыя ў гэтай тэхніцы, у розных мясцовасцях носяць розныя назвы: "закладанка", "перабіранка", "падкладанка", "перакладанка", "падложанка" (Калінкавіц-



Мал. 1023. Посцілка. 1970-я гг. Бавоўна, штучны шоўк, чатырохнітовае ткацтва "ў кругі". Яўгенія Лук'яновіч, 1929 г.н. (в. Забалацце, Акцябрскі раён)



Мал. 1024. Посцілка. 1970-я гг. Бавоўна (падчэрнена дубовай карой і праварана ў шалупінні цыбулі), чатырохнітовае ткацтва "на палачку" і "на калёсах". Анастасія Юрчак, 1932 г.н. (в. Валосавічы, Акцябрскі раён)

кі раён), "выкладанцы" (Лельчыцкі раён), "набіраная", "накладаная". Ткачыхі казалі пра гэтую тэхніку ткацтва: "Закладанне – як хочаш, так і закладай" (в. Залессе, Чачэрскі раён). У Петрыкаўскім раёне некаторыя ткачыхі ткалі пераборныя посцілкі адваротным бокам да сябе, каб не пакідаць на вонкавым баку разваротныя петлі.



Мал. 1025. Посцілка-"перабіранка". 1960-я гг. Лён, бавоўна, двухбаковы перабор (п. Пабедны, Лельчыцкі раён)



Мал. 1026. Посцілка. Фрагмент. 1960-я гг. Лён, воўна, двухбаковы перабор. Святлана Лугоўская, 1937 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)



Мал. 1027. Посцілка. Фрагмент. 1960-я гг. Лён, воўна, двухбаковы перабор. Ганна Фядосік, 1914 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)

Для аднабаковых посцілак Гомельшчыны характэрны сеткавыя кампазіцыі двух відаў: дыяганальныя сеткі і шасціграннья соты. Сеткі шчыльна запоўнены кветкавымі разеткамі, ромбамі, васьміканцовымі зоркамі. Шчыльнасць і разнаколернае вырашэнне ўзорных элементаў стварае ўражанне мазаічнасці (мал. 1028, 1029, 1030, 1031). Часам фон посцілкі вакол фігур у межах ячэйкі сеткі цалкам перакрыты ўзорным утком, што надае большую колеравую насычанасць і дэкаратыўнасць. Асобную групу складаюць посцілкі з дывановымі цэнтрычнымі кампазіцыямі (мал. 1032).

Узоры для пераборных посцілак майстрыхі запазычвалі з разнастайных крыніц, у тым ліку з часопіса "Крестьянка". Паўтаралі ў пераборы нават ты-



Мал. 1028. Посцілка. Фрагмент. 1970-я гг. Лён, бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Вера Басарава, 1936 г.н. (в. Беразнякі, Жыткавіцкі раён)



Мал. 1029. Посцілка-"закладанка". Фрагмент. 1970-я гг. Лён, бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Святлана Лугоўская, 1937 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)



Мал. 1030. Посцілка-“закладанка”. Фрагмент. 1970-я гг. Лён, бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Святлана Лугоўская, 1937 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)



Мал. 1031. Посцілка-“закладанка”. Фрагмент. 1970-я гг. Лён, бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Святлана Лугоўская, 1937 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)



Мал. 1032. Посцілка-“закладанка”. 1970-я гг. Лён, бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Варвара Бурма, 1936 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён)



Мал. 1033. Дыванок з пеўнямі. Бавоўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Алена Кісель, 1920 г.н. (в. Здудзічы, Светлагорскі раён). Музей гісторыі г. Светлагорска



Мал. 1034. Дыван. 1980-я гг. Бавоўна, воўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Алена Баннік, 1929 г.н. (в. Шчадрын, Жлобінскі раён)



Мал. 1035. Пакой з тканымі дыванамі. 1980-я гг. Бавоўна, воўна, мулінэ, аднабаковы перабор. Алена Баннік, 1929 г.н. (в. Шчадрын, Жлобінскі раён)

повыя чатырохнітовыя арнаменты. Новыя кампазіцыі пераборных посцілак стваралі самыя здольныя ткачыхі. Цікавы прыклад у сярэдзіне 1980-х гг. быў зафіксаваны ў в. Міхедавічы Петрыкаўскага раёна. Узоры пераборных посцілак разыходзіліся адсюль па ўсёй акрузе ад мужа і жонкі Глушко. Адам Аляксандравіч, 1928 г.н., складаў для посцілак схемы кампазіцый, маляваў узоры. Ён выкарыстоўваў самыя розныя крыніцы: традыцыйныя нітовыя тканіны, фабрычны тэкстыль, вышыўкі, гардзіны, малюнкі з кніг, часопісаў і інш. Гатовыя кампазіцыі ён прамалёўваў на паперы або цыраце ў натуральную велічыню, а яго жонка Марыя Пятроўна, 1923 г.н., ткала па гэтых эскізах дываны.

Пераборнае ткацтва з яго магчымасцямі адвольнага закладання ўзорнага ўтку і ўжывання нітак розных колераў для найбольш здольных ткачых стала творчым заняткам. Яны самастойна складалі кампазіцыі сваіх посцілак і ператваралі іх у сапраўдныя дываны і тэкстыльныя карціны. Алену Кісель, 1920 г.н., з в. Здудзічы Светлагорскага раёна, напрыклад, аднавяскоўцы называюць “прамудрыцы” за яе здольнасць складаць і ткаць самыя розныя ўзоры. На дыванах і дыванках майстрыхі можна бачыць птушак, пеўняў, кветкі (мал. 1033). Алена Баннік, 1929 г.н., з в. Неглюбка Веткаўскага раёна, што жыве ў в. Шчадрын Жлобінскага раёна, тчэ дываны, дзе злучае раслінныя ўзоры з сюжэтнымі выявамі прыгажунь, райскіх паў, якія пераводзіць у ткацтва з вышыўкі (мал. 1034, 1035). Для дасягнення большай жывапіснасці ткачыха перакрывае ўзорным утком усю паверхню вырабу. Пеўняў, катоў, папугаяў, вазы і кошыкі з кветкамі і садавінай ткала на сваіх дыванах Марыя Алейнік, 1915 г.н., з в. Харомцы Акцябрскага раёна.

З 1970-х гг. аднабаковыя паліхромныя посцілкі займаюць асноўнае месца ў інтэр’еры сельскага дома. Імі засцілаюць ложкі, як дываны развешваюць па сценах. Буйная паліхромія посцілак і дываноў, узмоцненая ўжываннем акрылавых нітак, расквеціла ў гэты час сціплую прастору вясковага жылога інтэр’ера (мал. 1036).



Мал. 1036. Ткачыха Таццяна Века, 1928 г.н., з посцілкамі-"падлажанкамі" сваёй работы (в. Слабада, Лельчыцкі раён). 2003 г.

## ВЫШЫЎКА

У традыцыйным тэкстылі Гомельшчыны налічваецца вялікая разнастайнасць вышывальных тэхнік. Вышыўка шырока ўжывалася для аздаблення прадметаў адзення: сарочак, фартухоў, намітак, галаўных павязак, чапцоў. Характэрнай рысай народных тканін Падняпроўя з'яўляецца спалучэнне ў адным вырабе вышыванай і тканай арнаментацыі.

Захаваліся ўзоры вышыўкі, якой у XIX ст. на Тураўшчыне ўпрыгожвалі жаночыя галаўныя ўборы – "галава". У склад галаўнога ўбору акрамя цвёрдага каркаса –"пухоўкі", наміткі ці сярпанкі ўваходзілі вышываны чапец і налобная павязка. Яны былі аздоблены вышыўкай лікавай гладдзю шарсцянымі ніткамі – "гарусам" чырвонага, зялёнага, фіялетавага, аранжавага, блакітнага і чорнага колераў з дадаткам залацістай мішуры (мал. 1037). Вышыўка размяшчалася ззаду чапца і паверх была прыкрыта рэдкай паўпразрыстай тканінай наміткі ці сярпанкі. На чапцах вышываліся кветкавыя матывы ў выглядзе 12-пялёсткавых разетак, зорак, птушак, двухгаловых арлоў; на налобных павязках – ромбы з зорачкамі[1]. Аб характары старадаўніх узо-

[1] Гл.: *Винникова М.Н.* О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ) // Культурное наследие народов Европы. СПб., 2011. С. 93–110 (Сборник МАЭ. Т. 57).



Мал. 1037. Галаўны ўбор ("пухоўка" з чапцом). XIX ст. Лён, каленкор, гарус, мішура, вышыўка гладдзю і "ў прыкрэп" (Тураўшчына). Музей антрапалогіі і этнаграфіі (Кунсткамера) імя Пятра Вялікага Інстытута антрапалогіі і этнаграфіі РАН, № 415 – 7 а

раў вышыўкі можна меркаваць па ўзору пояса-"галёны", што ў XIX ст. уваходзіў у склад строю мяшчанак Турава (мал. 1038). Даўняя налобная павязка з галаўнога ўбору з вышыўкай, якая мае досыць архаічны ўзор у выглядзе аленяў і зорак, выкананы чырвоным гарусам і залацістай мішурой у тэхніцы "ў прыкрэп", была ўжыта ў якасці падкладкі на адваротным баку пояса. Гэтыя музейныя экспанаты сведчаць аб існаванні ў XVII–XIX стст. на гістарычных землях Тураўшчыны (Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці, Столінскі раён Брэсцкай вобласці) у асяроддзі мяшчан Турава і Давыд-Гарадка і сялян навакольных вёсак своеасаблівай вышывальнай традыцыі, адметнай наборам салярных, кветкавых і іншых арнаментальных матываў, іх рознакаляровым вырашэннем з ужываннем нітак, што паступалі сюды з тэрыторыі Украіны[1].



Мал. 1038. Пояс-"галёна" (адваротны бок). XIX ст. Лён, воўна, вышыўка, залотная нітка. Тураўскі краязнаўчы музей, кп 1040 пр 31

[1] Аб тым, што рознакаляровыя гарусныя ніткі паступалі з тэрыторыі Украіны, дазваляюць меркаваць экспанаты з Ровенскай і Жытомірскай абласцей, якія захоўваюцца ў Музеі этнаграфіі і народных промыслаў НАН Украіны ў Львове.



Мал. 1039. Галаўны ўбор (чапец і намітка). XIX ст. Лён, шарсцяная тканіна, вышыўка лікавай гладдзю і крыжыкам (Гомельскі павет Магілёўскай губерні). Музей антрапалогіі і этнаграфіі (Кунсткамера) імя Пятра Вялікага Інстытута антрапалогіі і этнаграфіі РАН, № 415 – 14 а, в

У XIX – пачатку XX ст. характэрныя лакальныя асаблівасці вышыўкі лікавай двухбаковой гладдзю існавалі на тэрыторыі сучасных Добрушскага і Гомельскага раёнаў і суседніх раёнаў Чарнігаўскай і Сумскай абласцей Украіны. Вышыўка мае адметны арнамент у выглядзе ромбаў, кружкоў, якія выконваліся чырвонымі, чырвонымі і блакітнымі або толькі белымі ніткамі. Вышыўцы двухбаковай лікавай гладдзю ўласцівы рэльефнасць і шчыльнасць. Яна спалучалася з элементамі, вышытымі ў тэхніцы "роспіс" і крыжыкам. Лікавая двухбаковая гладзь ужывалася для аздаблення жаночых сарочак і галаўных павязак-"апаясак". Узоры такіх вышываных вырабаў прадстаўлены ў беларускіх зборах Музея антрапалогіі і этнаграфіі (Кунсткамера) (мал. 1039) і Расійскім этнаграфічным музеі ў Санкт-Пецярбургу[1]. Галаўныя павязкі-"апаяскі" насілі дзяўчаты-нявесты. Маладыя жанчыны першага года замужжа павязвалі "апаяскі" на чапец так, каб канцы спускаліся на спіне або па баках. Двухбаковай гладдзю "былым па беламу" вышывалі жаночыя сарочкі ў Добрушскім і Веткаўскім раёнах (мал. 1040, 1041).

Тэхніку лікавай гладдзі выкарыстоўвалі для вышыўкі манішак мужчынскіх сарочак (мал. 1042), а таксама ручнікоў асаблівага тыпу, якія сустракаюцца ў вёсках Мадора і Кісцяні Рагачоўскага раёна, а таксама ў суседнім Кармянскім раёне. Ручнікі вышыты лікавай гладдзю і крыжыкам і адметныя манументальнасцю дэкору, узбуйненым арнаментам, у якім дамінуе васьміканцовая зорка. Вышыўка выканана на намітках, што ў пачатку XX ст. ужо не ўжываліся па прызначэнні – у якасці жаночых галаўных убораў (мал. 1043). Тонкае, добра выбеленае льняное палатно вялікіх памераў (шырыня 45–50 см, даўжыня 280–330 см) перараблялі з дапамогай вышыўкі ў ручнікі-"набожнікі". Аб папярэднім прызначэнні тканіны сведчыць наяўнасць на канцах некалькіх вузенькіх – да 1 см шырынёй – тканых чырвоных палосак.

[1] Расійскі этнаграфічны музей, кал. 8762 – 12 110, 12 115–12 118.



Мал. 1040. Жаночая сарочка. Фрагмент. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, лікавая гладзь, крыж, злучальнае шво (в. Васільеўка, Добрушскі раён). Музей старажытнабеларускай культуры ІІЭФ ЦБКМЛ НАН Беларусі



Мал. 1041. Жаночая сарочка. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, вышыўка лікавай гладдзю, злучальнае шво (в. Неглюбка, Веткаўскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 16414/1

Вышыўка наборам на Гомельшчыне сустракаецца не вельмі часта і саступае месца арнаментацыі традыцыйных тканін браным ткацтвам. Яе можна бачыць на самых даўніх узорах адзення XIX ст., якія захоўваюцца ў Расійскім музеі этнаграфіі. У Добрушскім раёне вышыўка наборам дробнаўзорчатая, чырвоныя ніткі суцэльна запаўняюць фон, на якім тонкім графічным узорам чытаецца абрыс ромбаў, ромбаў з крыжамі і парасткамі – "крюкі"[1] (мал. 1044).

Адметнасцю народнага тэкстылю Гомельшчыны з'яўляецца ўжыванне тэхнік і прыёмаў вышыўкі, якія не сустракаюцца ў іншых рэгіёнах Беларусі. Толькі ў Гомельскім, Добрушскім, Буда-Кашалёўскім раёнах рабілі арнаментальную вышыўку па зборках у версе рукава, на манжэтах, стойцы каўняра. Першапачаткова збіралі тканіну ў дробную зборку, а потым па ёй вышывалі рамбічны арнамент з дапамогай швоў "уперад іголкай", наборам, бісерным швом. Вышыўка выконвалася не толькі чырвонымі, але і чорнымі ніткамі (мал. 1045, 1046). У дадзеным выпадку семантыку чорнага колеру вызначыць цяжка, але трэба адзначыць, што ў Буда-Кашалёўскім раёне чор-

[1] Расійскі этнаграфічны музей, кал. 8762 – 12 414, 12 415.



Мал. 1042. Манішка мужчынскай сарочкі. 1920-я гг. Бавоўна, лікавая гладзь. Вышывала Алена Галоўка (1904–1990), калі ішла замуж (в. Залатуха, Калінкавіцкі раён)



Мал. 1043. Ручнік. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка лікавай гладдзю, крыжыкам. 276 × 50 см (Рагачоўскі раён). Нацыянальны гістарычны музей Беларусі, кп 40966/112



Мал. 1044. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, вышыўка наборам. Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, кп 2730 р – 411



Мал. 1045. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, вышыўка бісерным швом па зборках (п. Адчаяны, Буда-Кашалёўскі раён). Нацыянальны гістарычны музей Беларусі, кп 40966/177. Фота Г.Л. Ліхтаровіча



Мал. 1046. Сарочка жаночая. Фрагмент. Канец XIX ст. Лён, бавоўна, злучальнае шво, вышыўка па зборках і крыжыкам (Буда-Кашалёўскі раён)

ны арнамент сустракаецца і на ручніках.

Для аздаблення традыцыйнага адзення прыдняпроўскіх раёнаў характэрна ўжыванне дэкаратыўных злучальных швоў з разнастайнай арнаментыкай. Па выглядзе яны нагадваюць прошвы, а па ажурнай структуры – мярэжкі. У жаночых сарочках Неглюбскага, Чачэрскага, Добрушскага, Калінкавіцкага раёнаў такія швы размешчаны паміж палікам і верхам рукава, ззаду – паміж станінай і палікам, у задняй частцы рукава – паміж узорнай часткай верху і зарукаўя, па прыполе – паміж полкамі станіны, паміж дзвюма ці трыма полкамі фартуха (мал. 1047, 1048, 1049). У Калінкавіцкім і Акцябрскім раёнах яны прысутнічаюць і на жаночых, і на мужчынскіх сарочках (мал. 1050, 1051). Такія швы і тэхніку іх выканання называюць “рошва”, “рошэўка”, “расшыўка”, “расшыўка лапкамі”, “расшыўка капейкамі”, “капейкі”, “раскапей”, “раскапеячкі”, “раскапейчыванне”, “расшыванне”, “размярэжка”, “размярэжванне”. Калі пра вышыўку наборам ці крыжыкам кажуць “нашываць”, дык пра выкананне злучальных швоў прынята гаворыць “расшываць”.

Гэтыя швы па сваім паходжанні з’яўляюцца найбольш старажытнымі. Яны выконваюць функцыю злучэння асобных частак палатна ў адзінае цэлае і ўпрыгожваюць адзенне. Існуе шмат розных відаў такіх швоў і спосабаў іх выканання[1]. Дэкаратыўным багаццем вылучаюцца вузельчыкава-штопальныя злучальныя швы, якія аздабляюць традыцыйнае адзенне Ка-

[1] Гл.: *Лобачевская О.А.* Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З.И. Зимина. Мінск, 2009. С. 112–141.



Мал. 1047. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво (в. Боруск, Калінкавіцкі раён). Калінкавіцкі дзяржаўны краязнаўчы музей, кп 280 в 131



Мал. 1048. Сарочка. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво (в. Насовічы, Добрушскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 14528



Мал. 1049. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво. Захоўваецца ў СДК в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна



Мал. 1050. Сарочка жаночая. Фрагмент прыполу. Пачатак XX ст. Лён, бранае ткацтва, злучальнае шво, вышыўка лікавай гладдзю, крыжыкам, мярэжка (в. Палессе, Светлагорскі раён)



Мал. 1051. Сарочка мужчынская. Фрагмент прыполу. Лён, бранае ткацтва, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво (Калінкавіцкі раён). Калінкавіцкі дзяржаўны краязнаўчы музей, кп 295 в 146

лінкавіцкага і Рагачоўскага раёнаў, і багата арнаментаваныя злучальныя швы насцілам на сарочках в. Неглюбка Веткаўскага раёна (мал. 1052, 1053).

Жаночыя сарочкі Жыткавіцкага, Лельчыцкага раёнаў і суседняй Століншчыны адметныя аздабленнем прыполаў ажурнымі расшыўкамі і мярэжкамі, якія выконваліся па пракладзеных паміж полкамі ніцях асновы. Як і ў неглюбскім строі, на Тураўшчыне аздобленыя браным ці закладным узорам, нашываннем і расшыўкамі прыполы сарочак прынята было дэманстраваць з-пад панёвы ці андарака. У дзявочых і вясельных сарочках прыгажосць і якасць выканання аздаблення прыполаў сведчыла аб рукадзельных здольнасцях іх ствральніцы, таму асаблівую ролю яны адыгрывалі ў вясельнай абраднасці (мал. 1054, 1055).



Мал. 1052. Сарочка мужчынская. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка, мярэжка, злучальнае шво (Калінкавіцкі раён). Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, нв 4432/1



Мал. 1053. Сарочка жаночая. Фрагмент рукава. Пачатак XX ст. Лён, бавоўна, лікавая гладзь, злучальнае шво (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)



Мал. 1054. Сарочка жаночая. Фрагмент. Лён, расшыўка "саколкі" (г. Тураў, Жыткавіцкі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 14981/1



Мал. 1055. Сарочка жаночая. Фрагмент. 1930-я гг. Лён, вышыўка, закладное ткацтва, злучальнае шво (в. Луткі, Столінскі раён, Брэсцкая вобл.). Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, кп 5283 р – 1796

Вышыўка крыжыкам распаўсюджана па ўсёй Гомельшчыне і прадстаўлена рознымі мастацка-стылістычнымі варыянтамі, якія характэрны для пэўных лакальных тэрыторый. Гэтую тэхніку ў адпаведнасці з асаблівасцямі яе выканання па ліку нітак называлі "чысленка" (Калінкавіцкі раён), "чысленкай нашыта" (Чачэрскі раён). Вышыўка крыжыкам на прадметах адзення ў рэгіёне вылучаецца шчыльнасцю запаўнення вышываных бардзюраў арнаментам і дробным памерам крыжыка (на дзве ніткі). Гэта сведчыць аб тым, што іх вышывалі па ранейшых узорах вышыўкі наборам, пераводзілі старадаўнія арнаменты ў больш зручную і прадуктыўную ў выкананні тэхніку. Можна меркаваць, што Падняпроўе раней, чым іншыя рэгіёны Беларусі, успрыняло ў канцы XIX ст. гэтую вышывальную тэхніку. Дывановае запаў-



Мал. 1056. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво (в. Насовічы, Добрушскі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 14528/6



Мал. 1057. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам, злучальнае шво. Захоўваецца ў СДК в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна



Мал. 1058. Сорочка жаночая на гестцы. 1940-я гг. Паркаль, вышыўка крыжыкам. Ніна Церашковіч, 1930 г. (в. Беразнякі, Жыткавіцкі раён)



Мал. 1059. Манішка мужчынскай сарочкі. 1940-я гг. Паркаль, вышыўка крыжыкам (в. Мілевічы, Жыткавіцкі раён)

ненне вышытых крыжыкам бардзюраў характэрна для сарочак Добрушскага і Калінкавіцкага раёнаў (мал. 1056, 1057). Выразную мастацкую з'яву ўяўляе арнаментальны дэкор сарочак калінкавіцкага строю. Узоры крыжыкам на рукавах захавалі папярэднюю традыцыю зубчастага завяршэння бардзюраў у ніжняй частцы рукава. Сеткавым характарам вырашэння кампазіцыі вышыўкі і выявамі разетак адметныя сарочкі чачэрскага строю.

Пазнейшыя, так званыя "бракараўскія", узоры вышыўкі крыжыкам у пачатку XX ст. шырока ўжываліся ў строях Петрыкаўскага, Лоеўскага, Мазырскага раёнаў. Узбуйненасць бракараўскіх раслінных матываў характэрна для народных строяў першай паловы XX ст. Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў (мал. 1058, 1059, 1060, 1061, 1062, 1063). Узоры, запазычаныя з друкаваных крыніц, пануюць на ручніках і дэкаратыўных тканінах для інтэр'еру: падзорах, навалачках, сурвэтках. Іх вышываннем захапляліся нават там, дзе доўгі час былі моцныя мясцовыя традыцыі ткацтва і вышыўкі з уласцівым ім арнаментальным комплексам (як, напрыклад, у Веткаўскім раёне для вышыўкі накутнікаў і ручнікоў).

У пасляваенныя гады жанчыны ў вёсках Кармянскага раёна вышывалі крыжыкам у вышывальнай арцелі г. Карма. Пераважна гэтым займаліся дзяўчаты і маладыя жанчыны. Вышывалі крыжыкам мужчынскія сарочкі, манішкі, каўняры, настольнікі, што давала дадатковы заробак: "Ай, яй! Дажа знаеце, як працавалі? Пайду сена грэбсці, сена грэбсці пойдзем, тады паварочваюць, сядуць нашываць, а ў мяне во дзе прывязаны каўнер, а я сяджу – ды скарэй нашываю. Не было адкуль капейкі ўзяць, во так работалі. Зараблялі грошы" (Анастасія Захарэнка, 1930 г.н., Таісія Бурдоленка, 1930 г.н., в. Акцяброва, Кармянскі раён. Зап. 2003 г.). Вышыванне ў арцелі прыва-



Мал. 1060. Фартух. Пачатак XX ст. Паркаль, вышыўка крыжыкам (в. Пагост, Жыткавіцкі раён). Тураўскі краязнаўчы музей, кп 1679 пр 219



Мал. 1061. Фартух. Пачатак XX ст. Паркаль, вышыўка крыжыкам (в. Рычоў, Жыткавіцкі раён). Тураўскі краязнаўчы музей, кп 1679 пр 213

блівала жанчын тым, што давала магчымасць сэканоміць на нітках, каб было чым вышываць для сябе: "После вайны аткрылі вышывальны цэх у Карме. Рубашкі нашывалі, бо рубашкі этыя паркалёвыя, тоненькія. Тожа ж у камінку нашывалі. Бярэш рубашку эту за заблаццю, што, ага, круцялёк за тры нітачкі, каб жа болей далі сарочак бярэш. Каб далі штук пяць-шэсць нашываць этых і ніткі, каб ужо асталося хоць нітак ужо. Забалаць эта называецца, тады ўжо нашываем сабе. Аканомілі. Яны загадваюць там па тры ніткі нашываць на рубашку, а мы ўжо дзелаем тады па дзве, тады ўжо нітачка астаецца. А тады ўжо разгледзілі, што неправільна дзелаюць. Штрафавалі, тады ўжо плату меншую давалі за рубашкі, і тады ўжо прыказ – не даваць гэтым, што ніткі... Ну, стараліся, каб ня ўціснуць іх крэпка, еслі ўціснеш – больш відна, а еслі ўжо слабей пускаеш, тады яно ўжо заглажаецца, эта ўжо белае. ...І мы ўсе бралі эту забалаць, і не дай бог, як красіва было!" (Хрысціна Бурдоленка, 1930 г.н., в. Акцяброва, Кармянскі раён. Зап. 2003 г.).




Мал. 1062. Сарочка жаночая. Фрагмент. Пачатак XX ст. Паркаль, вышыўка крыжыкам (г. Тураў, Жыткавіцкі раён). ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", кп 14981/1

У пасляваенныя гады ў вёску прыйшла мода на вышыванне крыжыкам па канве па друкаваных узорах. Так рабілі "рамкі" ці "карцінкі". Сваю назву вышыўкі атрымалі таму, што іх змяшчалі пад шкло ў рамкі і яны служылі аздабленнем сялянскага інтэр'ера. Захапленню такім вышываннем садзейнічала з'яўленне ў продажы рознакаля-



Мал. 1063. Сарочка на гестцы. 1940-я гг. Паркаль, бавоўна, вышыўка крыжыкам (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён)

ровых нітак мулінэ кітайскай і айчыннай вытворчасці. Асабліва захапляліся вышыўкай карцінак жанчыны ў вёсках Лельчыцкага і Жыткавіцкага раёнаў. І сёння ў вясковых дамах можна ўбачыць такія вышыўкі на разнастайныя сюжэты: прыгажуні, пары закаханых, пастаральныя сцэнкі і інш. Найбольш таленавітыя жанчыны самі складалі кампазіцыі вышывак і выкарыстоўвалі для гэтага розныя крыніцы.

У 1960–1970-я гг. на вёску прыйшла новая хваля вышывальнай моды — вышыўка адвольнай каляровай гладдзю. Вышыўка выконваецца па папярэднім контуры і мае вялікія выяўленчыя магчымасці. Гэтая вышывальная тэхніка канчаткова выцесніла з народнай культуры традыцыі геаметрычнага арнаменту і бела-чырвоную гаму спалучэння колераў: “Сталі крыжыкам



Мал. 1064. Сарочка на гестцы. 1960-я гг. Паркаль, акрыл, вышыўка гладдзю (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён)



Мал. 1065. Сарочка на гестцы. 1960-я гг. Паркаль, акрыл, вышыўка гладдзю (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён)

вышываць, а потым гладзь, вядомая, як гаворац, красівей за крыжыка" (Соф'я Яфрэменка, 1941 г.н., в. Шырокае, Чачэрскі раён. Зап. 2003 г.)

Паліхромная вышыўка гладдзю зрабілася асноўнай у аздабленні сарочак, фартухоў, хустак там, дзе яшчэ стваралі і насілі самаробныя строі адпаведна мясцовым традыцыям. У Жыткавіцкімі і Лельчыцкім раёнах у гэты час сфарміраваўся нават сучасны варыянт турава-мазырскага строю, які выконваўся з куплёных тканін і яскрава аздабляўся паліхромнай вышыўкай (мал. 1064, 1065).



Мал. 1066. Падузорнік. 1990-я гг. Паркаль, вышыўка гладдзю. Ева Цалко, 1951 г.н. (в. Жмурнае, Лельчыцкі раён)

Паўсюдна да 1990-х гг. вышывалі разнастайныя прадметы для інтэр'ера: посцілкі, падузорнікі, навалачкі, накідкі на падушкі, абрусы, гардзіны, сурвэткі. Для вышыўкі ўжывалі баваўняную крамную тканіну белага колеру: на яе лёгка пераносіць малюнкі з іншых вышываных прадметаў. Жанчыны складалі кампазіцыі з розных крыніц, малявалі іх уласнаручна (мал. 1066, 1067, 1068). Арнамент гладзевых вышывак выключна раслінны, кветкавы. Інтэр'ер вясковага дома, убраны паліхромнымі вышыўкамі, стварае ўражанне райскага саду. Ён мае святочны характар, не прызначаны для паўсядзённага пражывання, і з'яўляецца яркім адлюстраваннем тых перамен, якія адбыліся ў светаадчуванні сучаснага селяніна і развіцці традыцый народнай мастацкай творчасці. Пашырэнню моды на вышыванне гладдзю садзейнічала з'яўленне сінтэтычных акрылавых нітак, якія маюць шырокую гаму яскравых колераў і ў адрозненне ад іншых вышывальных матэрыялаў пры пранні не пускаюць фарбу.

Як распавядаюць жанчыны, вышыванне ў 1970—1980-я гг. мела характар эпідэміі. Ім захапляліся амаль ўсе жанчыны ў вёсцы, якія вышывалі ў кожную вольную хвіліну: “Маладыя не хочуць нашываць такія, а мы ж нашывалі. Мы ж не лянуемся, мы і зара ўшываем, не бачым, но ўшываем. Я яшчэ эту зіму ўшывала. Ушывала і ўціральнікі красівыя, і ўсё. Дванаццаць часоў, а я – шчэ чуць нашыю, шчэ чуць. І да двух бывае сяджу ночы. І то ж усё ахота была, а цяпер жа гэтае ахоты німа. Ну, ужэ цяпер іначша жызнь пашла. А нам жа не было іначшай жызні. Ох, а ткалі, а тымі клубочкамі! Божа, Божа! К лампе – цемната, але рабілі ўсё. Ахота, ахота ў людзей была. А цяпер німа тае ахоты” (Вера Прыходзька, 1932 г.н., в. Слабада, Лельчыцкі раён. Зап. 2005 г.).



Мал. 1067. Інтэр'ер з вышыўкамі. Надзея Буцэнка, 1946 г.н. “Мы жывём на вышыванні” (в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2005 г.



Мал. 1068. Вышыўкі Марыі Багдановіч, 1954 г.н. (в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі раён). 2005 г.

## РЫТУАЛЬНЫЯ ТКАНІНЫ. АБЫДЗЁННЫ І АБРОЧНЫ РЫТУАЛЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Тэксты пра выкананне абыдзённага рытуалу і абраканне тканінамі, якія запісаны на Гомельшчыне, сведчаць аб захаванні ў традыцыйнай абрадавай культуры рэгіёна вельмі архаічнага пласта рытуальных практык. Калектыўны выраб жанчынамі тканіны ў рытуальна абмежаваны час – на працягу адной ночы або аднаго дня, з паслядоўным выкананнем усіх тэхналагічных аперацый – ад прадзення нітак да ткання на кроснах, практыкаваўся ў тых выпадках, калі існавала небяспека для ўсёй сялянскай грамады. Абыдзённікі рабілі пры працяглай адсутнасці дажджу, эпідэміі, падзяжы хатняй жывёлы, у вайну. Зрэдку рытуальную тканіну выконвалі, калі здаралася няшчасце ў сям'і – хвароба, смерць дзяцей.

В 1930-я гг. абрад з выкарыстаннем рытуальнай тканіны – "завескі" на Юр'я ў в. Галубіца Петрыкаўскага раёна быў апісаны этнографам А.Я. Дуйсбург[1]. Цераз тканіну праганялі статак кароў, калі першы раз адпраўлялі яго на пашу. Вытканую па аброку "завеску" ахвяравалі ў царкву.

Рытуальнае прадзенне і тканне, якое выконвалі жанчыны, суправаджалася вырабам і ўсталяваннем драўляных крыжоў, за што былі адказныя

[1] *Дуйсбург А.Я.* Обряды и обычаи в ткацком производстве. Рукопись. 1940 г. // Навуковы архіў Расійскага этнаграфічнага музея (НА РЭМ), ф. 2, воп. 2, спр. 160, арк. 13.

мужчыны. Заключная частка рытуалу – абход вёскі з вырабленым палатном і прагон цераз яго хатняй жывёлы – выконвала ачышчальную функцыю, а ахвяраванне палатна ў царкву або размяшчэнне на крыжы надавала рытуальнаму прадмету значэнне медыятара, які павінен быў спрыяць усталяванню кантактаў чалавека з найвышэйшымі сіламі (мал. 1069, 1070).

Для вызначэння тканін, якія выраблялі падчас абыдзённага рытуалу, на Гомельшчыне ўжывалі розныя назвы: “абдзённік”, “абудзёнаўка”, “абудзённік”, “абыдзённае палатно”, “будзённік”, “дзённік”, “дняўнік”, “аброчнік”, “аброк” “аброчны ручнік”, “ручнік”, “намітка”, “завеска”, “завіска”, “стамесачка”, “браднік”. Пра выраб рытуальнай тканіны каза-



Мал. 1069. Аброчны крыж у канцы в. Перароў Жыткавіцкага раёна. 2009 г.



Мал. 1070. Аброчныя крыжы, якія ў 1930-я гг. перанеслі на могілкі з вёскі (в. Рычоў, Жыткавіцкі раён). 2007 г.


Мал. 1071. Аброчны крыж на могілках. Да 1957 г. знаходзіўся на рагу вуліц у в. Ляскавічы Акцябрскага раёна. 2007 г.

лі: “аб дзень наткалі”, “адным днём рабілі”. Калектыўны збор жанчын для выкапання гэтай працы называлі “талака”: “Абракнуліся людзі зделать талаку, будзённік выткалі” (в. Рудня Насімкавіцкая, Чачэрскі раён).

Абыдзённы рытуал на Гомельшчыне захаваў шмат архаічных рысаў. У запісаных намі аповедах прасочваецца полаўзроставая размеркаванасць рытуальных дзеянняў па вырабе рытуальнай тканіны: пралі ніткі дзеці і падлеткі, у якіх “яшчэ на рубашцы не было”; ткалі старыя жанчыны, удовы; неслі да крыжа і абносілі вакол вёскі дзяўчынкі, якія не дасягнулі палавой спеласці. У некаторых вёсках прынята было пачынаць рытуал са збору прадзіва, дзеля чаго рабілі абход хат.

Каштоўная для разумення семантыкі рытуалу інфармацыя запісаная ў в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна. Яна тычыцца месца вырабу абыдзённага ручніка ў засуху – “калі дажджу не было”: “На варотах выткалі... Трэба на вуліцэ выткаць, так і ткалі” (зап. 2003 г.). Такая стратэгія рытуальных паводзін – адно з відавочных сведчанняў глыбокай архаічнасці абыдзённага рытуалу. Часткі ткацкага стану прымацоўвалі на варотах. У канцэптах традыцыйнай карціны свету вароты маркіруюць мяжу паміж прасторай засвоенай, культурнай і незасвоенай, стыхійнай. Вароты – гэта мяжа паміж “сваёй” і “чужой” прасторай, мяжа двара, дома – тэрыторыі, засвоенай адной сям’ёй, родам як групай кроўных сваякоў. Як вядома, яшчэ ў пачатку XX ст. на Беларускім Палессі не было рэдкасцю, калі вялікая патрыярхальная сям’я жыла ў адной хаце. Ёсць звесткі, што абыдзённік ткалі таксама на двары ля парога хаты, на вуліцы, на скрыжаванні.

Абыдзённую тканіну выкарыстоўвалі як сродак ачышчэння. Цераз яе праганялі жывёлу, праходзілі людзі. Абыдзённік працягвалі тры разы па вуліцы ад скрыжавання да скрыжавання. Дзеці абносілі тканіну тры разы вакол вёскі, у іншых выпадках – вакол жытняга поля і дзевяць разоў цягалі па расе, а пасля гэтага разрывалі абыдзённік на кавалкі і забіралі па хатах, “каб хваробы не было”. У в. Навінкі Калінкавіцкага раёна “адным днём рабілі” ручнік у гады вайны, калі дажджу доўга не было, і да ўзыходу сонца дзеці абнеслі ім вёску. Потым разаслалі абыдзённік на дарозе і прагналі цераз яго жывёлу. Гэтую тканіну аддалі ў царкву ў Васілевічы.

Большасць зафіксаваных выпадкаў абыдзённага рытуалу тычыцца выклікання дажджу ці звязана з практыкай прадухілення падзяжу хатняй

жывёлы. Калі моцна хварэў хтосьці з членаў сям'і, асабліва дзеці, абыдзённік рабілі толькі члены сям'і. Атрыманы звесткі пра тое, што выконвалі спецыяльную абыдзённую тканіну, каб лавілася рыба – "браднік", а таксама пра тое, што жанчыны, якія трымалі пчол, кожны год увосень ткалі абыдзённую тканіну і працэджвалі праз яе воск, каб і на наступны год пчолы далі багата мёду.

Запісана шмат фактаў абыдзённага рытуалу ў гады Другой сусветнай вайны. Выкананне рытуалу не заўсёды дасягала пажаданага выніку. У в. Тонеж Лельчыцкага раёна зварот да рытуалу, калі была выраблена абыдзённая "наметка", не выратаваў вёску. Нямецкія захопнікі 6 студзеня 1943 г. сагналі яе жыхароў у царкву і зажыва спалілі. На гэтым месцы цяпер узведзены мемарыял загінуўшым. Не выратаваў абыдзённы рытуал і жыхароў спаленых вёсак Ульянаўка Ельскага раёна і Будкі Нараўлянскага раёна.

Да нашага часу на Гомельшчыне захавалася практыка ўжываць тканіны ў якасці аброку. Аброчныя тканіны жанчыны прыносяць у царкву, вешаюць на крыжы, каля крыніц, ахвяруюць на мясцовыя святыні, якія называюць "свячамі".

Традыцыю "абракацца" жанчыны тлумачаць па-рознаму. У в. Тонеж Лельчыцкага раёна Кацярына Вянгура, 1933 г.н., сказала пра аброкі: "Аброк



Мал. 1072. Ева Кандратовіч, 1944 г.н., каля аброчнага крыжа на прошчы ў лесе паблізу в. Заазер'е Акцябрскага раёна. 2004 г.



Мал. 1073. Святая крыніца з аброчнымі крыжамі ў в. Будзішча Чачэрскага раёна. 2010 г.

на семь рок. Калі не пачепіш, то грэх" (зап. 2005 г.). "Крест не паложана, каб быў голы, калі яго зрабілі, трэба вешаць палаценца. Абязацельна нада павесіць, каб голы не стояў" (Вольга Дземідовіч, 1928 г.н., в. Кошчычы, Калінкавіцкі раён. Зап. 2005 г.); "Грэх, каб стаяў голы крэст" (Аксіння Дзяйкун, 1932 г.н., в. Навінкі, Калінкавіцкі раён. Зап. 2005 г.). Практыка аброкаў набыла вялікае значэнне ў савецкі час, калі на Гомельшчыне былі практычна знішчаны ўсе цэрквы. Людзі лічылі, што абракнуцца ручніком, напрыклад, на крыж ля крыніцы – "гэта як у царкву вешаеш" (в. Рудня Насімкавіцкая, Чачэрскі раён. Зап. 2003 г.). У вёсках існавалі спецыяльныя "аброчныя дні", калі адбываўся абрад шанавання свячы, якую пераносілі з хаты ў хату і да якой прыносілі свае аброкі.

У в. Ляскавічы Акцябрскага раёна на могілках стаіць антрапаморфны крыж у выглядзе бабы – на галаве павязана адна на адну да дзясятка хустак, уся яна абвешана тканінамі, якія выглядаюць як сукенка (мал. 1071). На крыж абракаюцца на Радаўніцу, калі прыходзяць на могілкі. Крыж сюды перанеслі, калі ў вёсцы ў 1956 г. савецкія актывісты руйнавалі прыдарожныя крыжы. З таго часу крыж на могілках стаў месцам калектыўнага аброчнага рытуалу, прымеркаванага да дня памінання продкаў – Радаўніцы.

Аброчнымі аб'ектамі з'яўляюцца крыжы, усталяваныя на святых месцах – прошчах, з якімі звязаны паданні пра цуд з'яўлення Божай Маці ці цудоўнае выратаванне ад хвароб. Так, на прошчы паблізу в. Заазер'е Акцябрскага раёна крыжы, усталяваныя каля святой крынічкі, цалкам закрыты аброчнымі тканінамі (мал. 1072). На прошчы ў лесе каля в. Хутар Светлагорскага раёна раніцай на Троіцу індывідуальна ставяць аброчныя крыжы і прыносяць на іх ручнікі, хусткі, стужкі.

На ўсходзе Гомельшчыны, асабліва ў Чачэрскім раёне, аброкі прыносяць на крыжы, што ўсталяваны каля святых крыніц, якіх тут вельмі шмат. Выразным прыкладам з'яўляецца святая крыніца ў в. Будзішча Чачэрскага раёна, дзе стаяць некалькі крыжоў, цалкам закрытыя аброчнымі ручнікамі (мал. 1073, 1074, 1075).

Трывала захоўваецца аброчная традыцыя на Усходнім Палессі. Уражваюць тэкстыльнай антрапаморфнай пластыкай аброчныя крыжы ў вёсках Тонеж, Будча, Сіманічы, Мілашавічы Лельчыцкагаа раёна. З года ў год на крыжах напластоўваецца вялікая колькасць тканін. Так, напрыклад, у вёсках Мілашавічы, Глушкавічы аброчныя крыжы на скрыжаваннях вясковых вуліц нагадваюць антрапаморфныя жаночыя боствы (мал. 1076, 1077). У в. Буда Лельчыцкая аброчныя крыжы з тканінамі называлі "хвігуры". У іншых вёсках прынята здымаць старыя тканіны-аброкі ў Красную суботу напярэдадні Вялікадня і паліць іх. Пры гэтым жанчыны кажуць: "Хай ідзе да Бога дым" (мал. 1078).

Крыжы у в. Тонеж Лельчыцкага раёна цалкам закрытыя тканінамі – ручнікамі сваёй работы і крамнымі, нават сучаснымі махровымі ўціральнікамі кітайскай вытворчасці, хусткамі, фартухамі. Аброкі вешаюць на Вялікдзень. Жанчыны кажуць, што за раз начэпліваюць столькі, што "не дадзержывае крэст" (мал. 1079).



Мал. 1074. Аброчныя крыжы з ручнікамі каля святой крыніцы ў в. Будзішча Чачэрскага раёна. 2010 г.



Мал. 1075. Ручнікі на аброчным крыжы каля святой крыніцы ў в. Будзішча Чачэрскага раёна. 2010 г.



Мал. 1076. Аброчны крыж ў канцы в. Мілашавічы Лельчыцкага раёна. 2007 г.



Мал. 1077. Аброчныя крыжы на скрыжаванні ў в. Дзяржынск Лельчыцкага раёна. 2007 г.



Мал. 1078. Алена Карась, 1945 г.н., і Вольга Плех, 1936 г.н., паляць старыя аброкі з крыжа ў Красную суботу напярэдадні Вялікадня (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён). 2009 г.



Мал. 1079. Аброчны крыж на скрыжаванні ў в. Тонеж Лельчыцкага раёна. 2007 г.



Мал. 1080. Жанчыны з аброкамі каля аброчнага крыжа "каменная дзевачка" раніцай на Вялікдзень (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён). 2009 г.

У в. Данілевічы Лельчыцкага раёна раніцай на Вялікдзень жанчыны па ходу сонца абыходзяць усе драўляныя крыжы ў вёсцы і на кожны вешаюць свой аброк – спецыяльна для гэтага зробленыя фартушкі з тканіны – "фартусікі". Потым яны нясуць аброкі на каменны антрапаморфны крыж, які называюць "каменная дзевачка", "камень", "святы камень" (мал. 1080, 1081). З сакральным каменем звязана паданне пра дзяўчынку, якая была праклятая сваёй маці"[1]. Каля в. Баравая Лельчыцкага раёна ў лесе ёсць падобны аброчны каменны крыж, які таксама называюць "каменная дзевачка". Да яго на Вялікдзень па традыцыі прыносяць аброкі – фартушкі, хусткі (мал. 1082).

Тэксты, якія публікуюцца ніжэй, запісаны аўтарам, а таксама І.Ю. Смірновай, Р.С. Гамзовіч і М.М. Віннікавай, супрацоўнікамі Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава Г.І. Лапаціным і Л.Д. Раманавай.

[1] Гл.: *Лобачевская О.А.* Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі / уклад. І.Ю. Смірнова; пад навук. рэд. В.А. Лабачэўскай. Мінск, 2008. С. 94–109.



Мал. 1081. Жанчына з аброчным фартушком каля аброчнага крыжа "каменная дзевачка" раніцай на Вялікдзень (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён). 2009 г.



Мал. 1082. Аброчны крыж "камень-дзевачка" ў лесе каля в. Баравая Лельчыцкага раёна. 2009 г.

## Пры засусе

### *в. Валосавічы Акцябрскага раёна*

Як не было дажджу, дак сабіраліся, за дзень і напралі, і наткалі, і павесілі на растанцох. Ужэ былі красты, і вешалі на растанцы. Каб дождж пайшоў.

< *А калі гэта рабілі?*>

Эта дажа вот пасля вайны рабілі.

<*А як такі ручнік называлі?*>

Ручнік да і ўсё. Вешалі. Прасілі Бога, каб Бог дожджу даў. Да і ўсё. Рана сабіраюцца, і за дзень ўсё зробяць. Эта старэйшыя рабілі. Ну, і мы памагалі. Маладзейшыя. Усе гуртам. Усім сялом. Толькі жанчыны. А мужчыны крэст рабілі.

<*Доўгі ручнік быў?*>

Ну, я ўжэ не помню, які. Мабыць, доўгі. Мабыць, доўгі не ўспелі наткаць. Але ж наткалі.

<*А як неслі на той крыж, памятаеце?*>

Бабы самі неслі.

<*Так рабілі адзін раз пасля вайны?*>

Адзін раз ткалі.

<*А хто сказаў, што трэба так рабіць?*>

Ну, нехта ж от прыдумаў, са старых людзей прыдумаў.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Анастасіі Юрчак, 1932 г.н.)*

### *в. Заазер'е Акцябрскага раёна*

Да-да. Абракаліся. Аброкі клалі на етую пражу, штоб Бог памілваў, што яны просяць, штоб Бог даў дождж. Ткалі тыя рушнікі, праўда, ткалі. Сколькі там сабярэцца, тры паскі такіе, о, працягнуць. Колісь багата чаго рабілі, у старае ўрэмя.

Ткалі, ткалі, я знаю. Мы ж былі малые, а малое ж яно ўсюды ўлезе і ўсюды чуе, што гавораць. Ткалі ўвечары, пры агні ткалі. Ужэ ж як наўеш, так тчэш жа, пака кончыш яго ўсяго. Ну, такіе палосы, вузенька, як ручнік.

<*Сантыметраў трыццаць?*>

Як рушнік.

<*Ці, можа, што па канцах натыкалі?*>

Із канца некатарые словы былі нарысованые, як тчэ, дак закладае панізка етые, о. Якіе словы, кладзе, дак выразае, тако, о, ніткі такіе, і закладае ў етую аснову, і прыб'е, і буква выходзіць.

<*А што гэта былі за словы?*>

Колісь жэ казалі, і прырабляді, і завітухі некія завівалі. Багата чаго пры старам ўрэмені рабілі. А цяпер Бог іх ведае. Нічога нема этаго.

<*А вот скажыце, вот выткалі такога ручніка на аброк, і што потым?*>

У цэркаў насілі. Цэркаў стаяла ў нас у Рудобелцы. І туды насілі етые ручнікі.

<*А ў вас капліца была яшчэ ў вёсцы?*>

Да, у канцы. Ну, эта хто ўжэ стары, не мог хадзіць далека, дык абракаўся ўжэ, да тут вешаў у этай капліцы. Адсюль жэ ж забіралі ды вазілі ў прошчу, у прошчу вазілі.

<*У прошчу?*>

У прошчу, ага. Там ужэ было ў прошчы, ой, там навешана было чаго ты хочаш, і шытаго, і нешытаго. Я ўжэ помню ета добра. Зайдзеш у тую прошчу, дак аж гнецца етае дзерава, дзе павешалі. Там бярозы стаялі такіе, бярозы, гальё, дак на гэта гальё як начапляюць, дак яно да зямлі, да зямлі гнецца.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2006 г. ад Ганны Гавароўскай, 1909 г.н.)*

### *в. Забалацце Акцябрскага раёна*

Гэта называўся “абдзённік”. Мы тожа ткалі. Як дажджа не было, ткалі, на крэст вешалі. “Аброк” называўся. І пралі только недаросткі, да 18 гадоў такія дзеці.

У нас была баба Фёдарыча, суседка, магілёўка, і яна ткала, і мы пралі, і ёй насілі. За дзень напралі, наснавалі, і яна метра паўтара-два далжна наткаць і павесіць на крыж, штоб пайшоў дождж.

Больш як два метры! Метраў тры мо і чатыры. Во так во апаясалі крыж. Неслі бабе, баба снавала, і баба ткала.

<*Адна яна ткала?*>

Ну, там памагалі, можа, суседкі. Тая баба ткала. Вуткала палатно метраў тры, і чаплялі на крыж. Ён называўся “абдзённік”, што за дзень зрабілі. Утрам пачыналі, і к вечару ён быў гатоў. А крэст во то ў нас стаяў.

*<Абыдзённік ткалі, калі дажджу не было?>*

Была сухая пагода. І на другія такія случаі абракалісь. Калі засуха ці неўраджай. Я помню, што ў войну яго ткалі. Абракаліся, што вайна прышла. І тая баба, што ткала, ёй задалі вапрос: "Як вы хочаце, якая ўласць каб была?" – "Я толькі хочу, штоб не было вайны, штоб не убівалі людзей, ужэ было пераміp'е". І вот эта баба ткала і абдзённік вешала на крэст, штоб кончылася вайна. Штоб сталі людзі жыць мірна. Ужо і нямцэ, і парцізаны ў нас. Яна кажа: я толькі хочу, штоб не было вайны, штоб не ўбівалі людзей, штоб было пераміp'е. І вот баба ткала абдзённік, вешала на крэст, штоб кончылася вайна, штоб сталі жыць людзі мірно.

Яна з Магілёва была, з Магілёўскай вобласці. Служылі салдаты, і салдат яе прывёз. А фамілія наша – Ахрэмчык. А як яе звацъ, я ўжэ не знаю. Яна была такая арганізатарка. Яна была быстрая, за дзень магла гэта здзелаць, панімаюшчая. Я помню, я напрала і панесла верацяно. Вы бачылі, якое верацяно – прасці? Дагаварыліся старэйшыя бабы, каб прасці, і пралі подрасткі. Не хватало сілы, каб устанавіць мочалачкі, каб памачыць пальцы. Не было баначкі. Усё пагарэла, у магазінах нічого не было. Так і жылі.

Красты паставілі ў войну, а раньшэ не было.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2006 г. ад Агаф'і Станкевіч, 1928 г.н.)*

### в. Ляскавічы Акцябрскага раёна

Дзённікі ткалі. Дзённікі, так я знала, ткалі. Абдзённікі я знала... За адзін дзень нада напрасці, і аснаваць, і выткаць. Так эта рабілі адтаго, штоб дождж ішоў – абдзённікі. Другі раз вот пагода ўжэ смаліць, смаліць, няма дажджу, дык рабілі этыя абдзённікі. А тады гладышкі кралі, былі такіе во, ну, і цяпер жэ дзе ў каго-та такія ёсць гладышкі, так на платах кралі і кідалі ў калодзеж, штоб дождж ішоў.

*<А вы бачылі, як ткалі?>*

Ну, я ж бачыла. Я ўжэ сама садзілася за кросны і мацеры памагала ткаць. Ну, сеялі ж лён тагды пасля вайны. Дык эты лён ужэ, лён ужэ ж гатовы быў, ужэ ж яго абдзіралі, усе рабілі, а тады сабяруцца кучаю, напрадуць. За дзень напрадуць, і эта самае, не ткалі ж ужэ там вон да самага забора.

*<Губку?>*

Ну, губка – эта ўжэ многа. Губка многа. Ну, можэ, столькі, от як у мяне кій у руках. Хто больш, хто менш, ну, сколькі за дзень выткуць.Так эта за дзень напрадуць, а патом ужэ аснуюць, а патом ужэ нав'юць на этые ўжо... Накідалі, і тагды ўжэ садзіліся, ткалі кучамі. Вот эта я знаю.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2006 г. ад Марыі Бубік, 1933 г.н.)*

### в. Харомцы Акцябрскага раёна

Ткалі абыдзеннікі. Эта сабіраюцца, напрымер, 10 ці 20 чалавек і зразу ж прадуць, снуюць і навіваюць на навойкі, і за дзень яго вытыкаюць. І тагды нясуць, на крыж вешаюць.

От, у нас жа была царква. Дак цэркву зразу зрабілі склад. А патом саўсім разбурылі, да клуб паставілі на этым месцы. Вешалі дзе на крыжах, на перакрэстках. От дзе перакрэстак, усе стаялі крыжы. І вешалі на крыжа.

Яшчэ і после вайны ткалі абыдзеннікі этыя. На памяці можа разоў 10 ткалі. От як толькі засуха, так і начынаюць старэйшыя. Яны ўжэ ўсе паўміралі. Кожны год, як толькі засуха, так і ткалі.

<*А хто казаў, што трэба так рабіць?*>

Ну, то колішня такая пагаворка, што нада такое рабіць. Гладышкі, давайце будзем красці. Эта цяпер жа ўсе ў банках, а тут былі гліняныя гладышкі. Давайце пойдзем, у каго на платах вісяць гладышкі, красці і ў калодзеж кідаць. Эта на дождж.

<*Абыдзеннік, якога выткалі, ён вялікі быў?*>

От як палаценца, такі. Метраў два.

<*А што па канцах рабілі?*>

Нічога. Ткалі гладзенькі, як палатно. Чысценька. А дажа ж яно сірае. Лён жа ж.

<*Не мылі яго?*>

Не, куда ж. Эта ж абыдзеннік. Аб дзень яго напралі, наткалі. І малалеткі, каторыя яшчэ чыстыя, вешалі. У каторых яшчэ дажэ не было на рубашцы.

<*А ткалі старыя жанчыны?*>

Старыя. Гадоў па 60 і более былі. Усякія ж былі.

<*А крыжы ставілі мужыкі?*>

Ставілі. На перакростках. У нас у канцы сяла стаяў, вот тут, дзе памятнік стаяў. Красты стаялі.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Вольгі Селіванавай, 1928 г.н.)*

### *в. Губічы Буда-Кашалёўскага раёна*

Эта помню. І во, як дажджоў не было, дык дужа пераворвалі мы паласу, дарогу. Удовы. Мужнія не, а ўсё ўдовы.

<*А ручнік рабілі?*>

А ручнік – эта тожа на штось, тожа была прыхамета.

< *А як такі ручнік называўся?*>

А Бог яго ведае... Да, абудзёнаўка! Абудзёнаўку выткаць нада.

<*А вы самі бачылі, як ткалі?*>

Не, не. Толькі расказвалі.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Ксеніі Жукавай, 1918 г.н.)*

### *в. Чырвоны Акцябр Буда-Кашалёўскага раёна*

Было, было... Еслі дажджу німа, я помню, так было... Не было дажджу, дзелалі абудзённік. Адна прадзе, другая, і снуюць, і ткуць. За адзін дзень губку наткуць. І тады ета палатно, была дарога крыжавая, вот, прымерна, там укапывалі хрэст і вешалі. І штоб ішоў дождж. От, Богу маліліс. От, эта я помню, было. Ета дажа й я бачыла, што палатно ета вешалі, на крэставыя дарогі на гэтыя. Ткаць я ўжо не ткала, а бачыла.

*<А хто ткаў?>*

Ну, старыя, старэйшыя калісь там...

*<Дапамагала, калі так рабілі?>*

Ну, як будто... Дождж пойдзе, як кажуць, ну, во і Бог даў, і дождж пашоў, што мы здзелалі. А ці яно так, ці не так? Хто яго ведае. Ну, так гаварылі старыя. I мы так гаворым.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Анастасіі Шэметавай, 1930 г.н)*

**в. Есіпава Рудня Калінкавіцкага раёна**

Ткалі, ткалі. Дак ткалі этыя палаценцы, ткалі і насілі на цэркву. Вешалі, каб дажджы шлі, дак вешалі на цэркву.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Феадосіі Назарэнка, 1914 г.н.)*

**в. Зеляночы Калінкавіцкага раёна**

Я чула, такі аброк. То казалі, як дождж не ідзе, та нада за дзень напрасці, аснаваць і выткаць. Ну, я чула такое. Да, эта я чула такое. Але не рабіла такое. Расказвалі старыя. Та сабяруцца і расказваюць, што нада за дзень напрасці, наснаваць і выткаць. Тады пойдзе дождж.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Ніны Мельнічэнка, 1932 г.н.)*

**в. Казловічы Калінкавіцкага раёна**

Кідалі гладышкі, што малако даілі, штоб дождж ішоў. Вуліцу пераворвалі, удовы. Каторыя без мужыкоў.

*<А ручнік ткалі?>*

Дзелалі, дзелалі. Ну, штоб дождж ішоў.

*<А хто вам расказываў?>*

Чула, але мы не рабілі.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Марыны Старавойтавай, 1916 г.н.)*

**в. Ладыжын Калінкавіцкага раёна**

Мы ткалі тут. Пра эта раскажу. Эта вот, сушыць лета. I сухое, і дажджу німа. Эта ж бабы, не мы, а старэйшыя за нас былі бабы. Да і гаворац, тая тое рабіла там не так. То капала на Благавешчанне. Адна на адну. Тако ў нас старыя бабкі бяруць ікону, і кругом сяла абойдуць, і возьмуць мужчыну і прайдуць вуліцаю раўчак плугам, эта каб дождж пашоў, і ў калодзезь кідалі. А далей што, нада выткаць рушніка. От сесці. I выткаць. Ну, о. Так мы збіралісь, каторыя прадом, а тая снуе. А тады наўюць, а тая тчэ. Мяняюцца. То тая, то тая. I за дзень выткалі таго ручніка, і вешалі так, як я вам гавару, на той крэст. I мы адзін год рабілі. Пасля вайны. Яшчэ я жыла ў старой хаце, я ж знаю, тады само лёну. Тады пралі, ткалі. А цяпер жа ж багата гадоў не ткуць, не прадуць.

<*Як такі ручнік называлі?*>

Я не знаю, ніяк не называлі, кажам "рушнік". Да эта каб дождж да ўсе. Каб вешалі на этага краста да і ўсе.

<*А не называлі абыдзеннік?*>

Называлі ўродзе "абраканне", што абракаемся. Абракаемся перад Богам, каб нам Бог даў дажджу. Абракаемся.

<*Рабілі ўдзень ці ноччу?*>

Удзень. Уночы ж, напрымер, не бачыш ні прасці, ні ткаць. А то на вуліцы, не то што у хатах, прама на вуліцы.

<*А як на вуліцы?*>

На вуліцы ставілі гэтага дзядком эты кросны, і на вуліцы і пралі, усім сялом, не ў хаце.

<*А як кросны ставілі?*>

А кросны на вуліцы, у нас жа такія нарады былі, што палкамі туды вешалі. А былі такія нарады, што зрабілі во такія, о, да і на вуліцы можна ставіць было тое, дзе ткут. Нарад, дзе ў хатах ткалі, дак выносілі на вуліцы, і эты нарад ткалі. Хто праў, а хто ткаў. Ну, хто што. Але ўсе за дзень зрабілі.

От як, напрымер, от такі нарад такі доўгі. І эта палавіна доўга, этыя ж нарады гнаць і гнаць. І к этаму нараду от такая во клюква ўверх. І эта клюква во. І тут лажылася палка, і за эту палку ўжэ ніты чаплялі і берда чаплялі. І гэта і ў хатах такое было, у людзей. А каторые іменна от тут чаплялі. Там паўбівалі і чаплялі. І тое ўжэ на адным месцы стаў. А так я і гавару, дак можна было і там паставіць, там паставіць. Куды хочаш можна было паставіць.

<*На двары ткалі?*>

Да, прама на вуліцы ткалі этага ручніка. Сярод вуліцы. От, напрымер, дарога, а эта збоку і ткалі.

<*Колькі жанчын збіралася?*>

Ну, тады ж у нас багато сяло было. Дак багато збіралася, я не магу сказаць. Глаўно ж за дзень, тыя напралі, тыя снуюць. А тады ж трэба ткаць, і яшчэ прадуць. А тыя ўжэ аснавалі. А тыя накручваюць. А тыя ўжэ затыкаюць. Работы ж багата там было.

<*Больш за дзесяць жанчын было?*>

Болей, што там 10 зробіш! Болей, эта ж трэба кудзелі, да напрасці, да наснаваць, да і ткаць, багато работы. Дак збіраліся, да за дзень ўжэ зрабілі.

<*А трэба было зрабіць, пакуль сонца не пачало заходзіць?*>

От пра сонца – эта не было разгавору. Ці эта да сонца, ці эта трэба. Мы ж не ўночы, нічога. А напрымер, так паўпраўляліся. Хай ўжэ ў 10. Свае хазяйства дагледзілі і пашлі ўжэ эта рабіць. І пашлі гуртам рабіць, пака не кончылі, так не пайшлі дадому. А тады вечарам ужэ ж трэба зноў даглядаць ужэ дома. Дак у дзень эта ўсе рабілася.

<*А які той ручнік быў?*>

От, як і эты. Рушнікі ў нас адзінакавы. Бёрды, значыць, адзінакавыя. Адна шырына была. Пасм 7–8 яно счыталася. Доўгі, метраў 3 будзе ён ці болей. Той рушнік. Адна губкі. Ну дак адну губку аснавалі. Ужэ ж яны ніткамі там трохі другімі перабіралі. Ну, там мала затыканага. А так з пражы, ды і годзе.

<*Кожны свой лён прыносіў?*>

У каго лён быў, да прывозілі. А тагды ж лёну было, да прыносілі, і пралі, і гэто зрабілі.

<*Рэдзенька ткалі, каб паспець?*>

Не, так, як нада, ткалі. Бо ўжэ бёрда накідаеш, так яно і тчэцца. А тут ужэ так.

<*Зрабілі так, і пайшоў дождж, памятаеце?*>

Да, а потым ўжэ дождж пашоў. Да казалі, ізноў тыя бабкі ўзялі ікону і ўжэ зноў абходжвалі кругом дзярэўні.

<*З іконай і тым ручніком, які выткалі?*>

Не. Сваімі ручнікамі, а таго ж павесілі. Не разразалі ж яго, нічога, так і павесілі. А ікону так ўжэ дома бралі з ручніком, дак сваім ручніком і абойдуць, і назад прынясе, і паставіць.

<*А вы казалі, што мужчыны прааралі дарогу? Упоперак дарогі аралі?*>

Прама. Дак, напрымер, вуліцу занялі, і з таго канца, і так во праворвалі, адзін плуга дзяржыць і каня вядзе.

<*Па вуліцы?*>

Ну, па вуліцы, і так паўзбок тожа ж. Дак это ўсе да дажджу рабілася. Сільна сухія годы былі, сільна выгарвала. Так, як і цяперака, дзе дажджы, а дзе і німа.

<*А чаму перасталі так рабіць?*>

Ну, ужэ бачце, ужэ стала лучшэ жыць. Ужэ стала мацер'я. Усё куплена. А тады ж усё свае.

<*Крыж, на які вешалі, ён дзе стаяў?*>

От у нас, напрымер, от туды пашла дарога, туды дарога і туды. Эта звалі "растанцы". Што дарога туды ідзе, туды і туды. Дак эта тамака навек і крыж стаяў. От па дзярэўнях мо і цяпер стаят.

Павесілі, а калі той крыж раскідаўся, калі яно што, так не знаю этаго.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Аляксандры Валаткевіч, 1912 г.н.)*

### *в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна*

<*Як гэта рабілі?*>

Як? От сабяруцца. Тагды ж лён быў. Да пралі. Верацяном. Да напрадуць, да паснуюць. Гэтак мала, а як сабе, дак многа губак кладзеш на хату. А так, як губачку пакладуць, дак ужэ поткуць хутчэй, раз-два. Да ўжэ і павесяць.

<*Колькі жанчын збіралася?*>

Якіх штук 6–5, і эта зробяць. Мо ўвечары ўжэ зберуцца, да ткалі. Уперад жа трэба напрасці, да паснаваць на сцене. Да навой навіць. Эта работы многа. Да накідаць трэба ў бёрдах. Так жа яно не тчэцца што раз, два.

<*А хто казаў, што так трэба рабіць?*>

Самі робілі. От хтось скажа, да так ўжэ і слухаюць.

<*Збіраліся старыя жанчыны ці маладыя?*>

Старыя.

<*Як называўся такі ручнік?*>

"Коскі". "Коскавы ручнік". Так то ткалі, у 4 ніты. У радочкі ідзе. Та то коскавы ручнік. У косачкі. Узорчыку не было. А так затыканне, унізу. Краснымі, чорнымі, каб аддзялялася яно. Палосачка чорным, красным.

*<Што зрабілі з гэтым ручніком?>*

У цэркву насілі. У Калінкавічы.Тут жа была цэркаў. Да вайны.

*<А вёску абыходзілі з тым ручніком?>*

Абыходзілі. От па сялу абыходзілі. Ходзілі бабы. Як хто тагды ў цэркаў ходзілі, і тую песню пелі царкоўную.

*<А калі гэта рабілі?>*

Пасля вайны рабілі. Толькі ж не ходзілі з тымі ручнікамі.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Таццяны Радзько, 1931 г.н)*

### в. Навінкі Калінкавіцкага раёна

Гэта, як была малая, было. За адзін дзень вуткуць, і мы да сонца вакол сяла абыйдзем з гэтым палатном і з іконаю.

*<А хто ткаў?>*

Такія жанчыны крэпенькія выбіраліся. За адзін дзень адснуюць і ўткуць. У хаце ткалі. Ткалі і насілі, так пака сонца ўзыйдзе. А патом слалі так папалам гэта палатно пасярод дарогі, і гналі праз яго скот. ...Хто праў, хто ткаў, а хто прадзенае прынёс. І ткуць, і навіваюць – усе разам. І рабілі два ручніка. Каб у цэркаў занесці. Цэркаў была. Не ў нашай дзярэўні, а ў Васілевічах.

*<Ноччу абыходзілі?>*

Ноччу, ноччу, і ікону бралі. Так пабяруцца дзеці, іх пяць-шэсць, і нясуць. І ікона ўперадзе. Ікона Божай Маці.

*<Так расцягнуты быў ручнік?>*

Расцягнуты. Сама я нясла яго.

*<А як называлі такі ручнік?>*

"Іконнік" назва была. Божае Маці ішла ўпярод і Спасіцель.

*<А абыдзённікам, аброкам яго не называлі?>*

Можа, і называлі? Я малая была. Пазавуць, скажуць – ідзі. Я ўжо радая была.

*<Вы казалі – "у адзін дзень ткалі"?>*

Ага, гэта ў адзін дзень ткалі, каб ужэ дождж пайшоў.

*<І рассцілалі ўпоперак дарогі?>*

А расцілалі, каб худоба ішла. Прама цераз палатно ўвесь скот прахадзіў па дзярэўні. Пака скот, мы ўжо абойдэм сяло, а тады засцілаем – ужэ скот ідзе. Каб дождж пайшоў.

*<Усё сяло ішло з гэтым ручніком ці толькі дзеці?>*

Толькі дзеці, толькі, узрослыя неслі ікону ўпярод.

*<Можа, маліліся?>*

У хатах маліліся. І ля краста бацюшка маліўся.

... Гэта былі арганізатары, іх слухалі. Вот нада ткаць, дождж не ідзе, вот нада нам абрэкнуцца, уткаць за дзень і абысці з гэтым палатном і іконай, каб дождж пайшоў.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2005 г. ад Аксінні Дзяйкун, 1932 г.н.)*

### *в. Стукачоў Кармянскага раёна*

Кросны ткалі на перакростку. Старыя бабкі, баба Ганна ткала, штоб дождж пайшоў. Чатыры ці тры бабкі. Я шчэ тады малы быў. Палатно тады, відна, у калодзеж кідалі.

*(Зап. Л.Д. Романава і Г.І. Лапацін у 1999 г. ад В. Шытава, 1940 г.н. Экспедыцыйныя запісы Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый ім. Ф.Р. Шклярава, сш. 91, ар. 117)*

### *в. Баравая Лельчыцкага раёна*

Ткалі, ткалі. І называецца "наметка". Называецца "наметка". Гэтой наметкою... Вешаюць тожэ на хрэсты. Дажэ такім от бедным людзём, як нема нічого, то тожэ давалі. Воскі збіралі, свечкі робілі. Нема дожджу, свечкамі тымі ходзяць, у крыніцу, да так колоцяць, да кажуць, свечкі тыя паляць. Бог ёго знае.

*<А вы самі прымалі ўдзел?>*

Не, не. Жонкі нашыя ходзілі з войны, ходзілі. Даём лён, после войны, да оны прадуць да ткуць такіе вузенькіе полоценца. Да ўжэ ж несуць, да на хрэсты вешаюць.

*<Адну наметку ткалі ці некалькі?>*

Ткуць одну ўсе обшчэ, а потом розрэзаюць, да ее там обшываюць, да ўжэ несуць. Такіе крэсцікі прышывалі. Попрышываюць красныя шматочкі, крэсты поробляць, а як жа. Або красною ніткой горыною поперэтыкаюць. Это называецца "наметка". Наметка. А ходзілі людзі спецыяльна, прадзіва збіралі. Вот селом ідуць да ў кажну хату заходзяць. "Ці зародзіло ў цебе леночку на намітку?" Лён сеялі. Да ўжэ ходзяць жонкі. Прыдзе, под кажнэ окно: "Добры дзень! Ці зародзіло ў вас леночку? К светому Веліконню на наметку". Ці воск збіралі ешчэ: "Ці зародзіў у вас вошчэчку к светому Веліконню на свечэчку?"

*<Адна жанчына хадзіла збірала лён?>*

Не, жонок дзве, тры, чотыры. Прадуць да ткуць, ткуць. Як есь такіе ніткі, то затчэ, а не, то красныя хрэсцікі попрышываюць, да такее во было.

Вешалі, рабілі, на хрэст вешалі. Мак свечаны ў крыніцу сыпалі. Ідуць у крыніцу, мак сыпяць, свечкі палюць, помоляцца, Бога попросяць, шоб ужэ... Усё Божа воля.

*<После вайны так рабілі?>*

О, после войны, конечно, было. Было. А ўжэ последніе годы – не... Цеперако так інцерэсно – да прасці, да ткаць хочацца.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2006 г. ад Кацярыны Дзямковай, 1928 г.н.)*

### *в. Раманаўка Мазырскага раёна*

От, як дождж ня йдзе, дак у нас кажуць "стамесачка". Дождж ня ідзе доўго, от летом – месяц, два. Калі, той Божа, дождж пойдзе? Сабіраюцца бабы. Вы прадзяце, а я ўжэ ніт раблю, а другая палку ўжэ загосвае на ніт... І ўжэ

зробім от поўгубкі, як мы кажам, напрадом і сатком. Яго не мочым, нічога. Бо тыя кросна, ужэ як свае навіваем, дак маць снову тую ў цэбре такі складвае, кропу, попелу з печы, і яно ўжэ пастаіць. Маць вымае, сцякае і на вешалку развешвае так, як мы кажам. Яно сохне, і маць ужэ спляце ў пляцёнку, так як от касу, і ўжэ на ногу, і на навойку, і качае тые снову.

<*А чаму такая назва?*>

Стамесачка. Ну, от выткуць ужо такую, і нясуць у цэркву бабы, нясуць ужо таго ручнічка ў цэркву. А Гасподзь яго знае, ці то пойдзе той дождж, ці мо калі сыпяне, а мо і не сыпяне. Але ж уродзе ўжэ такі аброкі робяць.

<*І якой даўжыні была стамесачка?*>

От, мо метра, мо метра, Божа ты мае. Калі чырвону, калі зялёну, якая есь, якая там две нітачкі засадзе, да там Божа ш мае. Яно ж не золена нічога, дак яно ж дзярэцца. Але як-нібудзь ужэ падымаюць рукамі, ды ўжэ чына тые, да ўжэ тым чоўніком засадзяць, да як-небудзь і выткуць там. О, такі, о, шырыны, о.

<*Такі вузенькі?*>

Вузенькаго, вузенькаго. Толькі ўжэ даўжэйшаго, каб пачапіць на якога гвоздіка там, ці што там у той цэркві робяць з ім. Вузенькаго, дзе ўжэ ж там шырокого робіць.

<*А вы самі рабілі такія?*>

Не, не рабіла. Маць мая этыя рабіла, з бабамі збіраласа, ага.

А ўжэ шчэ нашчот дажджу, дак от бяруць бабу, плуга, от што аруць у полі, і ўжэ ўходзяць на растанцы, і возьмуць да праваруць дарожку.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Кацярыны Сяўко, 1933 г.н.)*

### *в. Гажын Нараўлянскага раёна*

Казалі, "завіска" называлася. Мы яшчэ былі маладыя. Малыя дзеці такія былі. Эта, як кажуць, як дождж не йдзе, так сабіраюцца жэншчыны ўсе ў адну хату. І ўжэ прадуць тамака, той лён ці што, і ткуць, і да вечара ўсё зрабіць. А мы, дзеці малыя, бяром і ходзім вакол сяла. ...Кругом сяла обнеслі тры раза і занеслі ў цэркаў. Не було дажджу. Сільна суша была. І, дзякуй Богу, ад таго ці не ад таго – пайшоў дождж. На хрэст можна было вешаць і свае, а етыя ў цэркоў насілі.

*(Зап. І.Ю.Смірнова ў 2005 г. ад Ніны Кулявец, 1916 г.н.,*
*і Пятруні Яшчанка, 1941 г.н.)*

А ў нас ужо збіраліся бабі – дождджу няма ці там што. Дак ужо бэруць, збіраюцца. Лён прадуць, прадуць гуртом – тэ снуе, тэ прадзе. І ўжэ сядаюць, аснуюць – "завіскі" называлі рушнікі, вузкія. І ўжэ бэруць дзяцей такіх, доростков, кругом сяла абойдуць бабі з тымі, ужо малыя нясуць. А потом ідзе до храста – храсты ж стаялі на росходніх дорогах. І бяруць ужо вішаюць. Повішаюць, тагды ўжо скора і дождж пойдзе.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2005 г. ад Ганны Анціпенка, 1923 г.н.,*
*і Ульяны Майковай, 1949 г.н.)*

## Хваробы людзей, эпідэміі

***в. Дзякавічы Жыткавіцкага раёна***

На Міколу (магчыма, рабілі гэта кожны год на Міколу летняга. – *В.А.*), яко люды хварэлі... Як хвароба каснецца людзей, па всім сяле рабілі ручнік... Кругом палянкі, дзе жыта засеяна, абышлі, абцяглі палатном дзевяць раз па расе. Гэта колісь было. Бяруць гэтага ручніка, рэжуць на кусочкі, бяруць па хатам, каб хваробы не было. І ў кожну хату заносяць па кусочку, каб хвароба не хадзіла. Астаецца трохі, кусок астаецца – рэжуць і на шыю каровам вешаюць. Каб ўрокаў не было, штоб не станавіліся ад малока ўрокі.

*(Відэазап. Р.С. Гамзовіч і М.М Віннікавай ў 1998 г. ад Маланні Купрацэвіч, 1908 г.н.)*

## Пры эпізаотыях – падзяжы хатняй жывёлы

***в. Марозавічы Буда-Кашалёўскага раёна***

Эта казалі, такі рушнік ткалі, не рушнік – проста такое наткалі палатно, пераганялі кароў. Вот.

<*Для чаго гэта рабілі?*>

Ну, таму што прападала эта худоба. Вот яны перагналі цераз той рушнік.

<*І калі эта было, вы бачылі самі?*>

Не, я сама не бачыла. Яшчэ і мяне не было. Расказвалі ўжэ жэншчыны, вот былі, што жылі, як калісь яшчэ. А цяпер усё эта прапала, ніхто нічога не дзелае.

<*А ткалі толькі палатно ці яго ператыкалі?*>

Не, казалі, ткалі палатно і разаслалі па вуліцы, па вуліцы разаслалі і перагналі худобу.

<*А куды потым гэтае палатно?*>

Ну, я ж вам ужэ не раскажу. Худобу перагналі, а куды яны яго дзелі?

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Дар'і Кухарэнка, 1919 г.н.)*

Эта не рушнік, эта – абракаліся. Худоба дужа была, пагода, ды жара, худоба дохла. Дык селі ўсе, хто на самапрадачку, хто на верацяно. Напралі, а тады аснавалі, выткалі, перацягалі дарогу, і штоб худоба жыва сталась. І праўда, так. Дык мы шчэ малыя былі, дык так усе пралі людзі – хто як. І паснавалі, сталі во на вугол, во на хату сюды, колікі сюды паўбіваюць, аснавалі, выткалі за дзень усё. Тры разы дарогу перацягаюць – туда і адтуль – і пашоў дождж, ды стала худоба не так дохці.

<*А як тры разы перацягвалі?*>

Во туды, а вон саўсім во пойдзеш у канцы дзярэўні, штоб наперахрэст была дарога. Туда пацягнеш, тады адтуль, і зноў пацягнеш яе, тады зноў туды. І кароў цераз тое палатно...

<*Праганялі адзін раз ці тры?*>

Ну, яны ж первы раз, дык тры разы толькі худобіну, яны перацягнулі і ўсё. А тады ж ужо назаўтра не цягают.

<*Як гэта называлі?*>

"Браднік" такі! Затым, што абракаліся ўсе, хто на верацяно, хто на самапрадку, напралі і тое аснавалі, пралі, а ткалі, як і кросны ж.

<*Гэта было чыстае палатно ці пературыканае?*>

Нічым не пературыкалі, а прастое палатно.

<*Ткалі з лёну featured рознага гатунку і з абдзірак?*>

Да. Абы, штоб усе людзі абраклісь толькі. Штоб, знаеш, мо старыя так, мо як Бог даў, што нада што-небудзь сдзелаць. І вдовы ж, калісь дажджу не было, мы самі кажам, хадзіце, дык давайце дарогу перааром на сабе, на ўдовах толькі. Возмеш тры разы праедзеш плугам. І баба ўдава ўжо ўпляцецца, і то на бабах і пераворaем, штоб дождж пайшоў.

<*А гэты браднік, якім абракаліся, ён доўгі быў?*>

Даўгі, даўжэй, як рыбу ловіш той. А тады ж такій бальшы здзелалі.

<*А што потым з ім рабілі?*>

А куды-небудзь паклалі і ўсё. А хто, можа, і захацеў і тое...

<*А вы самі бачылі ці вам маці расказвала?*>

Не, браднік, дык эта я ўжэ.

<*Адзін раз так рабілі?*>

Да. Во эта пераганялі так худобу. У Марозавічах шчэ. Тамака гусі дохлі, і ўсё – не было чаго есці.

<*Так рабілі ў Марозавічах?*>

Да, так. А сюды мы ўжэ пераехалі.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. у в. Глазаўка Буда-Кашалёўскага раёна ад Хадосі Казачэнка, 1910 г.н.)*

### *в. Бабічы Чачэрскага раёна*

А эта было. Абракалісь... За адзін дзень во, пралі і выткалі. Эта як не было дажджу ці што? Не, скот. А-а, скот быў. Так вось за адзін дзень і напралі, і выткалі, і наснавалі, накідалі і выткалі – і ўсе за адзін дзень. Эта было, было. Скот дох.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Марыі Маркоўскай, 1930 г.н.)*

Слалі, і пераходзіў скот.

<*Вам расказвалі, што скот пераганялі?*>

Да, да, да. І так перастаў ужэ прападаць скот, як здзелалі рушнікі. Выткалі, паслалі, скот перайшоў і не сталі ўжэ.

<*А потым што з гэтым ручніком зрабілі?*>

Эта ўжэ не знаем.

<*Пры вас не ткалі?*>

Не, не, толькі расказвалі нашы маткі, бабы, во. Эта даўно. Да, да вайны.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Кацярыны Хімічавай, 1930 г.н.)*

***в. Бяляеўка Чачэрскага раёна***

*<Вы чулі пра такое, што рабілі ручнік за адну ноч?>*

Ну, вышывалі. Не, ткалі. Збіралісь жанчыны, пралі, ткалі, снавалі. Талака.

*<Талака?>*

Да. За адзін дзень уся дзярэўня, эта скот, прападаў скот, дох. Дак абракнуліся людзі, здзелаць талаку. Сабраліся ўсе бабы прасці эты лён і пралі. За адзін дзень напралі, і снавалі, і выткалі, і тады того палатно, от як уцірка эта мая. Выткалі палатно, і так, упоперак вуліцы, і скот пераганялі цераз эта палатно. Эта, "будзённік" выткалі, абракалісь. Ну, за адзін дзень эта выткалі і скот перагналі. Тады перастаў скот дохнуць, а то дох дужа скот.

*<А калі гэта было?>*

Летам. Летам, што і высахла (аснова – *В.А.*), аснаваць, тады мачыць, тоўч, сушыць, дак і высушылі, і напралі, і выткалі адразу.

*<Вы самі бачылі ці гэта расказвалі?>*

Эта старыя бабы і матка мая яшчэ расказвала.

*<На вашай памяці такога не было?>*

Не, на маём не, эта расказывалі. Знаеш, эта мне ўжэ восемдзесят гадоў, я этага не знаю. Пры мне этага не дзелалі. Эта мне расказывалі, матка, скот сыпаўся, дох, дак эта будзённік дзелалі. Старыя бабы ўсё расказвалі. Тожа інцярэсна, як жа за 'дзін дзень эта яны выткалі? Як выткалі, што і перагналі цераз яго, увесь скот пераганялі.

*<Вот перагналі жывёлу, а потым куды той ручнік?>*

А вот я не знаю. Дзе яны, мо дзе ў цэркаў, наверна, аднасілі. Да. У Чачэрск ці Залессе насілі.

*<А не казалі, чыстае палатно было ці з палосачкамі?>*

Не, чыстае. Чыстае выткалі, палосак не. Палатно выткалі і ўсё. Перагналі скот цераз яго.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Варвары Герашчанка, 1924 г.н.)*

Дак эта ж будзённік ткалі ў нас, як абракалісь на скот, дохла скаціна, каровы дохлі. Дык і ткалі за адзін дзень, лён змялі, патрапалі, і спралі, аснавалі і саткалі, за адзін дзень. І там пасцялілі дзе-та вонь на выгане, каля сараяў, на дароге ўсіх кароў пераганялі, уся дзярэўня.

*<А калі гэта было?>*

Хто яго знае, шчэ гэта матка казала. Да, я не знаю, эта матка расказвала. Будзённік такі ткалі. Усе, уся дзярэўня, хто што – па нітаццы складалі і скарэй дзелалі. Вот за дзень трэба ж здзелаць. Вот рушнік выткалі за дзень, і пасцялілі, і пераганялі скот. Туды ўсе ганялі. Таго ж гавораць "будзеннік".

*<А чаму маці вам пра гэта расказвала?>*

Ну, будзеннік, аброчны той дзень, як яны абракалісь. І ў той дзень яны нічога дажа не рабілі, ніхто. Хай бы хто вышаў на агарод што-небудзь дзелаць, так зганялі. Раз аброчны дзень, так гэта ўжэ ўсё.

*<Толькі будзеннік рабілі?>*

Да. І той дзень празднік на ўсе ўрэмя астаўся, да. Аброчная пятніца, во некая ёсць. Первая во як начынаеца тая пятніца. Да, эта та самая пятніца аброчная.

*<Гэта калі?>*

После Троіцы. После Троіцы, пятніца палучаецца. От перад Троіцай пятніца – Сёмуха была, яна сёмая после Пасхі. После Троіцы первая пятніца – была аброчная, патом шла Дзевятуха, Дзесятуха і Цёмная пятніца. Абычна па эцім пятніцам не трогалі ні землю, ні воду, эта ад гразы былі пятніцы. У гэтыя пятніцы абычна на гразу, не трогаюць зямлю і не трогаюць воду, штоб граза, гром не прыняслі. На наступных тыднях, і іх не трогалі ў эты дзень, ні зямлю, ні воду нельзя было трогаць. Цёмная пятніца, а патом ужэ панядзельнік пасля Цёмнай пятніцы – Стараграды, эта тожа паследні дзень, ну, як не разрашалась. У нас і шчас нельзя дзелаць ў эты дзень нічога, ні зямлю трогаць, ні ваду.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Марыі Атрошчанка, 1929 г.н.)*

### *в. Залессе Чачэрскага раёна*

Рабілі ў нас, эта называецца "будзённік". От то хварэлі, а то ўсяк было. Была ў нас такая сціхія, што сільна пагібла багата і ската, і людзей, і ўсяго. Дык дзелалі будзённік. Эта во які – сабіраюцца ўсе людзі, усе, каторыя былі сагласны толькі, сабіраюцца і начынаюць прасць, толькі прасць. Хто прадзе, хто снуе, хто аблівае, да суша. Дзень жа бальшы летам. І сейчас жа ў эты жа дзень і ткуць. І выткуць палатно, палучаецца палатно. Выткуць эта палатно і тады назаўтра эта палатно расцелюць, от прымерна вуліца во, і кароў гоняць, і авечак гоняць.

*Уздоўж вуліцы ці ўпоперак рассцілалі?*

Не, упаперак. Ну, як жа ўздоўж жа, не. А гонюць ўжэ цераз лес, да. Дак тады пераганялі і эта вязлі ў цэркаў, і бацюшка адслужваў гэты будзённік.

*<А ў царкву куды вязлі?>*

У нас цэрква была свая тут. Да. У дзярэўні, свая цэрква, называлась Васілій, у нас свая ікона Васілій, і цэрква наша такая бальшая была. Дзярэўня наша бальшая была.

*<Калі пачыналі рабіць гэты будзённік?>*

Утрам раненька, сабіраліся раненька і эта ўсё дзелалі.

*<Рабілі гэта толькі жанчыны? Маладыя ці старыя?>*

Не, не, любыя. Эта ўжэ толькі мамка наша дзелала. Знаяце, калі эта было, эта яшчэ мамкіна мамка была, бабушка наша, дык тады эта было. Даўно было.

*<На вашай памяці не рабілі такі будзённік? Гэта толькі расказвалі?>*

Да, да, не. Я этага не рабіла.

*<А доўгі гэты будзённік быў?>*

А дліны якай, як у нас тады считалася, губка. "Губка" называлася. Чысто палатно.

*<Ці дапамог будзённік?>*

Ну, Бог яго ведае, знаеш, як жа гора, дак кідаюцца ўсюды. А дапамог ці не дапамог?

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Наталлі Хімічавай, 1922 г.н.)*

### *в. Шырокае Чачэрскага раёна*

<*А чулі пра такое – жанчыны абракаліся ручнікам на крыж?*>

Да, да, эта я чула. Маці мая гаварыла, што то ў дзярэўні ілі каровы балелі, ілі што. Дак яна гаварыла, што “аброчнік” дзелалі. За адзін дзень аснавалі, напралі льну, аснавалі, паставілі на кросны, і наткалі, і занясліі ў цэркаў.

<*У царкву ў Мяркулавічах?*>

У Меркулавічы ілі ў Расохі, не знаю, куда ўжэ. І занясліі ў цэркаў аброчнік эты.

<*Калі гэта было?*>

Не знаю, у якім годзе. Эта маці мая расказывала. Да вайны. У 41-м радзілася, як вайна закончылася, мне 3-4 годы было, эта я знала.

<*Не казала маці, што гэта было, палатно ці ручнік?*>

Ручнік такі, ну.

< *Доўгі?*>

Ну ж губку яны снавалі, а губка гэта так цераз хату. А нада навіць што-то на кросны.

<*З якой прычыны рабілі ручнік?*>

Ну, во каровы другі раз былі балеючы, нешта ў дзярэўні, то дажджі другі раз не ідуць...

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Соф'і Яфрэменка, 1941 г.н.)*

## У якасці прэвентыўнай меры

### *в. Харомцы Акцябрскага раёна*

...Пралі дзеці. У адзін дзень снавалі, пралі і абхадзілі з іконамі вакруг дзерэўні. І ўсё ў адзін дзень. Эта на Дзевятнік. Празднік е, Дзевятнік. І патом такой лівень пашол.

<*І колькі вам гадоў было, калі ткалі?*>

Мы пралі, пралі, как маглі. Я дак ужэ ўмела прасць. Помню, маленькая, прасць навучылісь харашо. Как пралі, не важна, но ўсё ў адзін дзень дзелалі. Полдзерэвні дзяцей пралі. Сабіралі нас. Аснавалі, напралі і выткалі. І тагды ўзялі ікону, абышлі ўсё сяло, і такі лівень ішоў, што. А то не было дажджу.

А ешчо была такое, што раздзевалісь голыя, дагала. Без трусоў, без всего, і з трох калодцаў нада было ваду ў агарод. І тагда дождж ідзет. Вот з аднаго калодца, са втарога, з трэцяга. Помню, цераз уліцу перабягалі, у агарод налівалі ваду, і шоў дождж. Утрам дзелалі. І чэраз дарогу такія голыя перабягалі. І без трусоў, без ліфчыкаў, штоб пака мужыкоў не была, ані скарэй цераз уліцу, в агарод налівалі воду, і такой тагда дождж пашоў. Наверна, месяц не было даждя. І пашлі дажді.

<*Ручнік, які выткалі на дождж, як яго называлі?*>

Дняўнік.

<*Які ён быў, доўгі?*>

Як раз на іконку. Як на ікону, такі. Маленькі. Штоб пабыстрэе, патаму што врэмені мала была. Многа была народу. Хто выхадзіў, хто прыхадзіў.

Другія, надаест, дак памагают. Да в цечэніі дня, патаму шта там быстра не здзелаеш. Адны дзелают, другія што-та другое. Усё ў адзін дзень дзелалі.

<*А ўнізе што было?*>

А мы прышывалі кружавчыкі.

<*І куды гэты ручнік?*>

Цэркаў у нас была. Там, дзе крэст. Аброкі эта ўсё.

<*А хто сказаў, што так трэба рабіць?*>

А эта шчэ старыя, старыя людзі, каторыя былі старша нас. Яны нас учылі. От я пашла за свайго мужыка, дак у яго быў дзедушка, ён усё мне расказываў. От так. І мы рабілі, як вучылі.

<*За сваё жыццё адзін такі абыдзённік рабілі?*>

Адзін.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Марыі Алейнік, 1915 г.н.)*

### в. Жалезнікі Веткаўскага раёна

За дзень на Пятра сотчэш палатно... І расцілаеш упоперак, як кароўкі будуць ісці... Каб яны ішлі па гэтаму палатну. Называецца "абыдзённік" эта палатно. На Юр'я расцілаюць на вуліцы.

*(Зап. Г.І. Лапацін у 1991 г. ад Д. Бурачковай, 1906 г.н. Экспедыцыйныя запісы Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя. Ф.Р. Шклярава)*

## Аброчныя штогадовыя ўзнаўленні абыдзённага рытуалу

### в. Пыцькаўка Буда-Кашалёўскага раёна

Абыдзённік, да. Чула. Вот у нас Казаньская, празнік, двацаць первага іюня. Празнік. І ў нас з адрада вякоў крынічка была... Эта, гаўра, наш аброк, тут нашы атцы жылі, і старыкі жылі. Калісь ужо падзёж быў бальшы на скот. Дык абракнуліся бабы. Што іздзелаць за адзін дзень: напрасць, аснаваць кросны, навіць на навойку, у бёрда ўкласць і ткаць. За адзін дзень штоб эта здзелалі. Вот яны ўсёй дзярэўняй сабраліся і ета здзелалі. І тады, ну, выткалі яны там скалькі, ну, калісь звалася "губка", ад вугла і да вугла хаты – эта звалася "губка". Ну, можа, яны губку эту выткалі, эта метраў тры-чатыры... І як кароў гоніш на выган, ужэ ў поле, разаслалі эта палатно, і перайшлі чэраз эта палатно каровы. І перастаў падзёж.

<*Гэты аброк, абыдзённік, рабілі на Казанскую?*>

Да, да, да. Вобшчэм, к Казаньскай яны ўжэ здзелалі, к Казаньскай, і абракнулісь, што Казаньская празьнік. Эта наш аброк, штоб скот буў цэл. І вот эта ўжо аброк яны...

< *Вы самі гэта бачылі ці вам расказвалі?*>

Не, эта ж даўнішнія жэншчыны, эта даўнішнія. От жэншчына жыла, от эта во хата во, яна забітая, яна ўжо памерла, дык яна нам расказвала эта во ўсё.

*<А на вашым вяку ўжо так не рабілі жанчыны? Абыдзённік не рабілі?>*
А на нашым абудзённіка не рабілі...

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Надзеі Ганчаровай, 1923 г.н.)*

Вот на Казаньскаю здзелалі абыдзённік за дзень, за суткі вот ці за дзень. І чэраз эты абыдзённік каля этай крыніцы перагналі скот. І скот астаўся, вот у эты дзень, як перагналі. А то па шэсць, па пяць кароў у дзень умірала. І вот эта было. Дык у нас Міхалевіч Лукер'я Максімаўна, эта там яна маладая была, яна очань харашо ткала. Дык вот этат абыдзённік яна там і ткала. Ну, яна памерла ўжэ. Тожа яе німа. Яна жыла сама ў Пыцькаўцы. Вот этым абыдзённікам, яна мне ўсё расказала, і я ўсё-ўсё запісала. Усё было поўнасцю запісана.
*<Яна вам расказвала?>*
Да, і вот аб етай самай крыніцы, яна шчэ тады сушчэствавала. Паслалі этага абыдзённіка, і ўвесь скот перагналі чэраз этат абыдзённік, каторыя жывы асталісь на той дзень. І маліліся, прывожалі бацюшку. І адпраўлялі. І скот з таго дня застаўся весь... На дзень Казаньскай. І весь скот астаўся жыў. Ні адна карова больш не пала.
*<Абыдзённік на крыж павесілі, пры той крыніцы?>*
Вісеў абыдзённік на той на крыніцы на старай. А ета ж, ета шчэ было дзета... то, наверна, шчэ ў трыццатыя гады было, того сталецція яшчэ... Вот, наверна, зразу послі, як савецкая ўласць, вот эта ўрэмя, патаму што Максімаўна сама была з дзевяноста сёмага года. Нават ужо ўмерла, дак у ёй было сто два гады ці што. Яна долгавечная была такая жэншчына. Веруюшчая была. І вот яна, от яна, у дзеўках, гавора, я падросткам была, вот этым я занімалася і ткала. Вот эта так яна мне расказвала. Шчас такіх людзей ужэ не... Вот так яна мне расказвала, я запісвала...

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Любові Карпавай, 1938 г.н.)*

### в. Чырвоны Акцябр Буда-Кашалёўскага раёна

Аброчны празнік быў Казанская. І вот, я помню, гаваруць, абыдзённае палатно... Палатно ткалі, абыдзённае. Метраў петнаццаць, такое палатно слалі, і чэраз эта палатно ганялі скот, бо тады дужа паміралі каровы, здыхалі. Дык вот эта людзі абракнуліся, усё эта здзелалі. І там, о так от, у Пыцькаўцы слалі палатно, чэраз эта палатно пераганялі кароў. Бацюшка пасвяцаў, а тады, як пасвеце кароў, ідзець на поле, пасвяцаў жыта. Вот эта на маей памяці ўсё-ўсё. А яны мяне абышлі-абышлі.
*<І куды потым гэта палатно?>*
От этага я ўжо не знаю.
*<А як такое палатно называлася?>*
Абыдзённае.
*<Кажаце, метраў пятнаццаць было?>*
Да. Такое абыдзённае палатно. Беленькае. Белае палатно.
*<Гэта пры вас такое было?>*
Ета пры мне, я бачыла, як слалі яго, а як ткалі?

*<І колькі вам гадоў было?>*

Да я не помню, можа, гадоў пяць. Ну, добра я помню. Добра помню.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Тацяны Саладухінай, 1925 г.н.)*

### в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна

*<А як гэты ручнік ткалі?>*

А ткалі, штоб за дзень назбіраць, і выткаць, і занесці на ікону ў цэркаў. У хаці ткалі, толькі каб збіраліс, каб за дзень сабраць ніткі і выткаць і каб было гатовае вот к якому празднiку пакрывала занесці ў цэркаве.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Арыны Дулуб, 1910 г.н.)*

## Розныя прычыны

### в. Новая Рудня Ельскага раёна

Абрекаюцца, так усе собіраюцца – носяць по жмені, только з лёнку. І носяць прадзіво, прадуць за дзень, шо напрядуць – то й і вітчуць, і несуць у цэркву. Это таке дзелалі – вот, дожжу нема ці ў сем'і плохо. Собіраліс в одну хату і зносілі по жмені того лёнку. І трэба за дзень спрасці і віткаць, і занесці его ў цэркву. То таке було, пры моёй памяці. Сама-то не дзелала, а ў кумпаніі була.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2005 г. ад Анастасіі Дубянок, 1910 г.н.)*

### в. Марозавічы Буда-Кашалёўскага раёна

А эта абудзённік ткалі, штоб рыбу лавіць. Вот раней напрадуць і ўсё, наснуюць і выткуць. За дзень усё дзелалі.

*<Вы гэта бачылі?>*

Матка расказвала.

*<А што потым з гэтым рабілі?>*

Тады ўжэ паставіць к другому году, штоб было.

*<Вялікі быў абудзённік?>*

Я не знаю.

*<Маці казала "абудзённік"?>*

Ага, "абудзённік".

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Ганны Леўчанка, 1923 г.н.)*

### в. Добрыч Кармянскага раёна

У васкрысенне неслі абыдзённік у царкву, там вешалі. Разы тры ці чатыры так дзелалі. Адзін раз наткалі на дождж... Другі – на кароў. Нясуць абыдзённік на пашу. Узбок ляжаў ад дарогі. На правы бок клалі ад дарогі.Ператыкалі сінім і красным, як хто. На тры нітачкіператыкалі... разам на цэўку. Рушнік у царкву няслі пасля гэтага.

*(Зап. Г.І. Лапацін, Л.Д. Раманава ў 1999 г.
ад С. Самусёвай, 1925 г.н., ЭМ ВМН, сш. 91, ар.113)*

### *г. Мазыр*

...Мне расказвалі... У Мозыры – там я жыла, і расказвалі. Ляжала ў бальніцы. Вот згаворацца і за ноч напрадуць усім гуртом і саткуць. І бяруць ікону і кругом Мозыр обносілі да сонца, каб явіцца назад. Ето мне расказвалі. Хто абракаўса, насілі.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2005 г. у в. Вярхі Ельскага раёна ад Варвары Трошка, 1934 г.н.)*

### *в. Раковічы Светлагорскага раёна*

Адна ткала, каб Бог прасціў. Як абракацца, ткалі вузенька – 20–25 см шырынёй. Снавалі, як на поясы. Палатно прыкладна 2 м разразалі на тры штукі. Пачынала прасці раніцай, ткала после абеда, вешалі, каб ніхто не бачыў да сонца.

Як я была маленькая, у Язвіне абракалася – сын зламаў нагі. Бачыла. Восемь гадоў было. Усе глядзелі, матка мая і я хадзілі глядзець. Паправіўся сын. Вешалі на тры ростані. (*У канцы, у пачатку вёскі і на скрыжаванні. – В.Л.*).

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2004 г. ад Марыі Акуліч, 1916 г.н., нар. у в. Язвін Светлагорскага раёна)*

### *в. Сякерычы Светлагорскага раёна*

О, эта я ачэвідзец. Ана, бабка, сядзе. Напрадзе. Аснуе. І ў яе такое ўжо бёрда, яна яго ўвутчэ, а тады, пчолы паўбіраюць, і яна на той рушнік ужэ, цэдзяць. Вараць воск і цэдзяць. Эта ў нас вот бабка жыла там вон.

<*Як гэта называлася?*>

Эта, я ж вам аб'ясняю. Эта пчалаводы, вот у каго пчолы булі. Да, такая завядзёнка була, што нада за дзень напрасці, аснаваць, выткаць, і воск ужо вараць із пчол і цэдзяць той воск.

< *Куды потым гэтую тканіну?*>

Ну, куда дзявалі. Дзяржалі ж.

<*Не абносілі гэты ручнік вакол вёскі?*>

Не, не. У нас этага не было.

<*Бачылі, як яна ткала?*>

Канешна. Канешна.

<*Кожны год трэба ткаць?*>

Эта знаеце, яна на які празнік дзелала? На Хрэстцы. От Хрэстцы. Празнік Хрэстцы. Вясною. І пчолы булі, яна кожны год эта дзелала. Кожны год эта дзелала, патаму што пчолы былі. А так, астальныя, пчол не было, не дзелалі.

<*Колькі ткала?*>

Ну, мятровую ілі паўтары метры, вот такое вот. Больш не, як метр-паўтары. Ну, Прошка ўсе ткала, пчалавод жа яна была, дак... Прошка і Сямёніха. Эта іх дзве было тут у нас.

<*А як жа навіць гэта на станок?*>

А яна ж на станок от надточуе там, надточуе. Там такая навоечка, яна ўжо специяльна прыцэпуе, прыцэпуе к чаму-та. Штоб яе прыкаціць і разапнуць. Ну, і ніты ж такія булі.

*<З ільну ткалі?>*

Да.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Надзеі Белай, 1933 г.н.)*

### *в. Сямёнавічы Калінкавіцкага раёна*

*<А красты стаялі ў вас?>*

Стаялі. Некія ўціральнікі вешалі. І цяпер штоб паложана, паставілі на растанцох краста. Дак ніхто, німа каму паставіць. І па закону трэба, штоб стаяў крэст. Вот хто абракаецца, палаценца павесіў ці што.

*<А чаму вы сказалі "ўціральнікі"?>*

Ну, эта тое само.

*<А набожнік можна павесіць на крыж?>*

Вешаюць.

*<Абракнуцца набожнікам?>*

Да. Можна.

*<А хусткай, фартухом?>*

Усе можна, усе вешаць.

*<А як гэта – абракнуцца, раскажыце.>*

От забалее ці дзіцятка, ці што, так абракаюцца. Да нясуць, да вешаюць. Штоб ачунела. Вот эта такое абраканне ў нас.

*<Што рабілі, каб дождж пайшоў?>*

Платы абягалі. Калі дождж не ідзе на Благавешчанне.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Ксеніі Бачура, 1924 г.н.)*

*< Было ў вас такое, каб за адзін дзень ручнік зрабіць?>*

Было. Мы самі пралі, і яна прала. За дзень, і высушылі. І я, была Усяношна, дак я ў Валосавіч насіла, называецца "завеска". У нас. Было эта.

*<Колькі чалавек рабіла гэту завеску?>*

Сям'я. Тры дзеўкі, і хлопец, і хазяін. Мы напралі, да намачылі, да вупралі. Да высушылі. Да навілі, да ў берда, да і выткалі. Шчэ да сонца. А я ўжэ, у Валосавіч была Усяношна, дак я занесла, павесіла. Па-за мацеру. Мацяр крэпка ляжала, балела. Каб маці ачунела. Эта такі аброк быў. Так багата хто рабіў.

*<Вы гэту завеску зрабілі, і паправілася ваша маці?>*

Ачунела.

*<І доўга потым жыла яшчэ?>*

Шчэ доўга.

*<Гэта да вайны яшчэ было?>*

Да вайны.

*<Прыгадайце, а хто збіраўся завеску ткаць?>*

Самі, свая сям'я. Доўго было ткаць яе. Я так і не ткала. А ткала ці Агапа, ці Харціна, ці Мар'я. Нас было чатыры.

*<Сёстры вашы?>*

Ага.

*<А вы пралі?>*

Тамака доўга напрасці, на верацяно адкідаць той кужаль, того тонкаго і напралі ўсе.

*<А ткалі эту завеску толькі жанчыны? Мужчыны не рабілі так?>*

Не. Яны толькі так ходзяць, памагаюць. Так нас жа саміх было чатыры.

*<Хто сказаў, што трэба завеску рабіць?>*

Эта я не знаю. Але рабілі. Багата хто рабіў. Да на Усеношну ў Валосавіч насілі дзеўкі.

*<Гэта на Вялікдзень?>*

Ага.

*<І куды павесілі гэтую завеску?>*

На абразы. Там жа і мохрыкі парабілі.

*<Колькі кіламетраў да царквы было?>*

Кіламетраў мо пятнаццаць. Хадзіла нагамі. Пашлі пад вечар, а туды прыйшлі ў цэркаў, там людзей. Улезлі да павешалі. Хто платок, а хто завеску, хто што браў. Хто так палатна. Эта было ўпярод аброкі, калі пойдзем.

*<А такі ручнік рабілі, калі дажджу не было?>*

Толькі як німа дажджу, дак гладышкі вешалі, дак білі. Да жабу раздзіралі, штоб дождж пайшоў. А больш я і не знаю.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Алены Коўш, 1914 г.н.)*

## Другая сусветная вайна

### *в. Ляскавічы Акцябрскага раёна*

*<Пра абыдзённік вас распытаю. Як вы казалі: "абдзень"?>*

"Абдзённік" называлі. Аб дзень ткут. Напрядуць, і накідаюць, і тады вешают. Аб дзень. Абдзённік.

*<А вы самі ткалі? >*

Не, не, я мала была.

*<Адкуль вы ведаеце, што так ткалі?>*

Баба ткала, мацерына маці.

*<Збіраліся жанчыны?>*

Суседкі збяруцца да і ўсё. У каго ўздумаюць. Нарады ў кажнай хаце былі ткаць. Дык дагаворацца, ка мне прыдуць ці ў яе. У любую хату хадзілі.

*<Вы казалі, калі дажджу не было, ткалі, а ў вайну? >*

У войну, што жывыя пааставаліся, вродзе бы як аброк рабілі. Яшчэ ж пасля вайны ў нас много з Германіі не прышло, яшчэ ж з фронта не прыйшлі. Хто пааставаліся, а найбольш у нас былі адны бабы ў нас у дзярэўні, дык кажды думаў аб сваём: штоб хто-та вярнуўся, хто-та прышоў.

*<Выткалі таго ручніка і што з ім зрабілі?>*

Не знаю. Куда дзевалі, я не знаю. Я думаю, што нікуда. От тут на перакростку стаяў вялікі крэст такі, здаровы, і на гэты крэст павесяць. А так на кладбішча.

Тут унізу як канчалі, дык я гэта помню. Як канчалі, дык так астаўлялі нітак, тады ўжо нешта закручвалі, рабілі такія, як махры віселі, а тут навярху прывязвалі, такія паўрозікі прышывалі, так вот завязвалі за крэст.

*<А што натыкалі на гэтым ручніку?>*

А нічога. Пасля вайны, вы знаеце, нічога не было: ні краскі не было, нічога. У нас жа дзярэўня згарана была. У нас людзей вельмі много папалілі.

*<Калі збіраліся так рабіць?>*

Сабіраліся ў адной хаце і ўсё гэта рабілі. Мабыць, абы-калі, калі прыходзілася. Абдзень выткаць, гэта ж нейкі час там, абдзень.

Раньшэ ж бабы лён малі, дык хадзілі ж з гэтымі прасніцамі, кудзелі такія вялікія рабілі. Я памагала мацеры скубці на такія жалезныя зубы. А тады ж хадзілі адна к адной. Гэта цяпер каждая ў сваім тэлевізары сядзіць, а тады ж хадзілі ў адну хату. Мані Дашковай хата была малая, яна мне расказвала, мужчыны не было, дык і днём хадзілі кучаю прасці баб сколькі, і ўвечары прыдуць, і хлопцы прыходзяць гуляць.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2006 г. ад Любові Кудзёлка, 1932 г.н.)*

### *в. Ульянаўка Ельскага раёна*

Это до войны, до войны так абракаліся людзі... Штоб усё за адзін дзень. Напралі льну і ткалі паску такую – такія длінныя рушнікі. За адзін дзень напралі, за адзін дзень наснавалі і наткалі. І кругом сяла насілі. Усё роўна немцы попалілі і пабілі.

Завескі такія многа ткалі. “Завескі” называліся. Завескі. Я знаю, я ходзіла глядзець, як яны і ткалі там, і ўсе... Я малая была, но я ходзіла, я бачыла гэта.

*<І там маладыя бабы былі ці старыя?>*

Ну, молодыя такія жэншчыны. Былі і старыя, усякія, хто як. Участвавалі. Ну, такія вот як рушнікі ткалі, вузкія яны. Аснуюць там сколько – губку ці дзьве, да ўжо за дзень і выткуць, і ў цэркоў занясуць.

*<А ператыкалі красным?>*

Ператыкалі, перакладалі, і краснымі ўсякіе ўзоры былі, ператыкалі.

*<А куды ручнік аднеслі?>*

У цэркоў. У Ельск у цэркоў. А ўсё раўно попалілі.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2006 г. ад Марыі Мішчанка, 1930 г.н.)*

### *в. Бераставец Кармянскага раёна*

Вот старухі, бабы сабіраліся ў адну хату і за дзень пралі, і снавалі, кросны, і ткалі, і ўсё эта дзелалі – аброк. Эта ў вайну. А тады кругом дзярэўні, эта палатно насілі кругом дзярэўні. Так абракалісь.

*<А для чаго?>*

Ну, у вайну, штоб была спасена наша дзярэўня, штоб людзі былі спасены і дзярэўня – усё. Так абракалісь.

*<Як называлі – можа, “абыдзеннік”?>*

Не, “аброк”.

*<Вы казалі, што старыя бабы збіраліся?>*

Старыя, ну, маладых не было. Такія пажылыя ўсе бабы сабіраліся. Многа было тады ж, эта шчас папамёрла многа, а так было многа.

*<Дзе яны збіраліся, у каго?>*

А іх ужо няма. Эта – Мажарэнка Гаўрыла. У хаце. І пралі, і снавалі, і кросны станавілі, і ткалі. А патом паткалі, тады бралі эты, палатно эта, і кругом дзярэўні абносілі. Ага. Дажа я бегала, была яшчэ дзяўчонкай і бегала глядзець.

<*А доўгае гэта было палатно?*>

Ну, не сільна доўгі, не, не. А я не помню...

<*Было чыстае палатно ці ператыканае?*>

Не, не, чыстае палатно. Толькі вот не знаю, як хадзілі вакол дзярэўні – ці Богу маліліся ці не? Этага я вот не знаю. Я дажа і не знаю, дзе яны яго дзелі. Ці яны ўжо ў цэркву насілі, этага я не знаю.

<*Калі гэта было?*>

Можа, у 1943-м так вот ці ў 1944-м? А можа, і ў 1942-м? Вот между этых трох.

<*Колькі вам гадоў было?*>

Ну, мне тады было сколькі? Гадоў, можа, двенаццаць-чатырнаццаць.

< *А збіраліся на ноч ці раніцай?*>

Не, утрам сабраліся, адзелісь. За дзень эта ўсё здзелалі.

<*Не пацярпела ваша вёска?*>

Не, не. Спакойна было, харашо.

<*Дапамагло?*>

Да, да.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Кацярыны Сазонавай, 1928 г.н.)*

### *в. Слабада Лельчыцкага раёна*

У нас у войну было. У войну збіраліся. Усе сабраліся, хто ручку, а хто дзве. Да там адна мучае, а тыя прадуць, да аснавалі, выткалі і павесілі ручніка. Было ў нас таке, было. Это на красты вешалі. Было ў нас таке, было.

<*А збіраліся калі?* >

Увечары ці ўдзень, а я ўжэ забылася, але збіраліся, мо ўдзень. Збіраліся ўсе, яны і напралі, і выткалі, і аснавалі, і выткалі, і павеслілі. Было ў нас таке. Таке абраканне, штоб вайны не было. Ну, штоб скарэй вайна кончылась ці што. Во.

<*А якія жанчыны збіраліся?*>

Маладзейшыя, я тады ж была, што мне, трыццаць год было. Не было шчэ і трыццаць год, як вайна была. І я, я прала. Мяняліся, да хто е. Я-та не ткала, я прала. Мне это, сколькі гуртом сталі, напралі. А далей наснавалі, да настроілі, да такія ж строі былі. Да тыя прадуць, да тыя ткуць. Да выткалі, да і...

<*А калі ткалі, маліліся ці спявалі?*>

Не, не спявалі і не маліліся, так гуртом ткалі да і ўсе. О, гуртом ткалі да і ўсе. Пралі і ткалі.

<*У якой хаце гэта было?*>

А ў Бедзюка, цяпер іх німа – памерлі ўжэ.

<*Колькі жанчын збіралася?*>

Багата, я ўжэ і не знаю, сколькі, но мо дзе і пятнаццаць было, гэта ўжэ я і не скажу.

<*Усю ноч так пралі-ткалі?*>

Удзень збіраліся, дзень пралі, ткалі. Увечары павесілі. Тагды і павесілі.

<*Ручнік доўгі быў?*>

Доўгі, метры тры, чатыры. Метры чатыры быў. Адна губка, хай тры метры. Адна губка. У коскі. Горнам перабіралі. Красным. Тагды красным, ніякае не было, тагды красным. Як вайна, тагды і горыну не было. Што намеціць, што эта рушнік. Колісь жа людзі бедно жылі.

*<А як такі ручнік называлі?>*

Ручнік.

*<У якім годзе?>*

Ужэ былі немцы. Ужэ немцы былі. У сорак другом гаду.

*<А хто сказаў, што трэба так рабіць?>*

А хто ж яго знае? Я знаю, хто так сказаў, што трэба так рабіць? Людзі ж так казалі. Да і рабілі. У нас таке і было...

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Ульяны Коўб, 1915 г.н.)*

### в. Стадолічы Лельчыцкага раёна

*<Рабілі ў вайну жанчыны ручнік за адзін дзень?>*

Было. У войну так рабілі людзі там у Пяшчаніцы, штоб вайна закончылася. Пралі і ткалі ў тое врэмя. Штоб вайну кончыць, да, да, да.

*<А вы самі рабілі гэта?>*

Я не рабіла, не буду казаць, што я рабіла. Людзі рабілі, наткалі ў нас. Я тагды не была ўмешна, я і не знала. У нас жа не ўсе забраліся. Жонак там якіх забралі, напралі і выткалі. Эта так, штоб вайну канчала.

*<Рабілі днём ці ноччу?>*

Днём. На дварэ ткалі дажа. Бо баяліся. Кросна паставяць каля парога, да і там доўго выткаць того ручніка.

*<А чаму на двары? >*

І ў хаце можна ткаць, але ж як мы шлі дадому, і гэтыя людзі ткалі каля Оўруча, у Пяшчаніцы на дворы. Наснавалі і ткалі.

*<Так вы бачылі, як у Оўручы так ткалі, да?>*

Да, і ў Стадолічах ткалі. А таго ручніка занясуць на расходнія дарогі, над крыніцай і павесяць. О! Да й павесяць на той крыніцы.

*<А калі ў двары ткалі, куды ж яны прыладжвалі кросны?>*

А ў нас жа кросны зробленыя з дзерава. От і з сохі, от і палка, от табе і ўсе, і берда вісіць, усе.

*<Як такі ручнік называлі?>*

Я вам не скажу, як яго звалі. Это знае гурт, а я яго не ткала.

*<"Аброк", можа, казалі?>*

Ну, канечна ж, "аброк". Эта ж прасілі на войну. Эта Бога прасілі і ткалі. Па Божаму рабілі.

*<А хто сказаў, што так трэба рабіць?>*

Мір людзей. Як вайна началася, то хіба сяло аднэ – то ж свет, свет людзей.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2004 г. ад Караліны Жогла, 1911 г.н.)*

### в. Тонеж Лельчыцкага раёна

Калі яны яго спралі, і выткалі, і прыняслі на крэст сюды, крэст стаяў – Надзя Малейчыха, то, і Карачка няслі на палцы. Выткалі таку намітку доўгу,

заткалі і паняслі на крэст. О, такі я знаю... А лён збіралі, пуд окна хадзілі. Не ідзе ў хату, а як скажа, значыць, я выношу там. І эта ўносіць, друга, лён. І ўжэ самі мучаць яго, пралі ж на грэбянях, уручную, і ўжэ снуюць і этым самым ўжэ выткуць і на крэст. Пры нямецкай уласці, а так.

<*А для чаго?*>

Бог яго знае! А во таке помню добрэ. Была, там стаяла, як неслі.

<*Бачылі, так?*>

Бачыла. Там было багато, і шлі жанкі, і вешалі на крэст.

<*Шлі толькі жанчыны ці мужчыны таксама?*>

Не, не было. Жанкі, і дзве такія падросткі няслі на палцы.

<*А як неслі? Пакажыце.*>

Ну, от, та з аднаго боку ўзяла, і та. Яны павесілі. А яны такую намітку, "наміткі" звалі. Колісь наміткі завіваліся, я этаго не помню. Ну, і павесілі на палку, у нескалько сталок. І доўгі, мо метраў окало чатырох почці было, а што тры, то точно было. Больш. Ну, намітка, о. От я это добро помню, што я прыбегла, то нясла Надзя Малейчыха, і эта Карачка. Надзю Малейчыха точна знаю. На палцы няслі, падышлі, жанкі вешалі. Мо і які мужчына быў, я не знаю. Высокі ж крэст быў.

<*Крыж быў высокі?*>

Ну, крэст стаяў, это яго ўжэ паставілі. Ён не стаяў ужэ пры саветах. І яго паставілі ўжэ пры нямецкай уласці. Проклата та ўлась была...

<*Па канцах намітка была перeтыканая?*>

На канцох затыкалі трошкі. Ніткамі такімі. Чырвонымі там, якія было. Чорныя і чырвоныя ніткі былі, якія тагды ніткі былі. У войну, это шчэ ў войну.

<*А колькі часу пралі, ткалі гэты ручнік?*>

Колько? Яго недоўга пралі, яго ж гуртом пралі, мо жанок і пяць, мо і шэсць, мо і дзесяць. Эта ж не напрадзе, эта ж уручную. Здавалі лён жа ўжэ гатовы, выпроўлены. Ну, калі мычкі такія на грэбень. Потым пралі іх на верацяно, потым іх снавалі на сцену. Аснавалі на туую сцену, потым іх, яго, тыя кросны парылі, тыя, што ўжэ (навіваць аснову – *В.Л.*). Кіпятком парылі, да кала грубу, штоб яго моцны дых ашануў. Бо не будзе ткацца, будзе мшыцца. І ўсе, ужэ навіваюць, на вараціло такія, і ткуць. А ткаць, колько яны яго ткалі? Яны яго за дзень гуртам выткалі, за суткі.

<*А лён збіралі калі – увечары ці раніцай?*>

Удзень, счытайця, зранку, удзень. Раненько ж не пойдуць, удзень пашлі. Паснедалі і пашлі пад окна. Багато ж яго не трэба, на эту намітку. Вот і я таке помню. Помню, што я стаяла на расходніх этых дарогах. І па мяне шлі і вешалі. А хто вешаў, я знаю: Домначка была стара, Фядора была Пашына. Усе памерлі. От німа якой такой старое жонкі, а я ўжэ не знаю.

<*Маліліся, калі вешалі на крыж?*>

Мо тыя старыя жонкі што і гаварылі, Бог яго знае. Я ўжэ не знаю. Хадзілі кругом краста, абышлі з тэю наміткаю.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2005 г. ад Марыі Коўб, 1931 г.н.)*

### *в. Лешня Мазырскага раёна*

...І напрадуць за ноч, і аснуюць, і выткуць. І тэя ставілі на крыжы, закопвалі на перакросную дарозі, ставілі крыжы. І вешалі ўжэ палаценца ці палат-

но ткалі, дак кусок ужэ адрэжуць, ужэ каждам там і прывязвалі і ўжэ хадзілі... Не знаю, у якія там дні – у празднічны ці якія? Я ж малая была.

*<А колькі крыжоў было ў вёсцы – адзін ці больш?>*

Я вам скажу: адзін, два, тры... Дак точна я знаю, на пасёлку перакросна дарога, і там за магазінам, і тут за возерам – тры крыжы было.

Да хадзілі, збіраліся ў хату, маліліся Богу, та ўжэ, наверна, у войну, перад вайной.

*<А гэты ручнік ткалі жанчыны?>*

Да. Жанчыны.

*<А крыж хто ставіў?>*

А крыж я вам не скажу, мо мужчыны.

*<Для чаго так рабілі?>*

Не знаю, што то. І от у каго бальныя, што, там, ці дзіця якое, непаладкі, дак абракаліся там ў цэркві ці дзе. Ці як давалі аброк і ўсягда вешалі на той крыж, там платок, ці палаценца, ці што-нібудзь.

*<У царкве маліліся, а аброк вешалі на крыж?>*

Маліліся тут, у хаце збіраліся.

*<Гэта пасля вайны?>*

Я не знаю, ці эта ў войну, не ў войну, пасля вайны ўжэ не. У хаце збіраліся бабкі і маліліся. Я ж кажу – ткалі, і пралі, і за ноч аснуюць і выткуць, напрадуць, і аснуюць, і выткуць. І ўжэ не знаю калі, рана вешалі ці як ужэ.

*<А вы гэта бачылі самі?>*

Я бачыла з мацераю, я малая была, дак з мацераю хадзіла.

*<А што, моўчкі яны сядзелі?>*

Не маліліся.

*<А для чаго – можа, казалі што?>*

Ну, наверна, у войну, як яе, для чаго эта яны збіраліся. Каб войны не было да штоб жывыя засталіся. Абракаліся ўжэ, да.

*<А вялікі той ручнік быў?>*

Не. От метры паўтары. Яны ж ткалі да ўжэ рэзалі на тры там.

*<Адзін разрэзалі на тры і на кожны крыж павесілі?>*

Ці яны разрэзвалі, ці там ужэ ператыкалі, ну, штоб тры рушнікі этыя на кажды крыж.

*<А як ператыкалі, чым?>*

Ну, тамака горным, красным, ці сінім, от па дзве нітачкі давалі, ну.

*(Зап. В.А. Лабачэўская ў 2003 г. ад Таццяны Ахраменка, 1935 г.н.)*

### *в. Будкі Нараўлянскага раёна*

Да ўжо штоб дзярэўню не спалілі, за дзень ужэ сабраліся бабы, ды напралі пражы, і аснавалі, і рушніка віткалі. Яшчэ я і карункі попляла. І нядаросткі дзярэўню аббегалі. А ўсё раўно спалілі.

*<А куды ручнік дзелі?>*

На хрэст почэпілі. На перакростках.

*<А гэта калі было?>*

Это ўжэ ў войну было.

*(Зап. І.Ю. Смірнова ў 2005 г. ад Анастасіі Хамутоўскай, 1925 г.н.)*

Жанчына з в. Бабічы
Чачэрскага раёна з тканым
ручніком. 1983 г.



Ручнікі. Пачатак XX ст. Лён,
бавоўна, бранае ткацтва
(в. Палессе, Чачэрскі раён)





Ручнік. Сярэдзіна XX ст. Лён, вышыўка крыжыкам. 268 × 39 см (в. Знаменка, Жыткавіцкі раён). Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, кп 5279 р – 1792





Ручнік. 1938 г. Лён, вышыўка крыжыкам. 320 × 44 см (в. Залессе, Петрыкаўскі раён). Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей, кп 4925 р – 1613






Яўгенія Лобах, 1931 г.н., са сваім вясельным ручнікам (в. Забалацце, Акцябрскі раён). 2007 г.

Ручнік. 1955 г. Лён, бавоўна, аднабаковы перабор. Яўгенія Лобах, 1931 г.н. (в. Забалацце, Акцябрскі раён)



Ручнік. 1960-я гг. Лён, мулінэ, аднабаковы перабор. 360 × 34 см. Яўгенія Лук'яновіч, 1929 г.н. (в. Забалацце, Акцябрскі раён)

Ручнікі. 1960-я гг. Лён, мулінэ, аднабаковы перабор. 320 × 37 см. Варвара Ткачык (1913–2005) (в. Забалацце, Акцябрскі раён)



Інтэр'ер Свята-Пакроўскай царквы ў в. Прыбаловічы Лельчыцкага раёна. 2007 г.





Крыж Галгофы з аброчным ручніком, які вышыла Марыя Маркевіч, 1931 г.н., з в. Чэрнічы Жыткавіцкага раёна, у царкве Усіх святых, г. Тураў. 2007 г.



Каменны крыж з тканым аброчным ручніком у царкве Усіх святых, г. Тураў Жыткавіцкага раёна. 2007 г.



Інтэр’ер у хаце Варвары Бурма, 1936 г.н. (в. Лучыцы, Петрыкаўскі раён). 2012 г.

Антаніна Лапунова, 1939 г.н., сярод сваіх вышыванак (в. Бацвінава, Чачэрскі раён). 2003 г.





Інтэр'ер у хаце Еўдакіі Іванец, 1924 г.н. (в. Рычоў, Жыткавіцкі раён). 2007 г.



Інтэр'ер у хаце Сцепаніды Паповіч, 1931 г.н. (в. Дзяржынск, Лельчыцкі раён). 2011 г.



Інтэр'ер у хаце Ганны Брыль, 1931 г.н. (в. Славень, Светлагорскі раён). 2004 г.

Інтэр'ер у доме Ганны Таргоні, 1952 г.н. (в. Дзяржынск, Лельчыцкі раён). 2007 г.





Інтэр'ер у доме Ганны Таргоні, 1952 г.н. (в. Дзяржынск, Лельчыцкі раён). 2007 г.



Інтэр'ер у хаце Алены Карась, 1945 г.н. (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён). 2009 г.



Інтэр'ер у хаце Анастасіі Кароткай, 1927 г.н. (в. Неглюбка, Веткаўскі раён)

Інтэр'ер у хаце неглюбчанкі Алены Баннік, 1929 г.н. (в. Шчадрын, Жлобінскі раён). 2005 г.





Інтэр'ер у хаце Ніны Церашковіч, 1930 г.н. (в. Беразнякі, Жыткавіцкі раён). 2012 г.



Інтэр'ер у хаце Алены Карась, 1945 г.н. (в. Данілевічы, Лельчыцкі раён). 2009 г.



Неглюбская ткачыха Алена Баннік, 1929 г.н., са сваімі тканымі дыванамі (в. Шчадрын, Жлобінскі раён). 2005 г.